НАЧАТКІ ПРАВАСЛАЎЯ

По благаславенні
мітрапаліта Мінскага і Слуцкага
ФІЛАРЭТА,
Патрыяршага Экзарха
ўсяе Беларусі

Да 2000-годдзя Хрысціянства

НАЧАТКІ ПРАВАСЛАЎЯ

ДЛЯ ТЫХ, ХТО ІДЗЕ ДА ГОСПАДА

Аўтары-ўкладальнікі
іерэй Павел Баянкоў
Леанід Качанка

МІНСК
«ПОЛЫМЯ»
1998

УДК 281.9
ББК 86.372
Н 36

Кансультант — протаіерэй *СЕРГІЙ ГАРДУН*
Мастак *А. А. ЛАПІЦКАЯ*

Н36 **Начаткі** Праваслаўя: Для тых, хто ідзе да Госпада /Аўт.-уклад. іерэй П. Баянкоў, Л. Качанка; Маст. А. А. Лапіцкая.— Мн.: Полымя, 1998.—143 с.: іл.
ISBN 985-07-0286-9.

Сэнс быцця дае чалавеку рэлігія і народжаная ад яе культура. І ў такой лучнасці «рэлігія — культура» ёсць аснова для фарміравання свядомасці асобнага чалавека і народа.

Кніга знаёміць з асновамі Праваслаўя, царкоўнымі абрадамі і таінствамі, хрысціянскімі святынямі. Прачытаўшы яе, мы зможам не толькі вызначыць дзень любога рэлігійнага свята, але і зразумець перадгісторыю яго ўтварэння. Дзякуючы гэтаму выданню многія адчуюць тую моц і ўпэўненасць у свае сілы, якія прыносіць нам вера ў нашага Госпада.

УДК 281.9
ББК 86.372

ISBN 985-07-0286-9

© Іерэй П. Баянкоў, Л. Качанка, 1998
© А. А. Лапіцкая. Афармленне, 1998

Ад аўтараў

З самых старажытных часоў чалавек імкнуўся спазнаць ісціну, знайсці адказ на сакраментальнае пытанне «Як жыць?». І толькі з часу, калі прыйшла да людзей Біблія, такі адказ быў знойдзены. «Я на тое радзіўся і на тое прыйшоў у свет, каб сведчыць аб ісціне,— сказаў людзям 2000 гадоў таму Ісус Хрыстос,— усякі, хто ад ісціны, слухае голас мой» (Ін.18:37). Усякі, хто жадае праведна жыць, вучыцца ў Хрыста, спасцігае Яго Вучэнне. Любіць Бога і чалавека — асноўная ідэя Бібліі, яе асноўны Закон, яе асноўны выхаваўчы сэнс, асноўная агульначалавечая каштоўнасць.

Хрысціянскае веравызнанне, узнікшы на пачатку першага стагоддзя ад нараджэння Хрыстовага (наша эра), пераўзышло ўсё лепшае, гуманнае, дабратворнае з вопыту жыцця чалавецтва, з усяго, што існавала ў папярэдніх веравызнаннях і адпавядала запатрабаванням розуму, душы і сэрца чалавека, характару і ладу жыцця славяніна. Праваслаўная вера заснавана на Біблейскіх маральных прынцыпах — Запаведзях Гасподніх, на непарушнай ісціне адзінасці Бажаства трох асоб Святой Троіцы (Айца, Сына, і Святога Духа), на прыкладзе жыцця і самаахвярнага подзвігу дзеля ўратавання людзей Хрыста Збавіцеля, на ўзоры паўсядзённага служэння Праваслаўнай Царквы і яе незлічоных малітоўцаў Госпаду.

Кніга «Начаткі Праваслаўя» мае на мэце ўмацаванне Веры Хрыстовай і тысячагадовай традыцыі народа ладзіць сваё жыццё паводле царкоўнага літургічнага часалічэння. Яна таксама азнаямляе з праваслаўнымі святынямі зямлі беларускай, вызначальнымі падзеямі і паўсядзённым царкоўным жыццём, бо сапраўднае духоўнае аднаўленне чалавека адбываецца толькі праз подзвіг веры, праз рэальны царкоўны вопыт.

Тлумачальны слоўнік царкоўнаславянскай мовы так вызначае слова «начаткі»: першыя плады, усё першае. Заклікаючы да духоўнага ўдасканалення, апостал Павел упамінае «начаткі Вучэн-

ня Хрыста» (Яўр.6:1). Якраз у значэнні «пачатковыя звесткі» гэтае слова ўвайшло ў беларускую мову. Адна з глаў паэмы Я. Коласа «Новая зямля» мае, да прыкладу, назву «Начаткі». Там жа даецца тлумачэнне паняцця: «падручнік Закона Божага (асновы хрысціянскага вучэння)». Згодна з першапачатковым біблейскім сэнсам слова «начаткі» ўжыта ў назве нашай кнігі.

У 988 годзе, у час княжання на Старажытнай Русі Уладзіміра, пазней ушанаванага святым і роўнаапостальным, было прынята хрысціянства. Згодна з летапіснымі звесткамі, у 992 годзе на Полацкую кафедру ўзышоў першы епіскап. Адсюль бярэ свой пачатак Праваслаўная царква на беларускіх землях. З гэтага моманту распаўсюдзілася і Святое Пісанне ў кірыла-мяфодзіеўскім перакладзе. Прападобная Еўфрасіння Полацкая ў XI стагоддзі, беларускі асветнік, першадрукар Францыск Скарына ў XVI стагоддзі і іншыя падзвіжнікі Праваслаўя розных часоў шчыравалі на ніве духоўнага кнігавыдання. Спадзяёмся, што кніга «Начаткі Праваслаўя» — першае выданне літаратуры гэтага кшталту на беларускай мове,— працягваючы традыцыі святаайчыннай літаратуры, дапаможа чытачам, узбагаціўшыся духоўнымі скарбамі Праваслаўя, самаахвярна служыць Госпаду і людзям, спасцігаць адзіна праўдзівы шлях, што вядзе нас у Царства Нябеснае.

Благаславі, Госпадзі, гэту сціплую працу, захавай нас і зямлю нашу ад бедстваў, нягод і зла!

«Хто адрознівае дні, для Госпада адрознівае;
і хто не адрознівае дзён, для Госпада не адрознівае...»
(Рым. 14:6)

МЕСЯЦАСЛОЎ

Месяцасловам называецца каляндар з азначэннем месяцаў і дзён года, які мае тлумачэнні царкоўных свят і звязаных з імі дабрачынных звычаяў.

ПРАВАСЛАЎНЫЯ СВЯТЫ ГОДА

Гадавое кола жыцця хрысціяніна запоўнена духоўнаю працаю выканання Запаведзяў Гасподніх і важнейшымі падзеямі прасвятога, бязгрэшнага жыцця Госпада нашага Іісуса Хрыста.

Найвялікшым хрысціянскім святам з'яўляецца **Пасха — Уваскрасенне Хрыстова (Вялікдзень).** Гэта «Свята свят і Урачыстасць урачыстасцяў». Акрамя таго, на працягу года адзначаецца яшчэ 12 галоўных свят, што праводзяцца ў гонар Госпада нашага Іісуса Хрыста і Божай Маці. Яны называюцца **двунадзесятымі.** Некаторыя з іх залежаць ад зменлівага часу святкавання Пасхі і таму маюць назву **пераходных,** астатнія святкуюцца ў пастаянныя дні, таму носяць назву **неперахадных.** У дадатак да двунадзесятых Праваслаўная Царква адзначае яшчэ пяць свят, названых **вялікімі.**

Даты ўсіх свят Месяцаслова дадзены паводле новага стылю на 1999 год.

Пасха Хрыстова (Вялікдзень), пераходнае свята — 11 красавіка

ДВУНАДЗЕСЯТЫЯ ПЕРАХОДНЫЯ СВЯТЫ

Уваход Гасподні ў Іерусалім — Вербная нядзеля (Вербніца) — 4 красавіка
Узнясенне Гасподняе — 20 мая
Дзень Святой Троіцы — Пяцідзесятніца (Сёмуха) — 30 мая

ДВУНАДЗЕСЯТЫЯ НЕПЕРАХОДНЫЯ СВЯТЫ

Ражаство Хрыстова — 7 студзеня
Хрышчэнне Гасподняе (Вадохрышча) — 19 студзеня
Стрэчанне Гасподняе (Грамніцы) — 15 лютага
Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы — 7 красавіка
Праабражэнне Гасподняе — 19 жніўня
Успенне Прасвятой Багародзіцы — 28 жніўня
Ражаство Прасвятой Багародзіцы — 21 верасня
Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга — 27 верасня
Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы — 4 снежня

ВЯЛІКІЯ СВЯТЫ (НЕПЕРАХОДНЫЯ)

Абразанне Гасподняе і памяць Васілія Вялікага — 14 студзеня
Ражаство Іаана Прадцечы — 7 ліпеня
Памяць святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла — 12 ліпеня
Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы — 11 верасня
Пакроў Прасвятой Багародзіцы (Пакрова) — 14 кастрычніка

ЯК ВЫЛІЧЫЦЬ ДАТЫ ПЕРАХОДНЫХ СВЯТ

Прымаючы да ўвагі адпаведныя ўдакладненні, вы можаце самастойна вылічыць даты ўсіх пераходных (зменлівых) свят і пастоў на наступныя гады. Для гэтага неабходна ведаць дату толькі аднаго свята — Пасхі (Вялікадня), свята пераходнага, дата якога даецца ў спецыяльных царкоўных даведніках на шмат гадоў уперад.

У 1999 годзе, напрыклад, **Пасха** (яе першы дзень заўжды нядзеля) прыпадае на 11 красавіка;

Уваход Гасподні ў Іерусалім — Вербная нядзеля святкуецца за 7 дзён да Пасхі, г. зн. 4 красавіка;

пачатак Вялікага посту — за 7 тыдняў да Пасхі пачынаючы з панядзелка, г. зн. 22 лютага;

пачатак Сырнай сядміцы (Масленіцы) — за 8 тыдняў да Пасхі пачынаючы з панядзелка, г. зн. 15 лютага;

Узнясенне — 40-ы дзень пасля Пасхі, заўжды ў чацвер, адпаведна 20 мая;

Пяцідзесятніца — Дзень Святой Троіцы — 50-ы дзень пасля Пасхі ў нядзелю, адпаведна 30 мая;

пачатак Пятровага посту — праз тыдзень пасля Пяцідзесятніцы пачынаючы з панядзелка, г. зн. 7 чэрвеня.

ПАСХАЛІЯ

Год	Пачатак Масле-ніцы	Пачатак Вялікага посту	Вербная нядзеля	Пасха (Вялікдзень)	Узня-сенне	Пяці-дзесят-ніца—Троіца	Пачатак Пятровага посту
1999	15.02	22.02	4.04	11.04	20.05	30.05	7.06
2000	6.03	13.03	23.04	30.04	8.06	18.06	26.06
2001	19.02	26.02	8.04	15.04	24.05	3.06	11.06
2002	11.03	18.03	28.04	5.05	13.06	23.06	1.07
2003	3.03	10.03	20.04	27.04	5.06	15.06	23.06
2004	16.02	23.02	4.04	11.04	10.05	30.05	7.06
2005	7.03	14.03	24.04	1.05	9.06	19.06	27.06
2006	27.02	6.03	16.04	23.04	1.06	11.06	19.06
2007	12.02	19.02	1.04	8.04	17.05	27.05	4.06
2008	4.03	11.03	20.04	27.04	5.06	15.06	23.06
2009	23.02	2.03	12.04	19.04	28.05	7.06	15.06
2010	8.02	15.02	28.03	4.04	13.05	23.05	31.05
2011	28.02	7.03	17.04	24.04	2.06	12.06	20.06
2012	20.02	27.02	8.04	15.04	24.05	3.06	11.06
2013	11.03	18.03	28.04	5.05	13.06	23.06	1.07
2014	24.02	3.03	13.04	20.04	29.05	8.06	16.06
2015	16.02	23.02	5.04	12.04	21.05	31.05	8.06
2016	7.03	14.03	24.04	1.05	9.06	19.06	27.06
2017	20.02	27.02	9.04	16.04	25.05	4.06	12.06

Усяядныя тыдні ў 1999 годзе

(па серадах і пятніцах посту няма)

Калядны перыяд — з 7 да 17 студзеня
Мытара і фарысея — з 25 да 31 студзеня
Сырны (масленічны) — з 15 да 21 лютага
Пасхальны (Светлы) — з 12 да 18 красавіка
Троіцкі — з 31 мая да 6 чэрвеня

Трапеза ў святы

Паводле Царкоўнага ўстава, у святы Ражаства Хрыстовага і Богаяўлення, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, посту няма. У Навячэр'е Ражаства Хрыстовага, Навячэр'е Богаяўлення, у святы Уздзвіжання Крыжа Гасподняга і Усекнавення галавы Іаана Прадцечы дазваляецца ежа з алеем. У святы Стрэчання, Праабра-

жэння Гасподняга, Успення, Ражаства і Пакрова Прасвятой Багародзіцы, Увядзення Яе ў храм, Ражаства Іаана Прадцечы, апосталаў Пятра і Паўла, Іаана Багаслова, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, а таксама ў перыяд ад Пасхі да Троіцы ў сераду і пятніцу дазваляецца рыба.

Дні асаблівага памінання памерлых у 1999 годзе

Субота мясапусная — 13 лютага
Субота 2-га тыдня Вялікага посту — 6 сакавіка
Субота 3-га тыдня Вялікага посту — 13 сакавіка
Субота 4-га тыдня Вялікага посту — 20 сакавіка
Радаўніца — 20 красавіка
Памінанне спачылых воінаў — 9 мая
Субота Троіцкая — 29 мая
Субота Дзімітрыеўская — 6 лістапада

Не адпраўляецца вянчанне

Напярэдадні серады і пятніцы ўсяго года (г. зн. па аўторках і чацвяргах)
Напярэдадні нядзельных дзён (г. зн. па суботах)
Напярэдадні двунадзесятых, храмавых і вялікіх свят
На працягу пастоў Вялікага, Пятровага, Успенскага і посту перад Ражаством Хрыстовым
На працягу Каляднага перыяду (ад 7 да 19 студзеня)
На працягу Сырнага тыдня (Масленіцы) пачынаючы з Нядзелі мясапуснай і ў Нядзелю сырапусную
На працягу Пасхальнага (Светлага) тыдня
У дні і напярэдадні Усекнавення галавы Іаана Прадцечы — 11 верасня і Уздзвіжання Крыжа Гасподняга — 27 верасня

ЦАРКОЎНЫЯ СВЯТЫ — IX СЭНС

Ражаство Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста

7 студзеня

Збавіцель свету, Гасподзь наш Ісус Хрыстос, нарадзіўся ад Прачыстай Дзевы Марыі падчас праўлення рымскага імператара (кесара) Актавіяна Аўгуста. Паводле загада кесара, у імперыі праводзіўся ўсенародны перапіс. Палесціна, якая была пад уладай цара Ірада, таксама падначальвалася Рыму, таму ўсе яе жыхары, згодна звычаю, павінны былі адправіцца ў вызначаныя кожнаму калену, племені і роду прабацькоўскія мясціны, каб унесці свае імёны ў спіс рымскіх падданых. Дзева Марыя і заручаны з ёю праведны Іосіф былі з роду цара Давіда і пайшлі з Назарэта ў Давідаў горад Віфлеем. Гарады гэтыя і цяпер можна знайсці на карце Палесціны.

З прычыны сваёй беднасці і вялікай колькасці народу ў горадзе яны не змаглі спыніцца ў гасцініцы і вымушаны былі размясціцца ў вапняковай пячоры, куды пастухі ў непагадзь заганялі статак. У такіх абставінах, не маючы не толькі зямной велічы, але звычайных умоў, Прасвятая Дзева, ахінутая Духам Святым, нарадзіла Богадзіця. Яна спавіла Яго і паклала ў яслі, прызначаныя для кармлення жывёлы.

Першымі дазналіся пра Нараджэнне Збавіцеля віфлеемскія пастухі. Раптам з'явіўся перад імі Ангел Божы і святло Гасподняе азарыла іх, яны ж разгубіліся. Ангел сказаў ім: «Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць, якая будзе ўсім людзям. Цяпер нарадзіўся вам у горадзе Давідавым Збавіцель, Хрыстос Гасподзь. І вось вам знак, па якім вы пазнаеце Яго: вы знойдзеце спавітае Дзіця ў яслях». І толькі Ангел сказаў гэта пастухам, як нечакана з'явілася з ім мноства воінства нябеснага, спяваючы: «Слава ў вышніх Богу, і на зямлі мір, у чалавеках благаваленне». Калі Ангелы зніклі, пастухі сказалі адзін аднаму: «Хадзем у Віфлеем і паглядзім, што там здарылася». Яны прыйшлі ў пячору і ўбачылі Марыю, Іосіфа і Дзіця, што ляжала ў яслях. Пакланіўшыся Дзіцяці, пастухі расказалі, што ім было пра Яго абвешчана. Марыя ж захоўвала ўсе іхныя словы ў Сваім сэрцы. Пасля гэтага пастухі вярнуліся да сваіх статкаў, дзякуючы Богу за ўбачанае і пачутае.

Згодна старазапаветнаму закону, на восьмы дзень пасля нараджэння Дзіцяці Маці Яго з Іосіфам далі Яму імя Іісус*, як было ўказана Дзеве Марыі Госпадам праз Ангела. Услед за гэтым прыйшлі з усходу ў Іерусалім вешчуны-астролагі і пачалі пытацца: «Дзе Цар іудзейскі, які нарадзіўся? Мы бачылі зорку Яго на ўсходзе і прыйшлі пакланіцца Яму». Калі дазнаўся пра гэта цар Ірад, то надта ўсхваляваўся, бо думаў, што нованароджаны Цар з цягам часу адбярэ ў яго пасад. Ён сабраў першасвятароў і вучоных-кніжнікаў і запытаўся: «Дзе нарадзіўся Хрыстос?». Тыя адказалі: «У Віфлееме, як прадказана пракорам Міхеем». Тады Ірад, сабраўшы вешчуноў, выведаў у іх час з'яўлення зоркі і сказаў ім: «Ідзіце, разведайце пра Дзіця, а як знойдзеце, то скажыце мне, каб і я пакланіўся Яму». Сам жа надумаў загубіць Іісуса. Вешчуны падаліся ў Віфлеем следам за зоркаю, якая рухалася перад імі і прывяла да месца, дзе было Дзіця. Яны ўвайшлі ў пячору, убачылі Дзіця і Маці Яго, пакланіліся і паднеслі Яму сімвалічныя дары: золата — як Цару, ладан — як Богу і смірну — як прысуджанаму да пакарання смерцю. Атрымаўшы ў сне папярэджанне ад Бога не вяртацца да Ірада, вешчуны падаліся ў сваю краіну кружным шляхам.

Святкаванне Ражаства Хрыстовага было ўведзена ў IV стагоддзі і вызначаецца вялікай урачыстасцю. Да святкавання праваслаўныя вернікі рыхтуюцца саракадзённым постам (28 лістапада — 6 студзеня), які называецца Піліпаўкай. Пярэдадзень свята, названы Сачэльнікам, праводзіцца ў асабліва строгім посце. Ежу пачынаюць ужываць увечары са з'яўленнем на небе першай зоркі. Калядныя святы («Святкі») працягваюцца з 7 па 17 студзеня. У гэтыя дні дазваляецца есці ўсё, нават па серадах і пятніцах, па днях, калі звычайна не ўжываецца скаромнае.

---

* **Іісус Хрыстос** — Іісус азначае «Збавіцель», Хрыстос азначае «Божы пасланец», «месія».

Абразанне Гасподняе і памяць Васілія Вялікага

14 студзеня

На восьмы дзень пасля Свайго Нараджэння Гасподзь наш Ісус Хрыстос прыняў абразанне, устаноўленае старазапаветным законам для ўсіх немаўлят мужчынскага полу (Быц. 17:10-14). Гасподзь прыняў абразанне для таго, каб ніхто не мог усумніцца ў тым, што Ён быў сапраўдным Богачалавекам, а не носьбітам прывіднай плоці, як вучылі некаторыя ерэтыкі. У Новым Запавеце абрад абразання заменены таінствам Хрышчэння, правобразам якога ён і з'яўляўся.

Свяціцель Васілій Вялікі нарадзіўся каля 330 г. на паўночным усходзе Малой Азіі ў багатай сям'і, якая славілася хрысціянскай набожнасцю. Атрымаў выдатную адукацыю, спалучыў яе з падзвіжніцкім жыццём. Васілій Вялікі ўвайшоў у гісторыю хрысціянства як усяленскі вучыцель.

Святое Богаяўленне.
Хрышчэнне Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста
(Вадохрышча)

19 студзеня

Калі Ісусу Хрысту споўнілася трыццаць гадоў (у гэтым узросце старазапаветнае свяшчэнства пачынала выконваць свае абавязкі), настаў час Яго адкрытага служэння выратаванню людзей. Ён прыйшоў да Іаана Прадцечы, які хрысціў народ у рацэ Іардан, і таксама папрасіў хрышчэння. Адчуваючы сваю недасканаласць, Іаан сказаў Яму: «Мне трэба ад Цябе хрысціцца, а Ты прыходзіш да мяне?». Але Ісус адказаў: «Пакінь цяпер гаварыць пра гэта, бо так належыць нам выконваць усякую праўду». Іаан паслухаўся і хрысціў Яго. Пасля таго як Ісус Хрыстос, хрысціўшыся, выходзіў з вады і маліўся, Іаану дадзена было ўбачыць, што нябёсы расхінуліся і Дух Божы ў выглядзе голуба сышоў на Ісуса. Пры гэтым з нябёс пачуўся голас: «Ты Сын Мой любы, у Табе Маё благаваленне*» (Мф. 3:17).

Свята Хрышчэння называецца таксама Богаяўленнем, бо ў гэты дзень Бог паказаў Сябе свету ў Прасвятой Троіцы (Айцец, Сын, і Святы Дух). Бог Айцец абвясціў з нябёс аб Сыне, Сын хрысціўся ад святога Прадцечы Гасподняга Іаана, Дух Святы сышоў на Сына ў выглядзе голуба.

Будучы бязгрэшным, Ісус Хрыстос не меў патрэбы ў хрышчэнні як у ачышчэнні ад асабістых грахоў, аднак Сваім Хрышчэннем, як гаворыцца ў царкоўных хваласпевах, «патапіў у водах Іардана грахі ўсяго свету» і асвяціў ваду.

Асаблівасцю свята Хрышчэння Госпада з'яўляюцца два вялікія водаасвячэнні. Першае з іх адбываецца напярэдадні свята, 18 студзеня, у храме, а другое — 19 студзеня, у дзень самога свята, пад адкрытым небам на рэках, сажалках і ў студнях.

Вадохрышчанская святая вада называецца агіасмай *(грэч.—* асвячоная), гэта — вялікая царкоўная святыня. З даўніх часоў гэтая вада прызначаецца, у прыватнасці, для тых, хто з розных прычын пазбаўлены святога Прычасця.

---

* **Благаваленне** — добрая воля, прыхільнасць.

Стрэчанне Госпада нашага Іісуса Хрыста (Грамніцы)

15 лютага

У час Стрэчання Царква ўспамінае падзею зямнога жыцця Госпада нашага Іісуса Хрыста, якая стала своеасаблівай повяззю канца Старога Запавета з пачаткам Новага Запавета.

У законе Маісеевым прадпісвалася прысвячаць Богу кожнага першынца мужчынскага полу. Таму праз сорак дзён пасля Свайго Нараджэння Богадзіця Іісус быў прынесены ў Іерусалімскі храм.

На той час у Іерусаліме жыў праведны* старац Сімяон, якому было прадказана Духам Святым, што ён не памрэ, пакуль не ўбачыць Хрыста Збавіцеля. Як паведамляюць старажытныя гісторыкі, задоўга да Нараджэння Хрыстовага егіпецкі цар Пталамей II Філадэльф захацеў дапоўніць знакамітую Александрыйскую бібліятэку тэкстамі Старога Запавета. Для перакладу іх на грэчаскую мову (са старажытнаяўрэйскай) ён запрасіў з Іерусаліма 72 вучоных-кніжнікаў. Сярод іх быў і праведны Сімяон, якому давялося перакладаць кнігу прарока Ісаіі. Прачытаўшы ў арыгінале словы: «Вось, Дзева ва ўлонне прыме і народзіць Сына» (Іс. 7:14), ён вырашыў, што слова «Дзева» там ужыта памылкова замест слова «жанчына», і хацеў выправіць тэкст. У гэты момант перад ім з'явіўся Ангел і стрымаў яго руку са словамі: «Май веру напісаным словам, ты сам пераканаешся, што яны спраўдзяцца, бо не будзе тваёй смерці, пакуль не ўбачыш Хрыста Госпада, Які народзіцца ад Чыстай і Пранепарочнай Дзевы». З таго дня праведны Сімяон і стаў чакаць прышэсця Хрыста.

І вось у той самы дзень, калі Прачыстая Дзева Марыя і Іосіф павінны былі прынесці Сына, праведны Сімяон па натхненні Духа Святога прыйшоў у Іерусалімскі храм і сустрэў (стрэчанне — значыць, сустрэча) іх на ганку. Узяўшы Богадзіця на рукі (за што і атрымаў званне Богапрыімца), старац Сімяон сказаў прарочыя словы: «Цяпер адпускаеш (з гэтага жыцця) раба Твайго, Уладар, па слове Тваім, з мірам (радасным духам), бо бачылі вочы мае выратаванне Тваё, якое Ты падрыхтаваў перад абліччам усіх народаў, святло і асвету язычнікаў і славу народа Твайго Ізраіля». Прасвятой жа Дзеве праведны Сімяон сказаў пра Дзіця: «Вось з-за Яго будуць спрачацца ў народзе: адны ўратуюцца, а другія загінуць. А Табе Самой зброя пройдзе душу». Гэта азначала, што Божая Маці будзе перажываць вялікае гора за Свайго Сына, калі Ён будзе пакутаваць.

Тут, у храме, знаходзілася набожная ўдава Анна-прарочыца, васьмідзесяці чатырох гадоў, якая служыла Богу постам і малітваю ўдзень і ўночы. Яна таксама пазнала Збавіцеля і славіла Яго, і гаварыла пра Госпада ўсім у Іерусаліме, хто чакаў прышэсця на зямлю Хрыста.

Так апошнім праведнікам адыходзячага Старога Запавета — Сімяону і Анне-прарочыцы было наканавана сустрэць у храме Богадзіця Іісуса — Носьбіта Новага Запавета.

Адметнасцю гэтага свята з'яўляецца асаблівы чын асвячэння стрэчанскіх свечак, якія называюцца ў народзе грамнічнымі. Прынята запальваць іх у час навальніцы ў абарону ад грому і маланкі, вынішчальных дажджоў і граду.

---

* **Праведны** — набожны, адданы Богу.

Уваход Гасподні ў Іерусалім. Вербная нядзеля (Вербніца)

4 красавіка (дата рухомая)

Святкаванне Уваходу Гасподняга ў Іерусалім распачалося ў старажытныя часы і прысвечана ўспаміну вядомай евангельскай падзеі, калі Іісус Хрыстос прыйшоў у горад, каб перанесці пакуты і смерць на Крыжы.

Евангеліст Іаан апісвае ўрачыстае вітанне Яго: «...мноства народу, што прыйшло на свята, пачуўшы, што Іісус ідзе ў Іерусалім, узялі пальмавыя галіны, выйшлі насустрач Яму і ўсклікалі: асанна!* благаславёны той, хто ідзе ў імя Гасподне, Цар Ізраіля!» (Ін. 12:12, 13).

Вось чаму ў гэты дзень існаваў здаўна звычай асвячаць вярбу, таму і свята называецца Вербнай нядзеляй. І мы, трымаючы ў руках расквітнелыя галінкі, услаўляем Збавіцеля як Пераможцу смерці.

Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы

7 красавіка

Свята Благавешчання адзначаецца роўна за 9 месяцаў перад Калядамі (Ражаством Хрыстовым). Пасланы ад Бога ў горад Назарэт Архангел Гаўрыіл з'явіўся ў дом праведных Іосіфа і Дзевы Марыі і звярнуўся да Яе са словамі: «Радуйся, Благадатная! Гасподзь з Табою! Благаславёна Ты між жанчын». Ад гэтых слоў Марыя засаромелася і падумала: «Што значыць гэтае вітанне?». Ангел жа казаў далей: «Не бойся, Марыя, бо Ты набыла Божую ласку. І вось Ты народзіш Сына і дасі імя Яму Іісус. Ён будзе славуты і назавецца Сынам Усявышняга, і Царству Яго не будзе канца». Марыя ў недаўменні запыталася ў Ангела: «Як гэта будзе, калі Я мужа не ведаю?». Гаўрыіл жа адказаў Ёй: «Дух Святы агорне Цябе, і сіла Усявышняга ахіне Цябе: таму і Народжаны назавецца Сынам Божым. Вось і сваячка Твая (паводле Святога Падання — стрыечная сястра) Елізавета, якая не мела дзяцей да глыбокай старасці, хутка народзіць сына (Іаана Прадцечу), бо ў Бога не застаецца без сілы ніякае слова». Тады Марыя з пакораю сказала: «Я раба Госпада, няхай будзе мне па слове Тваім». І Архангел Гаўрыіл адышоў ад Яе. Згодна з народнымі павер'ямі, у гэты дзень нават «і птушка гнязда не ўе», шануючы вялікае свята.

Светлае Хрыстова Уваскрасенне — Пасха (Вялікдзень)

11 красавіка (дата рухомая)

Свята Пасхі з'яўляецца найвышэйшым, выключна радасным у шэрагу ўсіх хрысціянскіх свят. Гэта «Свята свят і Урачыстасць урачыстасцяў» з нагоды светлага Уваскрасення Госпада Іісуса Хрыста пасля пакутніцкай смерці на Крыжы за грахі нашы і дзеля нашага ўратавання. Ні камень вялікі, ні пячатка ворагаў Хрыстовых, ні вартавыя ля Гроба Гасподняга — нішто не ўтрымала Прачыстага Цела.

---

* **Асанна** — слава.

Пасля суботы, уночы, здарыўся раптам вялікі землятрус. З нябёсаў сышоў Ангел Гасподні і адрынуў вялізны камень, прывалены да дзвярэй Гроба, варта ў страху разбеглася... На досвітку да Гроба прыйшлі жанчыны-міраносіцы, каб памазаць Цела Гасподняе духмяным мірам*, і Ангел абвясціў ім аб Уваскрасенні. У дзень гэты Ісус Хрыстос явіўся Марыі Магдаліне і апосталам, узрадаваў Сваю Прасвятую Маці, паведаміў Ёй аб Сваім Уваскрасенні.

Уваскрасенне Хрыстова называецца Пасхаю па назве старажытнага свята, усталяванага ў памяць выбаўлення яўрэяў з егіпецкага рабства. Яўрэйскае слова «*pesach*» азначае «праходзіць міма». Найменне «Пасха» ў царкве хрысціянскай набыло асаблівы сэнс і стала азначаць пераход ад смерці да Жыцця, ад зямлі да Неба, подзвіг выратавання, узнаўлення чалавека. Здзейснілася перамога над грахом і яго вынікам — смерцю. Таму і радуецца так душа хрысціяніна ў дзень Святой Пасхі.

Паводле пастановы Першага Усяленскага Сабора, Пасха святкуецца ў першую нядзелю пасля веснавога раўнадзенства і першай сакавіцкай поўні (заўжды пасля іудзейскай пасхі).

Божай славе Уваскрэслага Госпада адпавядае і асаблівая ўрачыстасць богаслужэння. Са старажытных апостальскіх часоў Царква правіць Пасхальнае набажэнства ўночы, услаўляючы перамогу Госпада нашага Ісуса Хрыста над усімі ворагамі чалавечага збавення, просячы даравання нам жыцця вечнага. Пасхальнае вітанне нагадвае нам той стан апосталаў, у якім яны, калі раптам разнеслася вестка аб Хрыстовым Уваскрасенні, з радасцю ўсклікалі: «Хрыстос Уваскрос!» і адказвалі адзін аднаму: «Сапраўды Уваскрос!».

Перад святам заканчваецца Вялікі сямітыднёвы пост, які адрозніваецца асаблівай строгасцю і шчырымі малітвамі. Рыхтуючы сябе духоўна да сустрэчы Вялікадня (так у народзе называецца свята Пасхі), на перадвелікодным Страсным тыдні прыбіраюць хату і двор, гатуюцца розныя стравы, у тым ліку чырвоныя яйкі, да святочнага стала. У Старажытным Паданні апавядаецца, што аднаго разу святая Марыя Магдаліна, прапаведуючы Хрыстову веру, прыйшла да Рымскага імператара і паднесла яму чырвонае яйка са словамі вітання: «Хрыстос Уваскрос!». З тых даўніх часоў і пайшоў звычай падчас найвялікшага свята Пасхі дарыць адзін аднаму фарбаваныя яйкі як сімвал жыцця і крыжовых пакут Ісуса Хрыста дзеля нашага ўратавання.

Свята Пасхі доўжыцца сем дзён (Светлы тыдзень), на працягу гэтага часу адмяняецца звычайны пост у сераду і пятніцу. Да асаблівых пасхальных абрадаў адносіцца асвячэнне артаса (*грэч.*— хлеб) у канцы Святочнай Літургіі. Гэта прасфара́ вялікага памеру з выяваю Крыжа ці Уваскрасення Хрыстовага. Гістарычнае паходжанне артаса наступнае. Апосталы звычайна трапезнічалі разам з Госпадам, а пасля ўзнясення Яго на неба адкладалі частку хлеба для свайго Вучыцеля, выказваючы тым самым сваю веру ў нязменную прысутнасць сярод іх Ісуса Хрыста. Артас нагадвае нам, што Гасподзь наш Крыжовай смерцю і Уваскрасеннем зрабіўся для нас Сапраўдным Хлебам Жыцця. У суботу Светлага тыдня пасля адпаведнай малітвы артас раздрабляецца і раздаецца вернікам як святыня. Спажываюць яго разам з вадохрышчанскай вадою людзі, якія з той ці іншай прычыны пазбаўленыя магчымасці прычашчацца.

---

* **Міра (смірна)** — духмяная смала, якая аберагае ад тлену цела.

Пасля Літургіі асвячаюцца прынесеныя вернікамі «пасхі» — яйкі і печыва. Па традыцыі пасхальная трапеза пачынаецца са спявання трапара «Христос Воскресе» і каштавання асвячоных яек і «пасхі».

У богаслужбовых адносінах увесь пасхальны тыдзень (Светлы тыдзень) ёсць нібы адзін святочны дзень. Святкуючы Пасху як належыць хрысціяніну, мы атрымліваем жыватворную благадаць Госпада нашага Іісуса Хрыста, Які жыве і царуе ва ўсе вякі.

Ўзнясенне Гасподняе

20 мая (дата рухомая)

Свята Узнясення Гасподняга адзначаецца ў саракавы дзень пасля Уваскрасення Іісуса Хрыста, у чацвер шостага тыдня па Вялікадні. Вярнуўшыся з Галілеі ў Іерусалім, апосталы і вучні Хрыстовы сабраліся ў гэты дзень у адным доме. Іісус Хрыстос явіўся ім, пасля некаторых павучанняў паведаміў аб хуткім сашэсці на іх Святога Духа і нацэліў на сусветную пропаведзь Евангелля. Размаўляючы з вучнямі, Збавіцель вывеў іх з горада на Елеонскую гару, благаславіў і, адрываючыся ад зямлі, узнёсся на неба.

Дзень Святой Троіцы — Пяцідзесятніца (Сёмуха)

30 мая (дата рухомая)

Пасля Узнясення на неба Госпада і Збавіцеля нашага Іісуса Хрыста, што адбылося на саракавы дзень пасля Яго Уваскрасення, апосталы і іншыя вучні неадлучна знаходзіліся ў Іерусаліме. Была разам з імі і Маці Божая. Творачы малітву, яны чакалі здзяйснення слоў Збавіцеля, Які сказаў ім на развітанне: «...прымеце сілу, як сыдзе на вас Дух Святы, і будзеце Мне сведкамі ў Іерусаліме, і ва ўсёй Іудзеі і Самарыі, і нават па край зямлі» (Дзеян. 1:8).

І вось надышоў дзесяты дзень пасля Узнясення і пяцідзесяты пасля Пасхі (адсюль яшчэ адна назва свята — Пяцідзесятніца). «...І раптам пачуўся гук з неба, нібы ад парыву буйнага ветру, ды напоўніў увесь дом, дзе яны сядзелі. І паказаліся ім падзеленыя языкі, як бы вогненныя, і спыніліся па адным над кожным з іх. І напоўніліся ўсе Духам Святым і пачалі размаўляць на розных мовах, як Дух Святы даваў ім вяшчаць» (Дзеян. 2:2-4). Гэтая падзея, апісаная ў кнізе Дзеянняў святых апосталаў, была відавочным знакам таго, што Бог дае апосталам здатнасць і сілы для пропаведзі вучэння Хрыстовага ўсім народам.

З дня сашэсця Святога Духа вера хрысціянская пачала хутка распаўсюджвацца. Разышоўшыся па розных краінах, апосталы ўтваралі там хрысціянскія абшчыны, пасвячалі ў епіскапы, свяшчэннікі і дыяканы. Гэтая несупыннасць апостальскага пасвячэння (яна азначае несупыннасць перадачы благадаці Святога Духа) захоўваецца Праваслаўнай Царквою да сённяшніх дзён. Святочны дзень гэты называецца таксама Дзень Троіцы, таму што пачынаючы з яго свету адкрылася жыццяноснае дзеянне ўсёй Прасвятой Троіцы. Людзі пачалі пакланяцца і ўслаўляць тры Асобы адзінага Бога — Айца, і Сына, і Святога Духа. Пасля сашэсця Святога Духа на апосталаў вучэнне Хрыста аб Трыадзіным Богу і ўдзелу Трох Асоб Бажаства ў

2 Зак. 2210

выратаванні чалавечага роду дасягнула выключнай паўнаты і яснасці. У гэты дзень Праваслаўная Царква заклікае нас пакланяцца Сыну ў Айцы са Святым Духам.

З даўніх часоў вернікамі захоўваецца добры звычай упрыгожваць на свята Троіцы храмы і сваё жытло галінкамі маладых бяроз і кветкамі.

Ражаство Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Госпаднята Іаана

7 ліпеня

Пра нараджэнне святога Прадцечы і Хрысціцеля Госпаднята Іаана Евангелле паводле Лукі расказвае наступнае. Яго святыя праведныя бацькі — святар Захарыя і Елізавета, якія жылі ў старажытным палесцінскім горадзе Хеўроне, дасягнулі старасці, але не мелі дзяцей, бо Елізавета была няплодная. Аднаго разу Захарыя правіў набажэнства ў Іерусалімскім храме і ўбачыў Архангела Гаўрыіла, які прадказаў яму нараджэнне сына і загадаў назваць яго Іаанам. Сын гэты стане папярэднікам Збавіцеля, які чакаецца Старазапаветнай Царквою. Захарыя сумеўся і нават спалохаўся. Ён не верыў, што ў старасці магчыма мець сына, і пажадаў якога-небудзь знака. І ён быў яму дадзены, стаўшы адначасова і пакараннем за недавер: Захарыя быў пазбаўлены мовы да часу здзяйснення слоў Архангела. Праведная Елізавета зацяжарыла і, баючыся кпін, таілася пяць месяцаў. Калі яна нарадзіла сына, па закону Маісея на восьмы дзень было зроблена яго абразанне. Маці назвала дзіця Іаанам. Усе родзічы і сябры былі гэтым здзіўлены, бо ніхто сярод іх не меў такога імя. Калі запыталіся пра гэта ў Захарыі, ён папрасіў дошчачку і напісаў на ёй: «Іаан імя яму». І адразу ж вусны яго пазбавіліся нематы. Напоўнены Духам Святым, Захарыя ўславіў Бога і сказаў прарочыя словы пра Збавіцеля, Які прыйдзе ў свет, і пра свайго сына Іаана — Прадцечу Госпада.

Пасля нараджэння Хрыстовага цар-паганец Ірад загадаў забіваць немаўлят. Даведаўшыся пра гэта, святая Елізавета, каб выратаваць сына, уцякла ў пустэльню і хавалася з ім у пячоры. Святы Захарыя як святар служыў у Іерусалімскім храме. Ірад паслаў туды воінаў з загадам адкрыць месцазнаходжанне Іаана і яго маці. Захарыя адказаў ім, што гэта яму невядома, і быў у храме забіты. Праведная Елізавета з сынам жыла далей у пустэльні, там і памерла. Юнак жа Іаан, абаронены Ангелам, знаходзіўся ў пустэльні да часу сваёй пропаведзі аб пакаянні і хрышчэння ім Ісуса Хрыста.

Слаўных і ўсяхвальных першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла

12 ліпеня

Праваслаўная царква ўспамінае пакуты і смерць святых апосталаў Пятра і Паўла ў Рыме. Пётр (Сіман), руплівы паслядоўнік Ісуса Хрыста, аўтар двух саборных пасланняў (яны ўвайшлі ў Біблію), прапаведаваў спачатку ў Іудзеі, затым у Анціяхіі, Віфаніі, іншых месцах, а таксама па ўсёй Італіі і ў самім Рыме. Святы апостал Павел (Саўл) прапаведаваў у многіх краінах, пачынаючы з Іерусаліма і канчаючы

Рымам, напісаў 14 пасланняў да асобных цэркваў і людзей (яны ўвайшлі ў Біблію). Святыя Пётр і Павел больш за ўсіх шчыравалі ў пропаведзях веры Хрыстовай і таму названы Царквою першавярхоўнымі. У час праўлення рымскага імператара Нерона апостал Пётр быў распяты, апостал Павел абезгалоўлены.

Праабражэнне Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста

19 жніўня

Свята Праабражэння Гасподняга звязана з наступнай евангельскай падзеяй. Незадоўга да Сваіх пакут Ісус Хрыстос узяў трох найбліжэйшых вучняў — Пятра, Іакава і Іаана — і ўзышоў з імі памаліцца на высокую Фаворскую гару. Зрабіў Ён гэта дзеля таго, каб паказаць ім Сваю Божую славу і падтрымаць у іх веру, калі ўбачаць яны Яго пакуты. Пакуль Збавіцель маліўся, вучні, стаміўшыся, паснулі. Калі ж яны прачнуліся, то ўбачылі Хрыста ў велічы і славе: твар Яго ззяў, як сонца, і нават вопратка стала белая і зіхатлівая. У гэты час явіліся да Яго два прарокі, Маісей і Ілія, і гутарылі з Ім аб пакутах і смерці, якія Яму належала зазнаць у Іерусаліме. Раптам светлае воблака агарнула вучняў, і яны пачулі голас Бога Айца: «Гэта Сын Мой Любімы, у Якім Маё благаваленне. Яго слухайце!» (Мф. 17:5). Вучні ўпалі ніцма, Ісус Хрыстос падышоў да іх і сказаў: «Устаньце і не бойцеся», пасля чаго яны ўбачылі Яго ў звычайным выглядзе. Сыходзячы з гары, Гасподзь загадаў вучням не расказваць аб тым, што яны бачылі, да часу Яго ўваскрасення з мёртвых.

Свята гэта ў народзе называецца Другім Спасам ці Спасам Яблычным, бо ў гэты дзень у храмы прыносяць для асвячэння яблыкі і іншую садавіну новага ўраджаю.

Успенне Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі

28 жніўня

Пасля Узнясення Госпада Ісуса Хрыста Божая Маці жыла яшчэ некалькі гадоў. Апостал Іаан Багаслоў па запавету Хрыста прыняў Яе да сябе ў дом і клапаціўся аб Ёй да Яе спачыну. Жывучы ў Іерусаліме, Маці Божая любіла наведваць тыя мясціны, дзе бываў Збавіцель, і малілася там. Аднойчы, калі Яна малілася на Елеонскай гары, Ёй явіўся Архангел Гаўрыіл з весткаю, што праз тры дні Яе зямное жыццё скончыцца. Божая Маці пажадала развітацца з апосталамі, якія ў той час прапаведавалі аб Збавіцелі ў іншых краінах. І вось Гасподзь цудадзейным чынам сабраў усіх апосталаў да Яе, акрамя Фамы. У час смерці незвычайнае святло азарыла пакой, дзе ляжала Божая Маці. Сам Гасподзь, акружаны Ангеламі, з'явіўся і прыняў Яе прачыстую душу. Пахаванне Багародзіцы суправаджалася шматлікімі цудамі.

Апостал Фама прыбыў у Іерусалім праз тры дні пасля пахавання. Ён быў вельмі засмучаны тым, што не развітаўся з Божай Маці. Апосталы, спачуваючы яму, вырашылі адхінуць камень ад магільнай пячоры, каб даць і яму магчымасць развітацца з целам Божай Маці. Аднак, адкрыўшы пячору, яны знайшлі там толькі адны пахавальныя пакрывалы. Здзіўленыя апосталы маліліся Богу, каб Ён адкрыў ім, што сталася з

целам Божай Маці. Увечары, пасля трапезы і малітваў, яны пачулі спеў Ангелаў. Зірнуўшы ўгору, апосталы ўбачылі Божую Маці, акружаную Ангеламі, у ззянні нябеснай славы. Яна сказала апосталам: «Радуйцеся! Я з вамі ўсе дні і заўжды буду вашай малітоўніцай перад Богам». Узрадаваныя апосталы ўсклікнулі: «Прасвятая Багародзіца, дапамагай нам!». Так Гасподзь наш Ісус Хрыстос уславіў Сваю Прасвятую Маці.

Ўсекнавенне галавы Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Госпадняга Іаана

11 верасня

Пра пакутніцкую смерць святога Іаана Хрысціцеля ў 32 г. па Нараджэнні Хрыстовым апавядаюць евангелісты Матфей (Мф. 14:1-12) і Марк (Мк. 6:14-29). Пасля Хрышчэння Госпадняга святы Іаан быў пасаджаны ў цямніцу Ірадам Анціпам, адным з нашчадкаў сумна вядомага вынішчэннем немаўлят Ірада Вялікага. Прарок Божы Іаан адкрыта выкрываў правіцеля за тое, што ён кінуў законную жонку і беззаконна жыў з Ірадыядай, жонкай свайго брата Філіпа. У дзень свайго нараджэння Ірад учыніў баляванне вяльможам і старэйшынам, дзе дачка Ірадыяды Саламія танцавала перад гасцямі і тым надта дагадзіла Іраду. Удзячны правіцель паабяцаў перад прысутнымі даць Саламіі ўсё што яна захоча.

Тая, выконваючы намер сваёй злачыннай маці, пажадала прынесці ёй на блюдзе адсечаную галаву Іаана Хрысціцеля. Ірад засмуціўся такой просьбай. Ён баяўся ўгнявіць Бога забойствам Прарока, парады якога заўжды выконваў. Баяўся ён і народа, які паважаў святога Прадцечу. Аднак адмовіцца ад абяцання ён не змог і загадаў выканаць жахлівую просьбу. Святы Іаан быў абезгалоўлены. У памяць пакутніцкай смерці Іаана Хрысціцеля Царквою ўсталявана свята і строгі пост як выказванне смутку хрысціян аб гвалтоўнай смерці вялікага Прарока.

Ражаство Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі

21 верасня

Нараджэнне Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі святкуецца Царквою як дзень сусветнай радасці. Гэтая дабратворная падзея адбылася ў невялікім галілейскім горадзе Назарэце. Бацькамі Дзевы Марыі былі праведныя Іаакім з роду прарока і цара Давіда і Анна з роду першасвяшчэнніка Аарона. Яны не мелі дзяцей, бо Анна была няплодная. А гэта ў тыя часы лічылася пакараннем за грахі, таму Іаакім і Анна цярпелі несправядлівыя здзекі ад сваіх суайчыннікаў. Аднак яны не гублялі надзеі на літасць Божую і далі абяцанне прысвяціць Богу для служэння ў храме дзіця, калі яго ім пашле Гасподзь. У адно са свят старац Іаакім прынёс у Іерусалімскі храм сваё ахвярнае прынашэнне, але першасвяшчэннік не прыняў яго, бо Іаакім быццам быў нявартым гэтага з прычыны сваёй бяздзетнасці. У вялікім смутку святы Іаакім пайшоў у пустэльню, дзе са слязьмі маліўся Богу аб дараванні яму дзіцяці. Святая Анна таксама шмат і шчыра малілася. Муж і жонка дасягнулі сталага ўзросту і падрыхтавалі сябе дабрадзейным жыццём да высокага

звання — быць бацькамі Найсвяцейшай Дзевы Марыі, будучай Маці Госпада нашага Ісуса Хрыста. І вось Архангел Гаўрыіл прынёс Іаакіму і Анне радасную вестку: малітвы іх пачутыя Богам і ў іх народзіцца Благаслаўлёная дачка Марыя, праз Якую будзе даравана выратаванне ўсяму свету. Нараджэнне Багародзіцы наблізіла прышэсце на зямлю благадатнага Царства Нябеснага, царства ісціны і бессмяротнага жыцця.

Уздзвіжанне святога і Жыватворнага Крыжа Гасподняга

27 верасня

Святкаванне Уздзвіжання святога і Жыватворнага Крыжа Гасподняга ўсталявана Царквою ў гонар наступнай падзеі. Рымскія імператары-язычнікі намагаліся поўнасцю знішчыць памяць аб святых месцах, дзе пакутаваў за людзей і ўваскрос Гасподзь наш Ісус Хрыстос. Імператар Адрыян загадаў засыпаць зямлёю Галгофу і Гроб Гасподні. На гэтым штучным узвышшы былі пастаўлены язычніцкія ідалы, і ім прыносілі ахвяры. Аднак праз 300 гадоў роўнаапостальны імператар Канстанцін Вялікі горача пажадаў знайсці Крыж, на якім быў распяты Ісус Хрыстос. Для гэтага ён накіраваў у Іерусалім сваю маці, набожную царыцу Елену. Язычніцкія капішчы і статуі тады ў Іерусаліме знішчылі. Было знойдзена і месца, дзе ў зямлі захаваліся тры крыжы, шыльдачка з надпісам, зробленым па загаду Пілата, і цвікі. Каб дазнацца, на якім з трох крыжоў быў распяты Збавіцель, Патрыярх Іерусалімскі Макарый па чарзе паклаў крыжы на нябожчыка. Калі быў пакладзены Крыж Гасподні, нябожчык ажыў. Хрысціяне, іх было вялікае мноства, прыйшлі пакланіцца Святому Крыжу, яны прасілі Макарыя высока ўзняць Крыж, каб усе мелі магчымасць з глыбокай пашанай пакланіцца Яму. Гэтая ўрачыстая падзея адбылася ў 326 годзе.

Пакроў Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі (Пакрова)

14 кастрычніка

Пакроў Прасвятой Багародзіцы святкуюць у гонар дзівоснага з'яўлення Маці Божай, што адбылося ў сярэдзіне X стагоддзя ва Улахернскай царкве г. Канстанцінопаля, дзе захоўвалася рыза Божай Маці, Яе галаўное покрыва і частка пояса. У нядзелю, падчас усяночнай, калі храм быў перапоўнены людзьмі, якія тварылі малітву, святы Андрэй дзеля Хрыста юродзівы (памяць 15 кастрычніка), а чацвёртай гадзіне ночы, падняўшы вочы да неба, убачыў Прачыстую Дзеву, азораную нябесным святлом, акружаную Ангеламі і мноствам святых. Укленчыўшы, Багародзіца доўга малілася за хрысціян. Потым Яна зняла са Сваёй галавы покрыва і распасцёрла яго над людзьмі, што былі ў храме, абараняючы іх ад ворагаў бачных і нябачных. Найсвяцейшая Уладычыца наша прасіла ў Госпада Ісуса Хрыста прыняць малітвы ўсіх людзей, якія звярталіся да Яе Прасвятога Імя і да Яе заступніцтва.

Уводзенне ў храм Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі

4 снежня

Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы адбывалася, згодна Паданню, такім чынам. Бацькі Дзевы Марыі, праведныя Іаакім і Анна, маліліся аб сваёй няплоднасці і далі абяцанне, калі народзіцца дзіця, прысвяціць яго служэнню Богу. Малітвы іх былі пачуты Госпадам, і ў іх нарадзілася дачка. Калі Прасвятой Дзеве споўнілася тры гады, бацькі вырашылі выканаць абяцанне. Сабраўшы родзічаў і знаёмых, са спяваннем малітваў і з запаленымі свечкамі ў руках яны прывялі Яе, апранутую ў святочную вопратку, у Іерусалімскі храм. Там сустрэў Дзеву Марыю першасвяшчэннік.

Зямное жыццё Прасвятой Багародзіцы акружана таямніцай, аднак Святое Паданне захавала сведчанні, што ў час знаходжання Прачыстай Дзевы ў Іерусалімскім храме яна выхоўвалася там у коле набожных дзеў, старанна чытала Святое Пісанне, займалася рукадзеллем, малілася, і Яе любоў да Бога ўсё ўзрастала.

З нагоды ўпамянутай падзеі Царква ўсталявала ўрачыстае святкаванне.

Слова ж «Прасвятая» азначае, што Божая Маці па сваіх дасканаласцях і сваёй святасці стаіць не толькі вышэй за людзей, але і за святых Ангелаў. «Вечнадзева» значыць, што Божая Маці да Нараджэння Хрыста была Дзева, і ў Нараджэнне і пасля Нараджэння дзівосным чынам засталася такой самай.

«Гэты дзень стварыў Гасподзь: узрадуемся і ўзвесялімся ў дзень гэты!» (Пс.117:24)

Свята Уваходу Гасподняга ў Іерусалім (Вербніца)

«Я збудаваў храм у жыллё Табе, месца, каб існаваць Табе векавечна» (3Цар.8:13)

«Святкуйце, усе праўдныя сэрцам» (Пс.31:11)

«Сыне мой! зберагай словы мае, і запаведзі мае захавай у сабе» (Прытч. 7:11)

«...хто пойдзе за Мною,
той не будзе хадзіць у цемры...»
(Ін. 8:12)

КАТЭХІЗІС

Слова «катэхізіс» у перакладзе з грэчаскай мовы азначае «абвяшчэнне», г. зн. першапачатковае навучанне, якое ў старадаўнія часы прапанавалася тым, хто далучаўся да Хрысціянскай Царквы. Таму і гэты раздзел з'яўляецца своеасаблівым дапаможнікам, падручнікам хрысціянскага вучэння аб веры і дабрачыннасці.

ВЕРА І РЭЛІГІЯ

Класічнае вызначэнне веры дае нам апостал Павел: «Вера... ёсць ажыццяўленне чаканага і перакананне ў нябачным» (Яўр. 11:1).

Усведамленне таго, што існую я, а навокал мяне існуе неабсяжны свет,— усведамленне ісцівай* рэальнасці. А перакананне, што ўсё гэта створана Усемагутным Творцам,— вера.

Людзі заўжды імкнуліся асэнсаваць жыццё, адчувалі бядотнасць і нетрываласць свайго існавання, шукалі ратунку ў бажаства, якое б пазбавіла іх нягод і прынесла б жаданае. Вераваць у Бога — быць цвёрда перакананым у тым, што Бог існуе, клапоціцца пра нас, усім сэрцам прымаць Яго Божае адкравенне, г. зн. прымаць усё, што ён адкрыў людзям пра Сябе.

Рэлігія і вера — неад'емныя часткі ўсякага веравызнання. Лацінскае слова «рэлігія» мае два асноўныя значэнні: глыбокая пашана і яднанне. Таму рэлігію мы разумеем як духоўны саюз, як жывое і глыбока шанаванае яднанне чалавека з Богам.

Рэлігія ёсць ісцівае, дадзенае Богам адкравенне. І вынік гэтага — Богашанаванне, Богаслужэнне.

Тыя, хто не прымаюць гэтых ісцін, не могуць жыць праведна, не могуць быць праваслаўнымі хрысціянамі. Духоўная ж сутнасць Праваслаўнай веры раскрываецца ў самім семантычным значэнні гэтага слова. Быць праваслаўным — значыць, «правільна славіць Бога», не дапускаць аніякіх адвольных скажэнняў хрысціянскага вучэння.

Прынцыповае адрозненне нашай хрысціянскай веры ад іншых веравызнанняў у тым, што мы ўслаўляем Бога ў Прасвятой Троіцы: Айца, Сына, і Святога Духа ўслаўляем як Троіцу адзінасутную і непадзельную. Таямніцу таго, што Бог — Адзіны і адначасова Траічны ў Асобах, адкрыў нам Ісус Хрыстос — Другая Асоба Прасвятой Троіцы. І ён жа адкрыў нам тое, што «Бог ёсць Любоў» (1 Ін. 4:8).

Любоў існуе там, дзе ёсць тыя, хто любіць, і тыя, каго любяць. І гэта любоў

* **Ісцівая** — праўдзівая.

заўжды іх яднае. Чым больш дасканалая гэта любоў — тым больш дасканалае гэта адзінства.

Роўнаапостальны Кірыл, асветнік славян, гаварыў так: «Бачыце на небе круг бліскучы, і ад яго нараджаецца святло і сыходзіць цяпло? Бог Айцец, як сонечны круг, без пачатку і канца. Ад Яго вечна нараджаецца Сын Божы, як ад сонца — святло; і як ад сонца разам з промнямі ідзе і цяпло, сыходзіць Дух Святы. Кожны распазнае асобна і круг сонечны, і святло, і цяпло, але гэта не тры сонцы, а адно сонца на небе. Так і Святая Троіца: у ёй тры Асобы, а Бог адзіны і непадзельны».

Якраз па неабдымна вялікай Сваёй любові Бог і стварыў увесь свет і нас у гэтым свеце.

АБ ПРЫЗНАЧЭННІ ЧАЛАВЕКА

Бог стварыў нас па вобразу і падабенству Сваім, даўшы нам розум, свабодную волю і бессмяротную душу. Пазнаючы Яго, прыпадабняючыся Яму, становячыся лепшымі і дабрэйшымі, мы набываем шчаслівае жыццё з Богам. Існаванне чалавека, які жыве без веры ў Бога, не трымаецца Божых запаветаў, траціць усялякі сэнс, яго дзеянні лёгка набываюць разбуральны характар.

Каб выканаць сваё прызначэнне, чалавеку неабходна, па-першае, пазнаць сапраўднага Бога і правільна вераваць у Яго, а па-другое, жыць па гэтай веры, г. зн. любіць Бога, людзей, быць дабрадзейным. Сапраўднае вучэнне аб тым, як неабходна правільна вераваць у Бога, як жыць дзеля людзей, ёсць у Праваслаўнай хрысціянскай веры, паколькі яна заснавана на Божым адкравенні, г. зн. на тым, што Сам Бог пажадаў адкрыць людзям пра Сябе. Гэта сваё адкравенне Бог паведамляе людзям двума спосабамі: натуральным і надзвычайным.

Аб натуральным адкравенні

Бог можа адкрыць Сябе чалавеку натуральным спосабам: праз бачную намі прыроду, праз наша сумленне (голас Божы, які паведамляе нам, што́ добра і што́ дрэнна), а таксама праз гісторыю ўсяго чалавецтва.

Усё, што існуе навокал, сведчыць аб усемагутным і прамудрым Стваральніку. Яшчэ Цыцэрон гаварыў, што колькі б мільёнаў раз не кідалі кубікі з літарамі, радкі вершаў з іх ніяк не атрымаюцца. А Сусвет непараўнальна больш складаны, чым самая складаная машына, і непараўнальна больш глыбакадумны за любы верш. Вера ў Бога ёсць асноўная якасць душы чалавека. Дадзеная Богам душа адчувае неадольнае імкненне да Бога, маючы ў Ім родную сабе істоту. Таму ўсе народы ва ўсе часы веравалі ў Бога, хоць часта і памыляліся, блытаючы сапраўдныя погляды з выдумкамі. Існаванне ж бязбожнікаў ніяк не адмаўляе факта ўсеагульнасці веры ў Бога, як існаванне сляпых, глухіх і нямых не можа выклікаць сумненне ў дары зроку, слыху і мовы.

Аднак натуральнага адкравення для пашкоджанага грахом чалавечага розуму, волі і сумлення замала. Таму Бог і дапаўняе натуральнае адкравенне надзвычайным.

Аб звышнатуральным адкравенні. Святое Паданне і Святое Пісанне

Галоўнае Сваё адкравенне Бог паведамляе людзям непасрэдна Сам ці праз Ангелаў. Не ўсе людзі па сваёй грахоўнасці ды немачы могуць самі яго прымаць. Таму Бог спачатку выбраў для гэтага асаблівых, праведных людзей*, пракакаў, якія і прапаведавалі начаткі Божага адкравення. У паўнаце ж і дасканаласці адкравенне Божае прынёс на зямлю ўвасоблены ў чалавека Сын Божы, Гасподзь наш Іісус Хрыстос, Які распаўсюдзіў яго праз Сваіх апосталаў і вучняў.

Першапачатковы спосаб распаўсюджвання быў вусны: словам і прыкладам, паданнем. Далей, каб адкравенне захавалася дакладна, па натхненні Бога некаторыя святыя людзі** запісалі самае галоўнае ў кнігі. Усе гэтыя кнігі, напісаныя пры натхненні і дапамозе Духа Божага, атрымалі назву Святога Пісання (Бібліі). Такім чынам, Святое Паданне папярэднічала Святому Пісанню.

Кнігі Святога Пісання падзяляюцца на дзве часткі: Стары і Новы Запавет. Галоўны змест Старога Запавета, напісанага да Нараджэння Хрыста, складаецца з таго, што Бог абяцаў людзям Збавіцеля і рыхтаваў іх да Яго прыняцця шляхам несупынных адкрыццяў праз святыя запаведзі, прароцтвы, правобразы, малітвы і богаслужэнні. Галоўны змест Новага Запавета — у тым, што Бог сапраўды дараваў людзям абяцанага Збавіцеля, адзінароднага Сына Свайго, Госпада нашага Іісуса Хрыста. І як вобраз таго, што Хрыстос, як Слова Божае, з'яўляецца сэрцам усяго Святога Пісання, толькі Святое Евангелле (апісанне апосталамі зямнога жыцця, запаветаў і цудаў Іісуса Хрыста), а не ўся Біблія, ляжыць на прастоле ў храме.

Усяленскія Саборы

Важнай і незаменнай крыніцай праваслаўнага веравучэння з'яўляюцца веравучыцельныя пастановы і дзеянні царкоўных Сабораў.

На працягу сваёй гісторыі Праваслаўнай Царкве даводзілася сутыкацца з рознымі цяжкасцямі, напрыклад пры выкрыцці ерэтыкоў-ілжэвучыцеляў. І кожны раз яна пераадольвала іх і прымала адпаведныя рашэнні шляхам дасягнення адзінага погляду ўсіх вернікаў, натхнёных Богам і кіруемых пастырамі — спачатку апосталамі, а потым епіскапамі.

Такое адзінства поглядаў дасягалася на Саборах. На Першы царкоўны Сабор сабраліся самі апосталы для вырашэння пытання аб умовах прыняцця язычнікаў у Хрысціянскую Царкву (Дзеян. 15:1-35). Далей усе важныя рашэнні на ўсіх узроўнях царкоўнага жыцця прымаліся Саборамі. У тым выпадку, калі на Сабор збіраліся пастыры і настаўнікі Царквы з усяго свету, ён атрымліваў назву Усяленскага. Калі ж збіраліся пастыры і настаўнікі адной вобласці, то Сабор быў памесны.

Усяленскі Сабор ёсць вышэйшая на зямлі ўлада святой Царквы Хрыстовай, якая творыцца Святым Духам.

---

* **Праведныя людзі** — набожныя людзі, адданыя Богу, дабрадзейныя.

** **Святыя людзі** — дасканалыя духоўна, праведныя, якія жывуць па правілах веры.

Першы Усяленскі Сабор быў скліканы ў 325 г. у малаазіяцкім горадзе Нікеі. Сабор гэты асудзіў і адхіліў ерась Арыя, які адмаўляў Бажаство нараджэння другой асобы Святой Троіцы — Сына Божага — ад Бога Айца. Арый лічыў Сына Божага толькі вышэйшым стварэннем. На Першым Усяленскім Саборы быў зацверджаны наступны догмат (бясспрэчная ісціна): Сын Божы ёсць сапраўдны Бог, народжаны ад Бога Айца раней за ўсе вякі і векавечны таксама, як Бог Айцец; ён народжаны, а не створаны, і адзінаісны з Богам Айцом.

Другі Усяленскі Сабор быў скліканы ў 381 г. у Канстанцінопалі і асудзіў ілжэвучэнне Македонія, які не прымаў Бажаство трэцяй асобы Святой Троіцы — Духа Святога. Македоній сцвярджаў, што Дух Святы не ёсць Бог, называў яго стварэннем ці створанай сілай, падуладнай Богу Айцу і Богу Сыну, падобнай да Ангелаў. Сабор гэты зацвердзіў догмат аб роўнасці і адзінаіснасці Бога Духа Святога з Богам Айцом і Богам Сынам. У выніку двух першых Сабораў быў складзены Сімвал Веры — кароткі пераказ праваслаўнага веравучэння,— які з'яўляецца вызначальным для Царквы на ўсе часы.

Трэці Усяленскі Сабор быў скліканы ў 431 г. у горадзе Эфесе супраць ілжэвучэння Несторыя, які вучыў, быццам Найсвяцейшая Дзева Марыя нарадзіла простага чалавека Хрыста, з Якім Бог пасля злучыўся маральна, знаходзіўся ў Ім, як у храме, падобна таму, як раней знаходзіўся ў Маісеі ды іншых прароках. Сабор пастанавіў прызнаваць у Ісусе Хрысце з часу Яго ўвасаблення спалучэнне дзвюх існасцяў — Божай і чалавечай — і прызнаў неабходным вызнаваць Ісуса Хрыста «дасканалым Богам і дасканалым Чалавекам», а Найсвяцейшую Дзеву Марыю — Багародзіцай. На Саборы было пастаноўлена, што рабіць у Сімвале Веры якія-небудзь змены і дадаткі забараняецца.

Чацвёрты Усяленскі Сабор скліканы ў 451 г. у Халкідоне і асудзіў ерась Яўціхія, які не прымаў чалавечую прыроду Госпада Ісуса Хрыста і прызнаваў толькі адну — Божую. Гэта ерась монафізітаў. Адначасова Сабор зацвердзіў сапраўднае вучэнне Царквы, склаў хрысталагічны догмат, а дакладна, што Гасподзь наш Ісус Хрыстос у адзінай Асобе ёсць сапраўдны Бог і сапраўдны чалавек: па Бажаству — Ён вечна нараджаецца ад Айца, як чалавек — Ён нарадзіўся ад Прасвятой Дзевы і ва ўсім падобны нам, акрамя граху.

Пяты Усяленскі Сабор прайшоў у 553 г. у Канстанцінопалі з-за спрэчак паміж паслядоўнікамі Несторыя і Яўціхія і паўторна асудзіў гэтыя ерасі, тым самым пацвердзіў сапраўднасць вучэння Царквы аб Святой Троіцы і аб Ісусе Хрысце. На гэтым Саборы было асуджана вучэнне Арыгена аб перасяленні душ.

Шосты Усяленскі Сабор адбыўся ў 680 г. у Канстанцінопалі супраць ілжэвучэння ерэтыкоў, якія хоць і прызнавалі ў Ісусе Хрысце дзве існасці — Божую і чалавечую, але толькі адну волю — Божую. Сабор вызначыў прызнаваць у Ісусе Хрысце дзве прыроды — Божую і чалавечую — і па гэтых дзвюх прыродах — дзве волі, але так, што чалавечая воля ў Хрысце не пярэчыць, а паслухмяная Яго волі Божай.

Сёмы Усяленскі Сабор быў скліканы ў 787 г. у горадзе Нікеі супраць іканаборскай ерасі, якая адмаўляла шанаванне ікон. Сабор прызнаў неабходным: пастаўляць і ўскладаць у святых храмах разам з выявай Пачэснага і Жыватворнага Крыжа Гасподняга і святыя іконы, шанаваць іх і пакланяцца ім, узводзячы розум і сэрца да Госпада Бога, Божай Маці і святых, што на іх выяўлены.

Так па ўпарадкаванні промыслу Божага тое зло, якое прынеслі Царкве ерэтыкі-

лжэвучыцелі, накіравалася на яе дабро. Усяленскія Саборы, скліканыя па прычыне гэтых ілжэвучэнняў, дазволілі высветліць і вызначыць, наколькі гэта было магчыма, асноўныя догматы Праваслаўнай Веры. З другога боку, у барацьбе з ерэтыкамі ўзвысіліся і праславіліся знакамітыя свяціцелі і вучыцелі (святыя Мікалай Цудатворац, Афанасій Вялікі, Грыгорый Багаслоў, Грыгорый Ніскі, Максім Іспаведнік і інш.), якія ў сваіх творах раскрылі ісціну Праваслаўя. Яны з'яўляюцца красою і славаю Царквы.

Сімвал Веры

Самым важным вынікам Першага і Другога Усяленскіх Сабораў было зацвярджэнне праваслаўнага Сімвала Веры. Увесь Сімвал складаецца з дванаццаці членаў. У кожным з іх маецца пэўная ісціна — догмат нашай Праваслаўнай веры. На царкоўнаславянскай мове Сімвал Веры чытаецца так:

1. Верую во единаго Бога Отца, Вседержителя, Творца небу и земли, видимым же всем и невидимым (стварыўшага неба і зямлю, усё бачнае і нябачнае).

2. И во единаго Господа Иисуса Христа, Сына Божия, Единороднаго, Иже от Отца рожденнаго прежде всех век (народжанага ад Айца раней за ўсякі час), **Света от Света, Бога истинна от Бога истинна, рожденна, несотворенна, единосущна Отцу, Имже вся быша** (праз Якога ўсё сталася).

3. Нас ради человек и нашего ради спасения сшедшаго с небес и воплотившагося от Духа Свята и Марии Девы, и вочеловечшася.

4. Распятаго же за ны (за нас) **при Понтийстем Пилате, и страдавша, и погребенна.**

5. И воскресшаго в третий день по Писанием (як было прадказана ў прарочых Пісаннях).

6. И возшедшаго на небеса, и седяща одесную (па правы бок) **Отца.**

7. И паки (зноў) **грядущаго со славою судити живым и мертвым, Егоже Царствию не будет конца.**

8. И в Духа Святаго, Господа, Животворящаго (Які паходзіць ад Айца), **Иже от Отца исходящаго, Иже со Отцем и Сыном спокланяема и сславима, глаголавшаго пророки** (Які дае жыццё, Якому пакланяемся і Якога ўслаўляем роўна з Айцом і Сынам, Які гаварыў праз прарокаў).

9. Во Едину, Святую, Соборную и Апостольскую Церковь.

10. Исповедую едино крещение во оставление грехов.

11. Чаю (чакаю) **воскресения мертвых,**

12. и жизни будущаго века. Аминь (сапраўды так).

Словы Сімвала «Верую во единаго Бога» паказваюць на адзінства сапраўднага Бога; такім чынам, язычніцкае вучэнне аб многабожжы рашуча адкідаецца. Гасподзь наш Ісус Хрыстос ёсць адзіны Сын Бога Айца, народжаны ад Яго, як святло ад святла. Уцялесненне Сына Божага азначае, што Ён — дасканалы чалавек і ў той жа час Бог. Сваім вучэннем, жыццём, смерцю і ўваскрасеннем Гасподзь наш з'яднаў зямное з Нябесным, указваючы нам, што і наша існаванне на Небе ў Царстве Божым адкрыта для ўсіх, хто верыць у Яго. У час другога прышэсця Ісус Хрыстос як Цар

і Бог ва ўсёй сваёй велічы прыйдзе на зямлю, каб судзіць усіх людзей, як жывых, так і мёртвых. Суд гэты называецца Страшным таму, што сумленне кожнага чалавека адкрыецца перад усімі. Выкрыюцца не толькі злыя і добрыя справы, але і ўсе сказаныя словы, патаемныя жаданні і думкі.

Аб Царкве Хрыстовай у Сімвале Веры гаворыцца як аб сукупнасці ўсіх праваслаўных хрысціян, жывых і памерлых, з'яднаных між сабою вераю і любоўю Хрыстовай, свяшчэннадзействам і святымі таінствамі. Адначасова з другім прышэсцем Госпада нашага Іісуса Хрыста целы памерлых з'яднаюцца са сваімі душамі і ажывуць. Зменіцца і ўвесь бачны свет, тленнасць ператворыцца ў нятленне. Пасля ўсеагульнага ўваскрасення мёртвых, абнаўлення ўсяго свету і Страшнага суда Хрыстовага настане вечнае жыццё. Для праведных людзей яно будзе радаснае і шчаслівае суадносна маральнаму стану. Для нераскаяных грэшнікаў жыццё будзе праходзіць у векавечных пакутах з-за іх аддаленасці ад Бога, зносін са злымі духамі і ўсведамлення сваіх грахоў.

Дзесяць запаведзяў Закона Божага

У папярэдніх раздзелах разглядаліся асноўныя палажэнні хрысціянскай веры. Удакладнім, якое ўвасабленне павінны яны мець у нашым жыцці. Бо сапраўднае хрысціянскае жыццё можа быць толькі ў таго, хто мае веру ў Хрыста, намагаецца жыць па гэтай веры, творыць добрыя справы і ўчынкі.

Для адрознення добрых і злых спраў мы атрымалі ад Бога асаблівыя сродкі: Закон Божы ўнутраны (сумленне) і Закон Божы знешні (запаведзі). Абумоўлена гэта тым, што пасля грэхападзення розум, сэрца, воля чалавека аказаліся пашкоджанымі грахом і голас сумлення стаў аслабленым, недастатковым. Для таго каб чалавек заўжды быў на варце свайго сумлення, і дадзены запаведзі.

Асноўныя дзесяць запаведзяў, напісаныя на дзвюх скрыжалях (каменных дошках), былі Богам перададзены людзям праз прарока Маісея. Чытаюцца яны так:

1. Я Гасподзь, Бог твой; хай не будзе ў цябе іншых багоў акрамя Мяне.

2. Не ствараў сабе куміра і ніякай выявы таго, што на небе ўверсе, і што на зямлі ўнізе... Не пакланяйся ім і не служы ім.

3. Не вымаўляй імя Госпада, Бога твайго, марна.

4. Памятай дзень суботні (для праваслаўных хрысціян — нядзеля), **каб праводзіць яго свята. Шэсць дзён працуй і рабі ўсякія справы твае; а дзень сёмы — прысвячай Госпаду, Богу твайму.**

5. Шануй бацьку і маці тваю, каб табе было добра і каб падоўжыліся дні твае на зямлі.

6. Не забівай.

7. Не чыні пралюбадзейства (не распуснічай).

8. Не крадзі.

9. Не давай ілжывага сведчання на бліжняга твайго.

10. Не жадай жытла бліжняга твайго, не жадай жонкі бліжняга твайго... нічога, што ёсць у бліжняга твайго.

(Сых. 20:2-17).

3 Зак. 2210

Запаведзі гэтыя сведчаць пра два віды любові — любоў да Бога і любоў да бліжняга. Указваючы на два віды любові, Гасподзь наш Ісус Хрыстос на пытанне, якая запаведзь найбольшая ў Законе Божым, адказаў: «"Узлюбі Госпада, Бога твайго, усім сэрцам тваім, і ўсёй душою тваёю, і ўсім разуменнем тваім". Гэта ёсць першая і найбольшая запаведзь. Другая ж падобная да яе: "Узлюбі бліжняга твайго, як самога сябе". На гэтых дзвюх запаведзях трымаецца ўвесь Закон і прарокі» (Мф. 22:37-40). Калі чалавек перш за ўсё любіць Бога, дык ён, бясспрэчна, не можа не любіць і ўсіх бліжніх сваіх. Таму, хоць увесь Закон Божы і выкладзены ў дзвюх запаведзях любові, але для лепшага нашага разумення яны падзелены на 10 запаведзяў.

У **першай з** іх Гасподзь Бог напамінае чалавеку пра Самога Сябе і пераконвае паважаць Яго як Адзінага Сапраўднага Бога. **Другой** запаведдзю ён забараняе ідалапаклонства, з чым, аднак, нельга блытаць праваслаўнае пакланенне святым іконам (абразам) і мошчам. Шануючы святыя іконы, мы не лічым іх багамі ці ідаламі, яны для нас толькі выява Госпада Ісуса Хрыста, Ангелаў альбо святых. Молячыся перад іконаю, мы молімся Таму, Хто на ёй адлюстраваны. У святых жа мошчах мы шануем дабратворную сілу Божую, якая праз іх дзейнічае. Да ідалапаклонства належыць таксама і служэнне грахоўным страсцям: страсць да накапленняў, абжорства, ганарлівасць і г. д. **Трэцяй** запаведдзю забараняецца вымаўляць імя Божае без глыбокай пашаны, у непатрэбных гаворках, жартах і гульнях. **Чацвёртай** запаведдзю прапануецца шэсць дзён працаваць, а сёмы дзень прысвячаць служэнню Богу. Пад сёмым днём трэба разумець не толькі нядзелю, але і іншыя святы і пасты. Аднолькава парушае гэтую запаведзь той, хто з-за гультайства не працуе ў будні, і той, хто працуе ў свята, хто п'янствуе ў гэты дзень, аддаецца разгулу. **Пятай** запаведдзю Гасподзь загадвае шанаваць сваіх бацькоў, бо тады нас шанаваць будуць нашы дзеці, будзем мець шчаслівае і доўгае жыццё. **Шостай** запаведдзю Бог забараняе разбурэнне ўсяго, створанага Ім, забараняе забойства, пазбаўленне жыцця іншых людзей і самога сябе (самазабойства). Акрамя цялеснага забойства ёсць і не менш страшнае забойства духоўнае — спакуса (калі нехта прымушае бліжняга зняверыцца ці весці распуснае жыццё). **Сёмая** запаведзь забараняе пралюбадзейства, г. зн. парушэнне шлюбнай (сямейнай) вернасці і ўсялякае незаконнае (па-за шлюбам ці без шлюбу) сексуальнае жыццё і нячыстае каханне. **Восьмай** запаведдзю Гасподзь забараняе крадзеж, прысваенне чужога. Сюды трэба аднесці грабеж, святатацтва (прысваенне царкоўнай маёмасці), хабар, дармаедства (атрыманне платы за нявыкананую работу), ліхвярства (паборы з людзей, якія знаходзяцца ў бядзе), хлусню і падман (прысваенне чужога хітрасцю). **Дзевятая** запаведзь забараняе гаварыць няпраўду пра іншага чалавека, г. зн. ілжыва сведчыць, разводзіць плёткі, зласловіць і да т. п. Для хрысціяніна недапушчальна і хлусня, якая не мае злога намеру, недапушчальна і звычайнае пустаслоўе. **Дзесятай** запаведдзю Гасподзь Бог забараняе не толькі рабіць дрэннае іншым, але нават і думаць кепскае, зайздросціць.

ДЗЕВЯЦЬ ЗАПАВЕДЗЯЎ БЛАЖЭНСТВА

Дзесяць запаведзяў Старога Запавета ўтрымліваюць людзей ад зла, забараняюць рабіць грэшнае.

Запаведзі блажэнства, дадзеныя людзям у Новым Запавеце Самім Ісусам Хрыстом у Нагорнай пропаведзі (Мф. 5), вучаць нас таму, як дасягнуць хрысціянскай дасканаласці і святасці. Гэтая святасць, абумоўленая блізкасцю да Бога, стварае ў чалавеку стан блажэнства.

Ісус Хрыстос гаворыць:

1. Блажэнны* ўбогія духам (г. зн. пакорлівыя), **бо іх ёсць** (г. зн. дадзена ім будзе) **Царства Нябеснае.**

2. Блажэнны тыя, што плачуць (аб грахах сваіх і пакутах бліжняга), **бо яны суцешацца.**

3. Блажэнны лагодныя, бо яны ўспадкуюць зямлю.

4. Блажэнны тыя, што жадаюць і прагнуць праўды, бо яны натоляцца.

5. Блажэнны міласцівыя (міласэрныя), **бо яны памілаваны будуць.**

6. Блажэнны чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць.

7. Блажэнны міратворцы, бо названыя будуць сынамі Божымі.

8. Блажэнны гнаныя за праўду, бо іх ёсць Царства Нябеснае.

9. Блажэнны вы, калі будуць вас ганьбіць і гнаць і ўсялякім словам ліхім несправядліва зневажаць за Мяне. Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая вам узнагарода на нябёсах: так гналі прарокаў, што былі перад вамі.

(Мф. 5:3-12).

Пакора** — асноўная хрысціянская дабрадзейнасць, бо яна супрацьлеглая гардыні, ад якой пайшло зло ў свет. Без пакоры —ціхмянасці і паслушэнства— немагчымы зварот да Бога, немагчыма ніякая хрысціянская дабрадзейнасць. Пакора дае нам магчымасць правільна ўзважыць свае вартасці і недахопы, пераконвае ў тым, што жыццё, здароўе, сілы, творчыя здольнасці і веды — усё гэта дар нашага Творцы. Ва ўзнагароду пакорлівым Гасподзь абяцае Царства Нябеснае, г. зн. вечна блажэннае жыццё — векавечнае існаванне ў славе і радасці. Пакорлівыя адкінулі сваю ганарлівасць, усвядомілі неабходнасць духоўнага ўзбагачэння, а не матэрыяльнага і цялеснага.

Плач, пра які гаворыцца ў другой запаведзі, ёсць сапраўдны і пакаянны смутак сэрца аб зробленых намі грахах, аб нашай вінаватасці перад Богам. Бог абяцае тым, хто плача, намагаючыся пазбавіцца грахоўнасці, што яны атрымаюць прабачэнне грахоў і такім чынам набудуць суцяшэнне.

Лагоднасць*** — гэта стан духу чалавека, калі ён ніколі не дазваляе сабе наракання ні на Бога, ні на людзей. Хрысціянская лагоднасць — незласлівасць, нега-

---

* **Блажэнныя** — людзі, што атрымалі вышэйшую радасць і шчасце не ад мінучых мірскіх набыткаў (слава, пасада, багацце...), але атрымалі радасць і благадаць ад зносін з Госпадам (малітва), ад служэння Госпаду і людзям; і гэты блажэнны стан (шчаслівасць) не залежыць ад удач ці няўдач свецкага жыцця, ён — заўсёдны!

** **Пакора** — у рускай мове «смирение».

*** **Лагоднасць** — у рускай мове «кротость».

нарлівасць, сціпласць — выказваецца ў цярплівым пераадоленні крыўд, якія чыняць нам блізкія, у прабачэнні чужых грахоў. Гасподзь абяцае лагодным, што яны, нягледзячы на ўсе падкопы і ганенні, атрымаюць у спадчыну Новую Зямлю, Нябесную Айчыну.

Людзі, што прагнуць праўды, імкнуцца дагадзіць Богу сваім праведным жыццём, глыбока ўсведамляючы перад Ім сваю грахоўнасць. Гасподзь абяцае, што яны ў будучым жыцці натоляцца. Насычэнне гэтае — духоўнае і заключаецца ў спакоі сумлення, у апраўданні і памілаванні.

Міласцівыя людзі — тыя, што маюць спагадлівасць да іншых, што намагаюцца дапамагчы ўсім, хто трапіў у бяду. Міласць (міласэрнасць) можа быць як матэрыяльнай (накарміць галоднага, наведаць хворага, прыняць вандроўніка), так і духоўнай (словам і прыкладам навучыць дабру, даць карысную параду, супакоіць засмучонага, прабачыць крыўду). Міласцівым Гасподзь абяцае памілаванне на Страшным судзе.

Чыстыя сэрцам — тыя, што не толькі не грашаць яўна, але не трояць распусных і заганных думак, грахоўных жаданняў і пачуццяў у сваім сэрцы. Каб займець чысціню сэрца, трэба выконваць царкоўныя пасты, пазбягаць п'янства і аб'ядання, непрыстойных відовішчаў і непрыстойных кніг. Людзям з чыстым сэрцам абяцана, што яны ўбачаць Бога, убачаць жываносныя плады свайго праведнага жыцця, атрымаюць Божую ўзнагароду. А гэта з'яўляецца крыніцай вышэйшага блажэнства.

Міратворцамі называюцца людзі, якія намагаюцца жыць з усімі ў згодзе, намагаюцца прымірыць ворагаў паміж сабою, моляць Бога аб такім прымірэнні. Сваім подзвігам міратворцы прыпадабняюцца Ісусу Хрысту, які прыйшоў на зямлю для выкуплення першароднага граху і прымірэння людзей з Божым правасуддзем. Міратворцам Гасподзь абяцае, што яны назавуцца сынамі Божымі, г. зн. самымі блізкімі Яму людзьмі.

У супрацьстаянні злу праваслаўныя хрысціяне кіруюцца словамі апостала Пятра: «Ухіляйся ад зла і рабі дабро» (1 Пятр. 3:11). Апостал Павел таксама вучыць: «Не дайце злу перамагчы вас, але перамагайце зло дабром» (Рым. 12:21).

Гнаныя за праўду — сапраўдныя вернікі, якія за цвёрдае выкананне сваіх хрысціянскіх абавязкаў, за сваё праведнае і набожнае жыццё церпяць ад ворагаў праўды і дабра нягоды, ганенні і горасці. Сам Ісус Хрыстос прадказаў Сваім паслядоўнікам: «Калі мяне гналі, будуць гнаць і вас» (Ін. 15:20). Каб цярпліва пераносіць ганенні, хрысціяніну неабходна мець любоў да ісціны, пастаянства і цвёрдасць у дабрадзейнасці, мужнасць і спадзяванне на дапамогу Божую. За спаведніцкі* подзвіг Гасподзь абяцае гнаным за праўду Царства Нябеснае.

У апошняй, дзявятай, запаведзі Гасподзь называе асабліва блажэннымі тых, хто ў імя Хрыста, за сапраўдную праваслаўную веру ў яго **церпяць знявагі, ганенні, здзекі, ідуць на смерць.** Такі подзвіг называецца пакутніцкім. За яго Гасподзь абяцае вялікую ўзнагароду. Пакутніцтва за праўду, за ісціну — найвышэйшы хрысціянскі подзвіг; прыкладам такога подзвігу служыць Хрыстос Збавіцель, апосталы — вучні Хрыста і незлічоная колькасць паслядоўнікаў Веры Хрыстовай.

---

* **Спаведніцкі** — які адкрыта выказвае веру.

ШАНАВАННЕ БОЖАЙ МАЦІ

З апостальскіх часоў і да нашых дзён усе праваслаўныя хрысціяне ўзносяць хвалу Той, Якая нарадзіла Госпада нашага Іісуса Хрыста, выхоўвала і зберагала Яго ў гады маленства. У апостала і евангеліста Матфея чытаем: «Усё гэта сталася, каб збылося сказанае Госпадам праз прарока, які гаворыць: «Вось Дзева ва ўлонні зачне і народзіць Сына, і дадуць Яму імя: Эмануіл, што азначае: з намі Бог» (Мф. 1:22-23).

Калі Яе выбраў Бог Айцец, сышоў на Яе Святы Дух, усяліўся ў Яе Бог Сын і нават распяты на крыжы клапаціўся пра Яе, дык ці не павінен Ёй пакланяцца кожны, хто спавядае Святую Троіцу?

Калі Яе назваў Благадатнай і Благаслаўлёнай Архангел Гаўрыіл (Лк. 1:28), ці не павінны і мы браць прыклад з гэтага ўслаўлення?

Першай услaвіла Яе святая праведная Елізавета, родзічка Дзевы Марыі, натхнёная Святым Духам (Лк. 1:41-45). А Сама Прасвятая Дзева прадбачліва сказала: «Ад сёння будуць шанаваць Мяне ўсе роды» (Лк. 1:48). Гэтыя словы здзейсніліся і здзяйсняюцца цяпер. І ў бясконцай хвале Божай Маці можна вылучыць узнёслыя словы свяціцеля Грыгорыя Паламы: «Дзева-Маці бы адзіная мяжа паміж створанай (чалавечай.— *Аўт.*) і нястворанай Божаю існасцю. Усе, хто Бога спазналі, спазнаюць Яе — як месца Неўмяшчальнага. І ўсе, хто Бога ўслаўляюць, услаўляюць Яе пасля Бога. Яна — прычына і папярэдніх благаславенняў, і дарункаў чалавечаму роду, Яна — Падавальніца сучасным і за вечных Хадайніца. Яна — асноведзь прарокаў, пачатак апосталаў, мацунак пакутнікаў, падмурак вучыцеляў. Яна — слава існых зямлі, радасць існых у нябёсах, прыгажосць стварэння. Яна — пачатак, выток і корань урыхтаванай на небе надзеі, якую зможам усе атрымаць па малітвах Яе за нас, дзеля славы ад Бога Народжанага, ад Яе Уцялесненага Хрыста, Госпада нашага». Ахавай і памілуй нас, Прачыстая Дзева Марыя!

ШАНАВАННЕ СВЯТЫХ АНГЕЛАЎ І ЎГОДНІКАЎ БОЖЫХ

Ангелы (*грэч.*— вестуны) — бесцялесныя і бессмяротныя духі, адораныя Богам больш высокімі сіламі і здатнасцямі, чым людзі. Яны з’яўляюцца нябачнымі праваднікамі Божаскага святла, выканаўцамі Божай волі, слугоўцамі нашага ратавання.

Нябесныя Сілы — Ангельскія чыны — паводле Царкоўнага Падання, падзяляюцца на тры іерархіі: вышэйшую, сярэднюю і ніжэйшую.

У вышэйшую Ангельскую іерархію ўваходзяць Серафімы, Херувімы і Прастолы; у сярэднюю — Гасподствы, Сілы і Улады; у ніжэйшую — Пачаткі, Архангелы і Ангелы. Ангельскія чыны вызначаюцца любоўю да Бога, прамудрасцю, правасуддзем, выконваюць волю Госпада, вучаць валодаць пачуццямі, утаймоўваць сілу д’явала, абараняюць народы, паведамляюць важныя весткі, навучаюць дабрадзейнасці, утрымліваюць ад маральных падзенняў, дапамагаюць у цяжкія моманты... Над усімі дзевяццю чынамі пастаўлены Госпадам святы Архістраціг Міхаіл — адданы слуга Божы, які ачысціў Нябёсы ад ганарлівага сатаны і іншых зняпалых ангелаў.

Святыя ўгоднікі Божыя — людзі, якія, жывучы на зямлі, дагадзілі Богу сваім праведным жыццём.

Святыя маюць розныя найменні: прарокі, апосталы, мучанікі, свяціцелі, прападобныя, бяссрэбранікі, блажэнныя і праведныя.

Прарокі — святыя, што па намаўленні Святога Духа прадказвалі будучыню. Яны жылі да прышэсця Збавіцеля Ісуса Хрыста на зямлю.

Апосталы — найбліжэйшыя вучні Збавіцеля. Іх было спачатку 12, а пасля яшчэ 70. Двое з апосталаў — Пётр і Павел — называюцца **першавярхоўнымі**, паколькі яны больш за іншых прапаведавалі Хрыстову веру. Чацвёра апосталаў, якія напісалі Евангеллі,— Матфей, Марк, Лука і Іаан Багаслоў — называюцца **евангелістамі.** Святыя, што, падобна апосталам, распаўсюджвалі хрысціянства ў розных народаў, называюцца **роўнаапостальнымі.** Напрыклад, дабраверны князь кіеўскі Уладзімір, святая Ніна — асветніца Грузіі.

Мучанікі — святыя, што прынялі пакутніцкую смерць за веру ў Хрыста. Калі пасля гэтых пакут яны ўсё ж заставаліся жывыя і затым паміралі сваёй смерцю, дык называліся **спаведнікамі.** Першым, хто пацярпеў за Хрыста, быў архідыякан Сцяфан (Дзеян. 7). Называецца ён **першамучанікам.** Тыя, хто памерлі за Хрыста пасля асабліва цяжкіх (вялікіх) пакут, называюцца **вялікамучанікамі.**

Свяціцелі — епіскапы ці архірэі, што дагадзілі Богу сваім жыццём. Свяціцелі, якія перанеслі пакуты за Хрыста, называюцца **свяшчэннамучанікамі.** Свяціцелі Васілій Вялікі, Грыгорый Багаслоў і Іаан Златавусты называюцца **ўсяленскімі настаўнікамі**, настаўнікамі ўсёй Хрысціянскай Царквы.

Прападобныя — святыя, што адышлі ад свецкага жыцця і дагадзілі Богу бязгрэшнасцю, будучы ў посце і малітве, жывучы ў пустэльнях і манастырах. Прападобныя, якія перанеслі пакуты за Хрыста, называюцца **прападобнамучанікамі.**

Бяссрэбранікі — святыя, што служылі людзям бясплатна лячэннем хвароб як цялесных, так і душэўных.

Блажэнныя, юродзівыя дзеля Хрыста — святыя, што здолелі перамагчы ў сабе корань усіх грахоў — гордасць. У іншасказальнай, сімвалічнай форме выкрываючы зло, яны часам паказвалі, што быццам бы страцілі розум. Такім быў, да прыкладу, Васілій Блажэнны.

Праведныя — святыя, што праводзілі ўгодлівае Богу жыццё, жывучы, як і мы, свецкім жыццём, будучы сямейнымі набожнымі людзьмі.

Разам з Хрыстом і Божай Маці Ангелы і святыя ўгоднікі складаюць Нябесную Царкву, якая непарыўна звязана з нашай зямною Царквою. Сам Бог благаславіў «усё нябеснае і зямное паяднаць у Хрысце» (Эф. 1:10). Гэтая сувязь выяўляецца ў нашай узаемнай любові і малітве адзін за аднаго. Ангелы і святыя ўгоднікі хадайнічаюць перад Богам аб нас, зямлянах. У сваю чаргу мы ўслаўляем іх, пераймаем іхняе Богаўгоднае жыццё.

Нам могуць даводзіць, што нябесныя хадатайнікі не патрэбны, «бо адзіны Бог, адзіны і пасрэднік паміж Богам і людзьмі Хрыстос Ісус, які ахвяраваў Сабою дзеля выкуплення ўсіх» (1 Цім. 2:5-6). Адзінасць Хрыста як нашага Збавіцеля не выключае, аднак, нашых узаемных клопатаў адзін за аднаго. У тым жа Першым пасланні да Цімафея апостал Павел просіць «узносіць малітвы, прашэнні, маленні, падзякі за ўсіх людзей» (1 Цім. 2:1). Нашай малітве дапамагаюць Ангелы і святыя ўгоднікі. Прыкладам, Ангел Рафаіл дапамагаў сям'і Товіі і гаварыў: «Калі маліўся ты і нявестка твая Сара, я ўзносіў малітвы вашы перад Госпадам» (Тов. 12:12). Ці вось як

піша апостал Іакаў: «Шмат можа шчырая малітва праведнага. Ілія быў чалавекам, як мы, і малітваю памаліўся, каб не было дажджу: і не было дажджу на зямлі тры гады і шэсць месяцаў; і зноў памаліўся: і неба дало дажджу, і зямля нарадзіла плод свой» (Іак. 5:16-18).

Мы ў сваіх малітвах спадзяёмся на Ангелаў, на святых угоднікаў, на іх заступніцтва за нас перад Богам, Які больш міласцівы да іх — праведных, чым да нас — грэшнікаў: «Вочы Госпада — да праведных і вушы Яго — да малітвы іх» (1 Пят. 3:12). І наша ўслаўленне Ангелаў і святых угоднікаў Божых не самавольнае, бо слава Нябеснай Царквы даравана ёй Самім Хрыстом. «Ойча,— маліўся Хрыстос за ўсіх вернікаў,— славу, якую Ты даў Мне, Я даў ім: хай будуць адзіны, як Мы адзіны» (Ін. 17:22). І нашы ўзаемныя малітвы, і любоў толькі мацуюць гэта адзінства.

ШАНАВАННЕ СВЯТЫХ ІКОН

У Святым Пісанні (Бібліі) шмат гаворыцца аб усялякіх выявах. Некаторыя (ідалы, куміры), безумоўна, забараняюцца, іх выраб і шанаванне ёсць яўнае парушэнне Другой запаведзі Маісея. Да такіх належаць Цялец, Малох, Ваал, Астарта і інш.

Але разам з тым Сам Гасподзь прапануе зрабіць свяшчэнныя выявы херувімаў для ўпрыгожання храма. Ён асвячае храм з сапраўднымі выявамі. Аднак калі цар Саламон зрабіў несапраўдныя выявы (ідалаў), то Гасподзь асудзіў яго.

Нам даводзяць: Бога ніколі ніхто не бачыў і выяву Яго зрабіць немагчыма. Але ж праведныя хрысціяне ствараюць выяву Святой Троіцы ў выглядзе Трох Ангелаў, як Яна была адкрыта Аўрааму ля Мамврыйскага дуба; Бога Айца, як бачыў Яго прарок Данііл; Сына Божага — Ісуса Хрыста, як бачылі і апісалі Яго апосталы; Духа Святога ў выглядзе голуба, як сыходзіў ён на Збавіцеля ў час Хрышчэння. Ёсць у нас іконы Божай Маці, святых Ангелаў і ўгоднікаў Божых.

Добра сказана: партрэт цара не замяшчае яго ўладу. Так і свяшчэнныя выявы (іконы) не замяшчаюць Хрыста,вобраз Якога яны ўвасабляюць.

Згодна з Царкоўным Паданнем, першыя іконы з'явіліся пры жыцці Самога Збавіцеля. Цар Аўгар з горада Эдэса паслаў жывапісца, каб ён намаляваў партрэт Госпада. Але жывапісец не змог гэта зрабіць па прычыне вялікага ззяння вакол Яго Асобы. Тады сам Гасподзь прыклаў тканіну да Свайго Божаскага Твару і, зрабіўшы адбітак на гэтай тканіне Свайго вобраза, паслаў яго Аўгару. Паводле другога падання, святы апостал і евангеліст Лука напісаў першыя іконы Божай Маці, святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла.

Шанаванне ікон Праваслаўнай Царквою зацверджана на догмаце ўвасаблення Божага. На вялікі жаль, як адзначаў рускі філосаф XX стагоддзя Я. М. Трубяцкі, «ікона застаецца ў нас усюды прадметам таго павярхоўнага эстэтычнага замілавання, якое не пранікае ў яе духоўны змест». Таму важна мець праваслаўнае абгрунтаванне іконашанавання.

Пачатак такога абгрунтавання пакладзены Шостым Усяленскім Саборам (691—692). Правіла 82-ое гэтага Сабора абвяшчае: «...повелеваем отныне образ Агнца, вземлющего грехи мира, Христа Бога нашего, на иконах представляти по человеческому естеству». Правіла гэта было адказам на існуючую ў той час царкоўную

практыку, калі побач з гістарычнымі выявамі ўжываліся сімвалы, якія замянялі чалавечы вобраз Бога.

Правіла 100-ае таго ж Сабора таксама з'яўляецца вяхою ў фарміраванні метаду іканапіснага мастацтва. Яно абвяшчае: «Изображения... растлевающие ум и производящие воспламенения нечистых удовольствий, не позволяем отныне каким бы то ни было способом начертовати». Царква паступова стварыла новае мастацтва — іканапіснае, якое , з аднаго боку, захоўвае ў сваіх вобразах рэальнасць форм, а з другога боку, не мае пачуццёвасці — вобразы яго ўзвышана аскетычныя.

Іконашанаванне стала агульнапрынятым у IV—V стагоддзях. Аднак у VIII стагоддзі з прычыны палітычных меркаванняў грамадзянская ўлада пачала знішчаць іконашанаванне наогул. Так утварылася іканаборчая ерась.

Пасля працяглай барацьбы пастановай Сёмага Усяленскага Сабора (787) іконашанаванне было ўзноўлена. Перамога над іканаборствам і ўзнаўленне іконашанавання былі абвешчаны перамогаю Праваслаўя і святкуюцца ў першую нядзелю Вялікага посту. Догмат, прыняты святымі айцамі Сёмага Усяленскага Сабора, абвяшчае: «Подобно изображению Честного и Животворящего Креста полагать во святых Божиих Церквах, на священных сосудах и одеждах, на стенах и на досках, в домах и на путях, честные и святые иконы... Ибо честь, воздаваемая образу, переходит к первообразному, и поклоняющийся иконе, поклоняется существу изображенного на ней». Тым самым ікона прыроўніваецца да Святога Пісання і Крыжа як адна з форм святога адкравення і Богапазнання. У сувязі з гэтым можна прывесці выказванне А. І. Клібанава: «"Троіца" Рублёва — гэта сустрэча з Богам "твар у твар"».

Наша беларуская школа іканапісу стваралася на падставе творчага засваення традыцый візантыйскага, старажытнарускага, паўднёваславянскага, заходнееўрапейскага мастацтваў. Яе ўвасабляюць шмат самабытных па мастацкім почырку твораў.

Але царкоўны вобраз (ікона) вызначаецца не як мастацтва адпаведнай гістарычнай эпохі, не як выражэнне нацыянальных асаблівасцей таго ці іншага народа, а як адпаведная сваймy богадухоўнаму прызначэнню з'ява, такая ж усяленская, як само Праваслаўе.

З часоў рымскіх катакомбаў і да дня сённяшняга святыя іконы з'яўляюцца неад'емнаю часткай праваслаўнай традыцыі, напамінаючы нам пра Бога, услаўляючы Яго яўнымі і шматлікімі цудадзействамі, апавядаючы аб свяшчэнных падзеях і павучальным жыцці Госпада нашага Ісуса Хрыста, абуджаючы ў нас рэлігійнае пачуццё.

У кожнай хрысціянскай сям'і, безумоўна, павінны быць іконы, у кожным доме павінен быць пачэсны кут (покуць), дзе найперш неабходны іконы Збавіцеля — Ісуса Хрыста, Божай Маці і святога, імя якога ты носіш. Тут можа вісець і лампадка.

У мінулыя часы былі распаўсюджаны іконы «сямейныя», на якіх па просьбе маляваліся святыя — нябесныя заступнікі ўсіх членаў сям'і.

Ікона павінна быць асвячоная царквою, малітвай і акрапляцца святой вадой. Іконы, набытыя ў царкве, ужо асвячоныя, а набытыя ў іншых месцах неабходна асвячаць.

Сюжэт іконы адпавядае строгім царкоўным канонам, а сапраўдны іканапісец — веруючы, царкоўны чалавек. Кожная ікона мае мастацкую, абрадавую і духоўную вартасць.

БОГАСЛУЖЭННІ

Кожны праваслаўны хрысціянін павінен маліцца Богу. Малітвы і песнапенні, якія творацца ў храме святарамі і вернікамі, называюцца богаслужэннем альбо царкоўнай службай.

Храм Божы па прычыне таго, што ў ім збіраюцца багамольцы, называецца Царквою (сходам). Гэтак называецца і сукупнасць веруючых у Госпада нашага Ісуса Хрыста.

Сутачны круг богаслужэння ў сучаснай царкоўнай практыцы пачынаецца а 18 гадзіне. На працягу сутак Праваслаўная Царква праводзіць 9 богаслужэнняў. Гэта вячэрня, павячэр'е, паўночніца, утраня, першая гадзіна, трэцяя гадзіна, шостая гадзіна, Святая Літургія, дзевятая гадзіна.

Вячэрня — служба напрыканцы дня (18 гадзін).

Ею мы дзякуем Богу за мінулы дзень. Яна сімвалічна нагадвае часы старазапаветныя: стварэнне свету, грэхападзенне прабацькоў Адама і Евы, выгнанне іх з раю, спадзяванне людзей на Збавіцеля і здзяйсненне гэтай надзеі. На **павячэр'і** чытаюцца малітвы, у якіх мы просім Бога прабачыць грахі і захаваць нас ад злых падкопаў дыявала ў час сну. **Паўночніца** адбываецца апоўначы як успамін начной малітвы Збавіцеля ў Гефсіманскім садзе (Мф. 26:36-46). **Утраня** правіцца раніцай, перад узыходам сонца. Гэтаю службай мы дзякуем Богу за мінулую ноч і просім у Яго міласці на наступны дзень. Утраня сімвалічна нагадвае нам часы новазапаветныя: з'яўленне Госпада Ісуса Хрыста ў свет для нашага выратавання і яго святоўнага Уваскрасення. **Першая гадзіна** асвячае малітваю ўжо распачаты дзень. **А трэцяй гадзіне** ўспамінаецца сашэсце Святога Духа на апосталаў. **А шостай гадзіне** ўспамінаецца распяцце Госпада нашага Ісуса Хрыста. **А дзевятай гадзіне** ўспамінаецца смерць Госпада на крыжы .

Святая Літургія (Абедня) — асноўнае богаслужэнне. На гэтай службе ўспамінаецца ўсё зямное жыццё Збавіцеля і адбываецца таінства святога Прычасця, усталяванае Ісусам Хрыстом на Тайнай вячэры (Мк. 14:12-25). Літургія правіцца раніцай, перад абедам. Яе пачатак **у буднія дні і ў суботу — каля 9 гадзін,** а **ў нядзелю і ў вялікія святы** ў гарадскіх цэрквах служыцца дзве Літургіі: **ранняя — у 7 і позняя — у 10 гадзін.**

Усе пералічаныя службы ў старажытнасці правіліся паасобна. Пасля для большай зручнасці яны былі аб'яднаны ў два богаслужэнні: вячэрняе і ранішняе. Напярэдадні вялікіх свят і нядзельных дзён адбываецца служба, у якой яднаюцца вячэрня, утраня і першая гадзіна. Такое богаслужэнне называецца **ўсяночная** («всенощное бдение»), бо ў старажытных хрысціян працягвалася ўсю ноч. Правіцца яно больш урачыста і пры большым асвятленні храма, чым у іншыя дні. Пачынаецца, як і вячэрня, а **18 гадзіне**.

Аб Святой Літургіі

Літургія (Абедня) правіцца ў наступным парадку: спачатку рыхтуюцца Дары для таінства, пасля багамольцы рыхтуюцца да таінства, і, нарэшце, адбываецца яно само, і вернікі прычашчаюцца. Такім чынам, Літургія складаецца з трох частак: 1) Праскамідыя; 2) Літургія агалошаных; 3) Літургія верных.

Праскамідыя ў перакладзе з грэчаскай мовы азначае «прынашэнне» (ад звычаю старажытных хрысціян прыносіць хлеб, віно і ўсё неабходнае для правядзення Літургіі) і адбываецца ў алтары на спецыяльным стале-ахвярніку. Для Праскамідыі ўжываецца пяць маленькіх боханчыкаў (просфар) з чыстай пшанічнай мукі (хлеб павінен падняцца і быць квасным) і чырвонае вінаграднае віно. Чытаючы ўстаўныя малітвы, святар выразае з першай просфары яе сярэднюю часцінку ў форме кубіка (Агнец — сімвалізуе Іісуса Хрыста) і ўлівае ў чашу (пацір) віно, змешанае з невялікай колькасцю вады (сімвалізуе кроў і ваду распятага Збавіцеля, калі рымскі воін працяў Яго дзідаю (кап'ём)). Затым з астатніх просфар вымаюцца часцінкі: з другой адну часцінку ў гонар Божай Маці, з трэцяй дзевяць часцінак у гонар: Іаана Хрысціцеля, прарокаў, апосталаў, святціцеляў, мучанікаў, прападобных, бяссрэбранікаў, бацькоў Дзевы Марыі — праведных Іаакіма і Анны — і святціцеля Іаана Златавуста (ці Васілія Вялікага). З чацвёртай і пятай просфар вымаюцца адпаведна за здароўе жывых і спачын памерлых (пры чытанні памінальных запісак, што падаюцца вернікамі). Агнец і ўсе часцінкі ў адпаведным парадку размяшчаюцца на спецыяльнай пасудзіне — дыскасе.

Па завяршэнні Праскамідыі пачынаецца другая частка Літургіі — *Літургія агалошаных* («оглашенных»), якая атрымала такую назву ў старажытнасці таму, што на гэтай службе мелі права прысутнічаць не толькі верныя (хрышчоныя), але і агалошаныя (тыя, хто рыхтаваўся прыняць хрышчэнне праз агалашэнне ці навучанне словам хрысціянскай веры). Літургія агалошаных цяпер складаецца з малебных прашэнняў, накіраваных да Госпада, псалмоў і хваласпеваў у Яго гонар і чытання Слова Божага (Евангелля). Заканчваецца яна прапановай агалошаным пакінуць храм.

Трэцяя частка называецца *Літургія верных*, бо на ёй павінны прысутнічаць толькі верныя. Яна складаецца з наступных частак: 1) перанясенне Дароў з ахвярніка на прастол; 2) падрыхтоўка тых, хто моліцца, да ўрачыстасці іхняга асвячэння; 3) асвячэнне Дароў і памінанне членаў Царквы; 4) падрыхтоўка вернікаў да Прычасця; 5) Прычасце святароў і вернікаў; 6) падзяка за Прычасце і заканчэнне Літургіі.

Кульмінацыйны момант Святой Літургіі — трохразовае закліканне святаром Святога Духа на Дары і благаславенне* ім Дароў, што з'яўляецца яўным знакам асвячэння і пераўтварэння («преложения») Дароў у Цела і Кроў Гасподнія.

ЦАРКОЎНЫЯ ТАІНСТВЫ І АБРАДЫ

Праваслаўны храм — дом малітвы

Храмам Божым называецца прызначаны Богу будынак, дзе збіраюцца праваслаўныя хрысціяне, каб прынесці Госпаду агульную малітву і для атрымання ад Яго благадаці праз святыя таінствы. Усе багамольцы разам складаюць Царкву, таму і будынак, у якім яны збіраюцца для малітвы, называецца таксама царквою. Членам Праваслаўнай Царквы робіць чалавека прынятае ім таінства Хрышчэння, пра якое будзе расказана ніжэй.

---

* **Благаславенне** — прашэнне дабратворнасці.

Падыходзячы да храма, належыць, перахрысціўшыся, пакланіцца, а зайшоўшы ў храм, зноў жа хрысцячыся,— зрабіць тры паклоны ў бок алтара. Пасля, пакланіўшыся на абодва бакі ўжо зайшоўшым людзям, шчыраверна маліцца. Будзем памятаць словы Збавіцеля: «Дом Мой домам малітвы назавецца» (Мф. 21:13).

Паводле звычаю, мужчынам належыць станавіцца па правы бок, а жанчынам — па левы. Хрысцімся так: злучаем тры першыя пальцы правай рукі (у знак таго, што Бог ёсць Троіца Адзіная і Ушанаваная: Бог Айцец, Бог Сын, і Бог Дух Святы), а два астатнія пальцы прыгінаем да далоні (у знак таго, што Гасподзь і Збавіцель наш Іісус Хрыстос ёсць адначасова Бог і Чалавек, Які дзеля нашага ратавання сышоў на зямлю). Складзеныя такім чынам пальцы правай рукі спачатку прыкладаем на лоб (каб Гасподзь прасвятліў наш розум), пасля на жывот (каб Ён утаймаваў нашу плоць), а далей — на правае і левае плечы (для асвячэння нашага жыцця).

Прымаючы благаславенне святара, хрысціяне складаюць на грудзях далоні крыжам (правую на левую) і цалуюць правую руку благаславіцеля, аднак пры гэтым не хрысцяцца. Пры цалаванні Евангелля, Крыжа, святых мошчаў і ікон неабходна рабіць два паклоны перад цалаваннем святыні і адзін — пасля цалавання. Прыкладаючыся да ікон Збавіцеля, Божай Маці і святых, не трэба цалаваць іх у лік.

Наведванне храма павінна стаць патрабаваннем душы. З малення ў храме пачынаюцца святочныя і нядзельныя дні хрысціян. Немагчыма стаць хрысціянінам «завочна» ці «паводле перапіскі». Асабісты ўдзел чалавека ў таінствах Святой Царквы нічым замяніць немагчыма.

Хрышчэнне і Мірапамазанне

Таінствам называецца дзейства, праз якое чалавеку нябачна падаецца благадаць Святога Духа. Праваслаўная Царква мае сем таінстваў: Хрышчэнне, Мірапамазанне, Пакаянне (Споведзь), Прычасце, Шлюб, Свяшчэнства і Алееасвячэнне.

Таінства Хрышчэння як бы адкрывае перад чалавекам дзверы ў Царкву Хрыстову, і толькі той, хто прыняў яго, можа прыняць іншыя таінствы. Адбываецца Хрышчэнне праз трохразовае апусканне ў ваду і прыкліканне імя Найсвяцейшай Троіцы — Айца, і Сына, і Святога Духа. Тым самым чалавек амываецца ад першароднага граху Адама і Евы і ад іншых грахоў, якія твярыў да Хрышчэння.

Услед за Хрышчэннем адбываецца таінства Мірапамазання. Верніку крыжападобна памазваюцца лоб, вочы, вушы, рот, грудзі, рукі і ногі са словамі: «Пячатка дару Духа Святога, амінь*».

Такім чынам, чалавек атрымлівае дары Святога Духа, якія мацуюць яго ў духоўным жыцці. Пры гэтым карыстаюцца святым мірам — сумессю алею і духмяных рэчываў, асвячонай першым епіскапам памеснай царквы (Патрыярхам Маскоўскім).

Таінствы Хрышчэння і Мірапамазання твораца раз у жыцці. Для набыцця такой благадаці ад чалавека патрабуюцца вера і шчырае пакаянне, асабістыя намаганні, адмаўленне грахоўнага жыцця, цвёрдая рашучасць пачаць новае хрысціянскае жыццё.

---

* **Амінь** — сапраўды так.

Тым, хто прымаюць Хрышчэнне, даюць імёны ўшанаваных Царквою святых. Калі трымацца царкоўных канонаў, дык імя неабходна выбіраць з тых, якія прыпадаюць на першыя 8 дзён царкоўнага календара пасля народзін дзіцяці. У наш час бацькі звычайна самі выбіраюць імя хрышчонаму дзіцятку. І ягоным днём Ангела (імянінамі) будзе лічыцца дзень памяці святога, які мае аднолькавае імя з хрышчоным і дзень памяці якога бліжэйшы (паводле царкоўнага календара) пасля народзін дзіцяці.

Паколькі праваслаўныя хрысціяне носяць імёны святых, яны з ранняга дзяцінства павінны паважаць сваё імя, ведаць жыціе свайго нябеснага заступніка і малітвы да яго.

Пасля Хрышчэння на нованароджанага святаром ускладаецца нацельны крыж, абавязкова асвячоны ў царкве. Каб у дзіцяткі крыжык не згубіўся, на першы час маці можа вышыць яго на кашульцы. Пасля крыж трэба насіць на сабе. Дарослым не лішне напомніць, што крыж ні ў якім разе не ювелірнае ўпрыгожванне, якім трэба выхваляцца (не выпадкова ён называецца нацельны). І зусім ужо блюзнерства, калі крыж носяць, прыкладам, як завушніцу.

Хросныя бацькі павінны быць дабрачыннымі праваслаўнымі людзьмі, якія разумеюць сваю адказнасць за будучае выхаванне хрэсніка. Хроснымі бацькамі не могуць быць манахі, манашкі і бацькі сваіх дзяцей. У аднаго і таго ж дзіцяці не могуць быць хроснымі бацькамі муж і жонка, але пры гэтым ім дазваляецца быць хроснымі бацькамі розных дзяцей у адных бацькоў. З'яўляючыся хроснымі бацькамі і ўступаючы тым самым у духоўную роднасць з хрышчоным і між сабою, «кум» і «кума» ў далейшым не маюць права браць між сабою шлюб.

Неабходна памятаць, што ў выпадку небяспекі для жыцця нехрышчонага чалавека таінства Хрышчэння над ім можа здзейсніць не толькі святар, але і ўсякі праваслаўны хрысціянін.

Прыняўшы благадаць Хрышчэння, не трэба забывацца, што яно хаця і змывае былыя грахі, але не вызваляе ад будучых. Таму адным таінствам Хрышчэння праваслаўны чалавек абмежавацца не можа.

Пакаянне

Зямное жыццё хрысціяніна палягае ў няспыннай барацьбе з грахом. І ў гэтай барацьбе, абумоўленай уздзеяннем знешніх спакус і асабістых страсцей, магчымы часовыя паражэнні. Дзе чалавеку знайсці сілы, каб не адчаяцца і зноў падняцца? Дзе і як ачысціць сумленне? Вось тут і дапамагае Святая Царква. Яна лечыць грахоўныя язвы таінствам Пакаяння (Споведзі).

Вернік спавядае (вусна адкрывае) Богу свае грахі ў прысутнасці святара і атрымлівае праз яго прабачэнне грахоў ад Госпада. Улада адпускаць людзям грахі была дадзена напачатку апосталам, а праз іх усім святарам Іісусам Хрыстом: «Прыміце Духа Святога. Каму прабачыце грахі, таму прабачацца; на кім пакінеце, на тым застануцца» (Ін. 20:22-23). Ад спавядальца для адпушчэння грахоў патрабуецца прымірэнне з бліжнімі, шчырае раскаянне ў грахах, цвёрды намер не паўтараць іх, вера ў Хрыста і надзея на Гасподнюю міласэрнасць. Раскрыццё тайны Споведзі ёсць для святара найвялікшы грэх.

Першая Споведзь — этапны момант у жыцці. На жаль, многія хрышчоныя ў маленстве, дасягнуўшы сталага ўзросту, так ні разу і не паспавядаліся. Уявім сабе,

што чалавека адзін раз у дзяцінстве вымылі, і пасля гэтага ён дзесяцігоддзямі жыве нямыты... Так і з душою без Споведзі — утвараецца тоўстая «скарлупіна» грахоўнасці, якая аддаляе чалавека ад Бога. Сумленне ў гэтым выпадку змаўкае. Такі чалавек не бачыць свайго духоўнага «начыння», гатовы лічыць сябе бязгрэшным, які жыве «як усе». На жаль, толькі жыццёвыя ўзрушэнні і няшчасці могуць прымусіць такога чалавека адумацца.

Першая ў жыцці Споведзь — вельмі важная вяха на шляху ўцаркаўлення. Да яе неабходна сябе рыхтаваць: для пачатку ўсвядоміць свае парушэнні Запаведзяў Гасподніх, успамінаючы іх усе (звычайна мы памятаем «не забівай» і «не крадзі»...). Акрамя таго, патрэбна звярнуцца да Бога з малітваю, каб ён адкрыў (напомніў) грахі, што намі забыліся. Спаведнік павінен перамагчы вялікія спакушэнні, бо ён выходзіць з-пад уздзеяння злой сілы, якая доўгія гады запаланяла яго.

Як часта спавядацца? У старыя часы лічылася, што гэта трэба рабіць не менш чатырох разоў на год (у кожны з чатырох пастоў). Цяпер, калі наша жыццё ўскладнілася, таінства Пакаяння трэба спаўняць часцей, каб не прызвычаіцца да стану грахоўнасці. Звычка ж граху — пагібельна! «Хіба не ведаеце, што няправедныя Царства Божага не спадкуюць? Не ашуквайце саміх сябе: ні блудадзеі, ні ідаласлугоўцы, ні распуснікі, ні ганебцы, ні мужаложцы, ні злодзеі, ні хабарнікі, ні п’яніцы, ні ліхасловы, ні драпежнікі — Царства Божага не спадкуюць» (1Кар. 6:9-10).

Памажы нам, Госпадзі, усвядоміць гэта.

Прычасце

Гэта таінства, у якім вернік пад выглядам хлеба і віна карыстае Цела і Кроў Хрыстову. Такім чынам, ён прылучаецца да Ісуса Хрыста і таямніцы векавечнасці жыцця.

Прычасце, як і астатнія царкоўныя таінствы, з’яўляецца багадзейным. Праз яго на чалавека таямніча сыходзіць благадаць Божая, Яго ратавальная сіла.

Творыцца таінства Прычасця ў царкве на Літургіі. Усталявалася таінства Самім Ісусам Хрыстом у час Тайнай вячэры напярэдадні Сваіх мук і смерці. Апостал і евангеліст Матфей піша: «Ісус узяў хлеб і, благаславіўшы, пераламаў яго, і, раздаючы вучням, сказаў: прыміце, ежце: гэта Цела Маё. І, узяўшы чашу і падзячыўшы, падаў ім, і сказаў: піце з яе ўсе; бо гэта Кроў Мая Новага Запавета, за многіх праліваная дзеля збаўлення грахоў» (Мф. 26:26-28).

Да таінства Прычасця праваслаўныя вернікі рыхтуюць сябе не менш як трохдзённым постам (ён распаўсюджваецца і на інтымныя адносіны мужа і жонкі), шчырай малітваю (праваслаўныя малітвасловы ўтрымліваюць спецыяльнае Правіла да Прычасця) і Споведдзю (г. зн. ачышчаюць сваё сумленне ў таінстве Пакаяння). Вось як пра гэта піша апостал Павел: «Хай выпрабоўвае сябе чалавек, і такім чынам няхай есць з хлеба гэтага і п’е з чашы гэтай. Бо, хто есць і п’е нягожа, той есць і п’е асуджэнне сабе, не думаючы пра Цела Гасподняе. Таму многія з вас нямоглыя і хворыя, і многія паміраюць» (1Кар. 11:28-30). Аніводзін хрысціянін (ні святар, ні свецкі чалавек) не мае права прычашчацца двойчы за дзень. Без адпаведнай падрыхтоўкі прычашчацца могуць толькі дзеці да сямі гадоў.

Усе, хто прычашчаюцца, павінны прыступаць да святой Чашы нашча, у глыбокай пакоры, склаўшы рукі крыжам на грудзях (правая рука зверху левай). Пасля

Прычасця вернікі захоўваюць сябе ў чысціні, устрыманні і немнагаслоўі дзеля вялікай святасці, што сышла на іх.

Выключна важным і неабходным з'яўляецца Прычасце для хворых, нямоглых, састарэлых і ў перадсмяротны час. Запрашаць да такіх людзей святара — значыць, палегчыць іх пакуты і пераход у вечнасць.

Шлюб

Шлюб ёсць таінства, у якім пры шчырым абяцанні маладым і маладой узаемнай вернасці (перад святаром, Царквою і Богам) благаслаўляецца іх шлюбны саюз, прызываецца і падаецца Божая ласка для ўзаемнай дапамогі, аднадушша, шчаслівых народзін і хрысціянскага выхавання дзяцей. Ужо сам падзел людзей на мужчынскі і жаночы пол указвае на тое, што яны створаны для ўзаемнага дапаўнення.

Шлюбны саюз паміж маладымі мае за духоўную мэту саюз Хрыста і Царквы і сталюецца на любові Хрыста да Царквы і на поўнай адданасці Царквы (таксама ўсталяванай на любові) волі Хрыстовай. Таму муж павінен самааддана любіць жонку, а жонка — з любоўю падначальвацца мужу, пераадольваючы тым самым уласнае сябелюбства. Узаемную любоў і павагу, адданасць і вернасць муж і жонка абавязаны захоўваць на працягу жыцця. Такім чынам, таінства Шлюбу і царкоўнае благаславенне маюць працягласць таксама ўсяго сумеснага жыцця.

Сям'я ёсць малая дамашняя царква і асноведзь Царквы Хрыстовай. Калі ж у шлюбе адбывалася толькі знешняе (а не духоўнае) яднанне, калі самастойнасць, сябелюбства і ганарліўства засталіся неперааснсаванымі, дык вынікам такога шлюбу будзе немінучая адчужэнне і раскол дамашняй царквы.

Шлюб створаны Самім Богам яшчэ ў раі да грахоўнага зняпаду прабацькоў: «Нядобра быць чалавеку аднаму: створым яму памочніка» (Быц. 2:18). «І сказаў ім Бог: пладзіцеся і множцеся, і напаўняйце зямлю, і валадарце ёю» (Быц. 1:28). Таму народзіны дзяцей з'яўляюцца асаблівым благаславеннем Божым і радасцю для сям'і. Шлюб у Кане Галілейскай асвяціў сваёй прысутнасцю Гасподзь наш Іісус Хрыстос, сатварыўшы першае Своё дзіва (Ін. 2:1-12).

Таінства Шлюбу (вянчанне) творыцца ў царкве ў прысутнасці родных і сяброў маладога і маладой звычайна пасля Літургіі, у час якой маладыя спавядаюцца і прычашчаюцца Святых Тайнаў.

Для вянчання царкоўны ўстаў вызначае строга адпаведныя дні: панядзелак, сераду, пятніцу і нядзелю. Вянчанне не адбываецца ў дні пастоў і напярэдадні царкоўных свят. Перад вянчаннем маладым даюцца патрэбныя тлумачэнні. Абмен кольцамі сведчыць аб цвёрдасці ўзаемных абяцанняў. Вянцы — знак перамогі над страсцямі і напамін аб абавязку зберагаць чысціню шлюбу. Агульная чаша — знак агульнага лёсу і неабходнасці падзяляць радасць і гора. Трохразовы абыход вакол аналою — сімвал трываласці шлюбу.

Для тварэння таінства існуюць і перашкоды. Царква дапускае толькі трохразовы шлюб, забараняе яго для асоб, якія маюць блізкую ступень роднасці альбо роднасць духоўную (кумаўство і звязаныя з гэтым абставіны). Царква не благаслаўляе шлюб для перакананых атэістаў і для нехрышчоных. Нельга тварыць таінства і ў тым выпадку, калі нескасаваны шлюб з іншай асобаю (права касавання шлюбу належыць архірэю).

А ўрэшце прывядзём словы Іаана Златавуста: «Дзе муж, жонка і дзеці з'яднаны сувяззю дабрачыннасці, згоды і любові, там сярод іх Хрыстос».

Алееасвячэнне

Гэта таінства, у якім пры памазанні хворага асвячоным алеем прыклікаецца Божая ласка для вылячэння яго ад цялеснай і душэўнай немачы.

Паводле праваслаўнага веравызнання, крыніца гэтых немачаў — чалавечы грэх. На сувязь хвароб з грахоўнасцю паказаў нам Сам Збавіцель у Евангеллі ад Марка: «І прыйшлі да яго з паралізаваным, якога неслі чацвёра... Ісус, убачыўшы іх веру, кажа паралізаванаму: дзіця! прабачаюцца табе грахі твае» (Мк. 2:3-5). Пасля гэтага хворы адразу ацаліўся. Затым пасланыя Збавіцелем апосталы «пайшлі і прапаведавалі пакаянне; выганялі многіх нячысцікаў і многіх хворых мазалі маслам і ацалялі» (Мк. 6:12-13).

Найбольш дакладна раскрываецца сутнасць таінства Алееасвячэння ў саборным пасланні апостала Іакава: «Калі хворы каторы з вас, хай пакліча прасвітараў Царквы, і хай памоляцца над ім, памазаўшы яго алеем у імя Гасподняе. І малітва веры дасць гаенне хвораму, і падыме яго Гасподзь; і калі ён учыніў грахі, прабачацца яму» (Іак. 5:14-15).

Такім чынам, Алееасвячэнне ёсць таінства духоўнага, душэўнага і фізічнага ацалення чалавека, які вызваляецца і ад несвядомых, і ад забытых, а значыць, нераскаяных грахоў. Насуперак шматлікім памылковым думкам таінства Алееасвячэння не з’яўляецца перадсмяротным абрадам, а можа тварыцца на працягу жыцця неаднаразова (напрыклад, у Вялікі пост), а ўвогуле не часцей аднаго разу на год. Не творыцца Алееасвячэнне над малымі дзецьмі, паколькі ў іх не бывае грахоў. Месцам тварэння таінства можа быць не толькі храм, але і дом, і бальніца. Звычайна для Алееасвячэння патрабуецца ўдзел сямі святароў (лічба 7 сімвалізуе мноства, паўнату, саборнасць). Адсюль вынікае і другая назва таінства — Сабораванне. Але па неабходнасці яно можа быць праведзена і адным святаром. Пры Алееасвячэнні прачытваецца 7 апостальскіх і евангельскіх чытанняў, 7 малітваў аб нездаровых і робіцца 7 памазанняў алеем (у сабораванага крыжападобна памазваецца лоб, шчокі, грудзі і рукі). Напрыканцы таінства на галаву сабораванага святар кладзе раскрытае Святое Евангелле (літарамі ўніз) і чытае дазвольную малітву для адпушчэння грахоў. Праваслаўная Царква ведае шмат выпадкаў хуткіх, а часам імгненных, ацаленняў нямоглых пасля тварэння над імі таінства Алееасвячэння. Калі сабораваны ўсё ж памірае, дык праз гэтае таінства ён набывае асаблівую благадатную дапамогу пры пераходзе ў іншы свет.

Святарства

Свяшчэнствам называецца таінства, у якім праз архірэйскае пасвячэнне чалавек атрымлівае благадаць Святога Духа для свяшчэннага служэння Царкве Хрыстовай (у сане дыякана, свяшчэнніка ці епіскапа). Гэтае таінства можа тварыцца толькі над асобамі мужчынскага полу першага шлюбу ці прыняўшымі манаскі пострыг і якія ўваходзяць у царкоўны клір.

Пасвячоны ў дыякана (першая ступень свяшчэнства) атрымлівае благадаць служыць і дапамагаць пры тварэнні таінстваў. Пасвячоны з дыякана ў святара (свяшчэнніка) атрымлівае благадаць тварыць усе таінствы, за выключэннем самога Свяшчэнства. Рукапакладзены ў епіскапа атрымлівае благадаць не толькі тварыць

таінства, але і пасвячаць іншых для тварэння таінстваў. Згодна са старадаўнім звычаем, у сан епіскапа пасвячаюць святароў толькі ў манаскім чыне ці архімандрытаў (манастырскіх настаяцеляў).

Таінства свяшчэнства ўсталявана Госпадам нашым Іісусам Хрыстом, які, па сведчанні апостала Паўла, «паставіў адных апосталамі, другіх прарокамі, некаторых евангелістамі, іншых пастырамі і настаўнікамі, для ўтварэння святых, для справы служэння...» (Еф. 4:11-12).

Аб выбранні і пасвячэнні самімі апосталамі першых дыяканаў, гаворыцца: «Іх паставілі перад апосталамі, і яны, памаліўшыся, усклалі на іх рукі» (Дзеян. 6:6). У той жа евангельскай кнізе «Дзеянні святых Апосталаў» апісваецца пасвячэнне святароў для былых язычнікаў: «Рукапаклаўшы ім прасвітараў у кожнай царкве, яны (апосталы Павел і Варнава.— *Аўт.*) памаліліся з постам і перадалі іх Госпаду, у Якога ўверавалі» (Дзеян. 14:23). Такім чынам і ўсталяваўся той парадак Свяшчэнства, які трымаецца ў Праваслаўнай Царкве да сёння.

Праца святара надзвычай адказная, бо ён павінен даваць адказ за сваю паству перад Судом Божым. Адначасова з гарачай малітваю і багавейным тварэннем таінстваў ён несупынна павінен несці сваім прыхаджанам слова збаўлення: як ратаваць душу, як перайначыць і куды накіраваць жыццё, як пераадолець цяжкасці жыцця, як перамагчы журбу і хворасці, як засцерагчыся ад граху і набыць благадаць Божую. Таму словы, адрасаваныя апосталам Паўлам свайму вучню Цімафею, напісаны на нагрудным крыжы святароў і заўжды нагадваюць пастыру пра ягоныя абавязкі: «Будзь узорам вернікам у слове, у жыцці, у любові, у духу, у веры, у чысціні» (1Цім. 4:12).

Азнаёміўшыся з кароткім апісаннем сямі царкоўных таінстваў, пяройдзем да разгляду некаторых абрадаў Праваслаўнай Царквы.

МАЛЕБНЫ І ЦАРКОЎНЫЯ АСВЯЧЭННІ

Малебнам называецца кароткае богаслужэнне, пры якім багамольцы звяртаюцца за дапамогай да Госпада Бога, Маці Божай, святых угоднікаў Божых альбо дзячаць за атрыманыя даброты.

Акрамя агульных малебнаў-прашэнняў ёсць малебны іншыя: аб ацаленні хворых, аб дальніх падарожніках, малебны ў час засухі, праліўных дажджоў, эпідэмій, вайны.

Малебны могуць тварыцца як у храме, так і па просьбах вернікаў у прыватных дамах.

Пры асвячэнні, да прыкладу, новага дома святар пасля чытання патрэбных малітваў акрапляе святою вадой сцены, ставіць асвячоным алеем на чатырох накірунках свету крыжы і кадзіць пакоі.

Малебны пры благаславенні розных прадметаў могуць асвячацца вадою, якая, паводле хрысціянскага ўсведамлення, мае вялікую ачышчальную і жыватворную сілу. Гасподзь наш Іісус Хрыстос Сваім Хрышчэннем «патапіў у водах Іардана грахі ўсяго свету», адначасова асвяціўшы водную стыхію. Таму напярэдадні і ў самы дзень свята Хрышчэння Гасподняга творыцца вялікае водаасвячэнне з трохразовым акунаннем у ваду Жыватворнага Крыжа, благаславенне вады рукатворным хрышчэннем, малітвамі і духоўнымі спевамі. Вадохрышчанская святая вада назы-

Ікона Сабора Беларускіх Святых

Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр

Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр

Ікона Трох Віленскіх Мучанікаў з часціцамі святых мошчаў

Узноўлены Крыж прападобнай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай

Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку

Чын Уздвіжання і пакланення Крыжу. Богаяўленскі кафедральны сабор. Полацк. 26 верасня 1997г.

Ікона прападобнай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай

Богаслужэнне ў Свята-Успенскім саборы. Жыровічы

Жыровіцкая цудатворная ікона Божай Маці

Баркалабаўская цудатворная ікона Божай Маці Адзігітрыі

ваецца вялікай агіасмай (*грэч.*— асвячаная), з'яўляецца важнай царкоўнай святыняй і разглядаецца як першая ступень святога Прычасця.

Малое водаасвячэнне ёсць скарочаны абрад і можа тварыцца як у святочныя, так і ў звычайныя дні па просьбах вернікаў.

Вадохрышчанскую ваду прыносяць дахаты і ў той самы дзень акрапляюць ёю жытло, гаспадарчыя пабудовы, людзей і хатніх жывёл. Яе зберагаюць на працягу года, ужываюць пры розных нядужасцях. Гэтай вадою карыстаюцца, каб адагнаць з палёў і садоў розных шкоднікаў. Пры гэтым творыцца адпаведны малебен святаром.

На працягу царкоўнага года адбываюцца асвячэнні: вярбы ў Вербную нядзелю, артаса (*грэч.*— хлеб) і чырвоных яек на Пасху, царкоўных свечак у свята Стрэчання Гасподняга (15 лютага). На свята Ражаства Іаана Прадцечы (7 ліпеня) асвячаюцца лекавыя травы і іншыя «духмяныя зёлкі». Дзень 14 жніўня ў народзе называецца Першым Спасам ці Макавеем. Існуе звычай асвячаць у гэты дзень насенне і мёд новага збору. У свята Праабражэння Гасподняга (19 жніўня) асвячаюцца яблыкі і плады новага ўраджаю. Народная назва свята — Другі, ці Яблычны, Спас. Дзень 29 жніўня прысвечаны Нерукатворнаму Вобразу Госпада нашага Ісуса Хрыста і ў народзе названы Трэцім Спасам ці Спасам на палатне. У гэты дзень здаўна асвячалі лён.

Такі далёка не поўны пералік царкоўных асвячэнняў.

ПАМІНАННЕ СПАЧЫЛЫХ

Фізічная смерць праваслаўнага чалавека не перапыняе ягонай сувязі з Царквою. Апостал і евангеліст Лука піша: «Бог не ёсць Бог памерлых, але жывых; бо ў Яго ўсе жывыя» (Лк. 20:38). Пра гэта чытаем і ў апостала Паўла: «Ніхто з нас не жыве для сябе, і ніхто не памірае для сябе; калі жывем — для Госпада жывем, калі паміраем — для Госпада паміраем. І таму ці жывем, ці паміраем — заўжды Гасподнія. Бо Хрыстос для таго і памёр, і ўваскрос, і ажыў, каб уладарыць і над мёртвымі, і над жывымі» (Рым. 14:7-9).

Духоўная сувязь Царквы са спачылым выяўляецца найперш у шчырай малітве за яго ў асобныя дні. Гэтыя дні — трэці, дзевяты, саракавы і гадавіна па смерці (адлік пачынаецца з дня смерці). Адпяванне (пахаванне) нябожчыка адбываецца на **трэці дзень** у знак Уваскрасення Ісуса Хрыста на трэці дзень і ў знак Святой Тройцы. На **дзевяты** дзень Царква памінае нябожчыка ў знак дзевяці ангельскіх чыноў — слуг Нябеснага Цара, якія хадайнічаюць аб памілаванні спачылага. На **саракавы дзень** творыцца малітва, каб Ісус Хрыстос, Які ўзнёсся на нябёсы Гасподнія ў саракавы дзень, узнёс на нябёсы і душу спачылага. Часам паводле жадання родных нябожчыка памінанне творыцца штодзень на працягу ўсіх сарака дзён. Такое памінанне называецца *саракавустам.* У **гадавіну смерці** родзічы і блізкія спачылага моляцца за яго, выказваючы гэтым веру ў тое, што дзень смерці ёсць дзень новых народзін чалавека для векавечнага жыцця.

Царкоўнае Паданне расказвае, што першыя два дні душа памерлага прысутнічае на зямлі, ходзіць з Ангелам па месцах сваіх зямных радасцей і горасцей, добрых і злых спраў, лунае ля труны са сваім целам. Таму суцяшальна для нябожчыка ў гэты час чытанне Псалтыра.

На трэці дзень душа ўзносіцца да Прастола Гасподняга, каб пакланіцца Яму. Ад трэцяга да дзевятага дня душа аглядае райскія харомы і бачыць, якога невыказнага

5 Зак. 2210

блажэнства пазбавіла сябе з прычыны грахоўнасці. У дзевяты дзень душа зноў знаходзіцца ля Прастола Гасподняга, каб пакланяцца Яму. З дзевятага па саракавы дзень душа аглядае пекла і ўсведамляе, што ўсё гэта яна заслужыла паводле сваіх грахоў. На саракавы дзень душа трэці раз узносіцца да Прастола Усявышняга, і тут адбываецца Папярэдні Суд, які вызначае яе лёс, яе месцазнаходжанне да Страшнага Суда. Таму і патрэбны царкоўныя малітвы і памінанні спачылага ў першыя сорак дзён. Нашы малітвы замаўляюць яго грахі, палягчаюць далейшае незямное існаванне.

Не адпяваюцца Царквою людзі, якія свядома пазбавілі сябе жыцця. Для адпявання людзей, якія пазбавілі сябе жыцця ў стане несвядомасці, яго родныя павінны мець дазвол архірэя.

Акрамя згаданых дзён Царквою ўсталяваны дні ўсеагульнага памінання спачылых: Мясапусная бацькоўская субота (перад Масленіцай), субота 2-ой, 3-яй, 4-ай сядміц Вялікага посту, Радаўніца, Троіцкая і Дзімітрыеўская бацькоўскія суботы, а таксама дні 9 мая і 11 верасня (памінанне пераважна праваслаўных воінаў).

Такім чынам, для праваслаўнага чалавека памінанне спачылых ёсць справа любові і хрысціянскага абавязку.

МУЖ І ЖОНКА Ў НОВЫМ ЗАПАВЕЦЕ

Разважаючы над перапляценнямі лёсаў, чалавек хутка пераконваецца ў той асаблівай таямнічасці, якая ўласціва праблеме ўзаемаадносін полаў. Сённяшні грамадзянскі разгляд праблемы — спрошчаны, прымітызаваны, дзе ўсё часам зводзіцца да эротыкі і гараскопаў, да Дарвіна ці Фрэйда. Поўнае і правільнае вырашэнне азначаных супярэчнасцей ва ўзаемаадносінах полаў даецца ў Новым Запавеце. Няма ў свеце іншых законаў акрамя тых, што ўсталяваны Госпадам нашым і Творцам. Любыя спробы ўстанаўлення іншых законаў — надуманыя і з’яўляюцца звычайнай распустай.

Ўзаемаадносіны мужчыны і жанчыны

У Новым Запавеце дакладна вызначана розніца ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны, мужа і жонкі. Апостал Павел зазначае: «Добра чалавеку не кранацца жанчыны» (1 Кар. 7:1). Больш таго, у евангеліста Матфея чытаем: «Кожны, хто глядзіць на жанчыну пажадліва, ужо пралюбадзейнічае з ёю ў сэрцы сваім» (Мф. 5:28). Мужчына і жанчына — яшчэ не муж і жонка. Вось як адбываецца ў Новым Запавеце выкрыванне грахоўнасці самаранкі. «Жанчына адказала: я не маю мужа. Ісус гаворыць ёй: праўду ты сказала, што ў цябе няма мужа; бо ты мела пяць мужоў, і той, каго зараз маеш, не муж табе; гэта справядліва ты сказала» (Ін. 4:17-18). Унутраны голас — сумленне — не дазваляюць самаранцы назваць таго, шостага па ліку, мужам, за што яна атрымлівае ўхвалу Ісуса. Гэтым ясна даведзена недапушчальнасць усякіх пазашлюбных адносін. І вось што яшчэ павучальна: на словах і на справе зневажаючы сям’ю, дачка, напрыклад, можа расказаць маці пра ўзаемаадносіны з мужам, аднак ніколі не раскажа пра свае прыгоды з палюбоўнікамі, унутрана ўсведамляючы іх злачыннасць.

Бясспрэчна, гэтыя пазашлюбныя адносіны агідныя і беззаконныя, сувязі хаатычныя і зменлівыя. Паступова адбываецца і незваротная растрата чалавека. І не толькі растрата цела, але і растрата душы. Зусім інакш бывае ў мужа з жонкай, дзе (у ідэале, безумоўна) мае месца поўнае адзінства, своеасаблівы закон «спалучаных пасудзін», дзе нішто — ні душа, ні цела — не страчваюцца, але прымнажаюцца (прынамсі, у дзецях).

Шлюбныя адносіны мужа і жонкі

Апостал Павел, які сказаў, што «добра чалавеку не кранацца жанчыны», далей у Евангеллі асуджае тых, хто забараняе браць шлюб, «...бо ўсякае тварэнне Бога добрае» (1 Цім. 4:4). Аднак чаму сказана «добра не кранацца»? Справа ў тым, што ўся светабудова і з ёю быццё наша строга іерархічныя. І перш за ўсё неабходна служыць Богу, а потым толькі — мужу ці жонцы. «Нежанаты клапоціцца пра Гасподняе, як дагадзіць Госпаду; а жанаты клапоціцца аб людскім, як дагадзіць жонцы. Ёсць рознасць паміж замужняю і дзяўчынай: незамужняя клапоціцца пра Гасподняе, як дагадзіць Госпаду, каб быць святою і целам, і духам; а замужняя клапоціцца аб людскім, як дагадзіць мужу» (1 Кар. 7:32-34).

Вось тут і паўстае гордасць чалавечая! Яна не заўжды здатна скарыцца, прызнаць неабходнасць падначалення жаночай асновы аснове мужчынскай, вытрымаць маральную чысціню ўзаемаадносін. Але няхай свой гонар такая жанчына суцішыць, яшчэ раз перачытаўшы словы апостала Паўла, што ўпаміналіся намі, і наступнае: «Каб пазбегнуць распусты, кожны няхай мае сваю жонку, і кожная жонка няхай мае свайго мужа. Муж, аказвай жонцы неабходную прыязнасць; таксама і жонка мужу. Жонка не ўладарыць сваім целам, а муж; роўна і муж не ўладарыць сваім целам, а жонка. Не пазбягайце адзін аднаго, хіба толькі па згодзе, часова, для посту і малітвы, а пасля зноў будзьце разам, каб не спакушаў вас сатана неўстрыманнем вашым. Аднак гэта сказана мною як дазвол, а не як загад... бясшлюбным жа і ўдовам гавару: добра ім заставацца, як я; калі ж не могуць устрымацца, няхай бяруць шлюб; бо лепш узяць шлюб, чым распальвацца. Тым, хто ўзяў шлюб, не я загадваю, а Гасподзь: жонцы не разводзіцца з мужам (калі ж развядзецца, то павінна заставацца бясшлюбнай ці прымірыцца з мужам сваім) і мужу не пакідаць жонкі сваёй» (1 Кар. 7:2-6, 8-11). Не ўсе маюць меру апостальскага ўстрымання, але распуста аднолькава пагібельна для ўсіх, і шматлітасцівы Гасподзь зацвярджае выратавальны шлюб. Гэта выратавальнасць шлюбу і сям'і не рытарычна, ад яе зыходзіць краса пастаянства, спакою, ладу, утульнасці — усяго асабліва каштоўнага для чыстага дзіцячага ўспрымання. Сапраўды «ўсякае тварэнне Бога добрае» і цудадзейная сям'я, дзе ўсё на месцы і па чыне, згода і любоў».

Шлюб — выратаванне для веруючага

Ці толькі сродкам ад распусты з'яўляецца шлюб? Паводле слоў апостала, шлюб можа стаць асвячэннем і выратаваннем для няверуючага. «...Калі які брат мае жонку няверуючую, і яна згодна жыць з ім, то ён не павінен пакідаць яе; і жонка, якая мае мужа няверуючага, і ён згодны жыць з ёю, не павінна пакідаць яго; бо няверуючы

муж асвячаецца жонкаю веруючай, і жонка няверуючая асвячаецца мужам веруючым; інакш дзеці вашы былі б нячыстыя, а цяпер святыя. Калі няверуючы хоча развесціся, няхай разводзіцца... Няўжо ведама табе, жонка, ці не выратуеш мужа? Альбо табе, муж, няўжо ведама, ці не выратуеш жонку?» (1 Кар. 7:12-16). Вось сапраўдная і вялікая падстава для шлюбнай любові! Тут пачынае дзейнічаць той самы закон «спалучаных пасудзін». Божая ласка, што распасціраецца на кожнага хрысціяніна, няўхільна будзе перадавацца няверуючым мужу ці жонцы і тварыць сваё выратавальнае, святое ўздзеянне.

Ці скардзіцца чалавеку на свой лёс, калі сталася ў жыцці быць без шлюбу? Намысел Божы, клопат Яго пра чалавека заўжды выратавальны. Таму і звяртаецца да нас апостал: «Я вам кажу, брацiя: час ужо нядоўгі, тыя, хто маюць жонак, павінны быць, як тыя, хто не маюць!» (1 Кар. 7:29).

Аб скасаванні шлюбу

Ці не мы самі робім сумесна наша жыццё невыносным? Ці не мы самі ствараем «скорби по плоти»? Аднак лічым за лепшае шукаць вінаватых сярод іншых, у розных знешніх абставінах, не шкадуем адзін аднаго ў сварках, разводах.

Развод — разрыў той адзінай плоці, якую спалучыў Бог. Вось чаму ён так балюча непераносны. І наколькі шлюб быў сапраўдным — настолькі балючым стане гвалтоўны яго разрыў па жывому. Парываюцца найтанчэйшыя духоўныя ніці, разбураюцца прыхільнасці і звычкі, вярэдзіцца патаемнае і інтымнае, нясцерпным становіцца боль душы... Ці дазволена ўсё ж чалавеку разводзіцца, касаваць свой шлюб? Вось што гаворыць Ісус Хрыстос: «Што Бог з'яднаў, таго чалавек хай не разлучае... Я кажу вам: хто развядзецца з жонкаю сваёй не за пралюбадзейства і ажэніцца з другою, той распуснічае; і хто ажэніцца з разведзенай — чыніць пралюбадзейства» (Мф. 19:6, 9).

Бясспрэчна, развод ёсць злачынаства супраць Закона, супраць усталяванай Богам самой прыроды рэчаў. Прычына ж ва ўсіх разводах заўжды адна — неміласэрнасць. І самая большая неміласэрнасць — пралюбадзейства, сямейная здрада. Толькі па гэтай прычыне скасаванне шлюбу можа быць дазволена, у супрацьлеглым выпадку вызваліць чалавека ад шлюбу можа толькі смерць (Рым. 7:2-3).

Аб падначаленні жонкі і мужа

Разважаючы аб сям'і, заўжды трэба мець на ўвазе Богам усталяваную няроўнасць паміж мужам і жонкаю: «Муж... ёсць вобраз і слава Божыя; а жонка ёсць слава мужа. Бо не муж ад жонкі, але жонка ад мужа; і не муж створаны для жонкі, але жонка для мужа... Аднак ні муж без жонкі, ні жонка без мужа... усе ж — ад Бога» (1 Кар. 11:7-9, 11-12).

У кагосьці можа скласціся ўражанне аб шлюбе, як аб «уціску», «ярме», цяжкім абавязку, а для жонкі яшчэ і аб безумоўным і сляпым паслухмянстве, гвалтоўным падначаленні мужу. Так можа думаць чалавек з сімптомам той неміласэрнасці, аб якой упаміналася вышэй. Апостал Павел зноў жа даводзіць: «Так кожны з вас няхай любіць сваю жонку, як самога сябе; а жонка няхай баіцца свайго мужа» (Еф. 5:33).

«Так і вы, мужы, абыходзьцеся беражліва з жонкамі, як з далікатнай пасудзінай, аказваючы ім павагу, як сунаследніцам шчаслівага жыцця» (1 Пятр. 3:1-4, 7). Гэта азначэнне жонак як сунаследніц паказвае іх сапраўдную роўнасць з мужамі, але не ў праслаўтай «эмансіпацыі», а ў роўнасці перад Госпадам.

Хрысціянскі шлюб ператварае сям'ю ў дамашнюю царкву. Індывідуалізм і сябелюбства, якія ствараюць у шлюбе асаблівыя цяжкасці, павінны быць пераадолены намаганнямі абодвух супругаў. А гэта магчыма ажыццявіць толькі на шляху паглыблення духоўнага жыцця.

Гарантыя шчасця хрысціянскай сям'і сакрыта ў выкананні ўсімі яе членамі волі Божай, што яднае іх душы паміж сабою і з Хрыстом.

ПАСТЫ

Пост з'яўляецца важным дапаможнікам для паспяховага духоўнага жыцця. Прыклад посту даў нам Сам Гасподзь Іісус Хрыстос, які пасціўся ў пустыні 40 дзён (Мф. 4:2), а пасля Яго — мноства новазапаветных праведнікаў.

Пост — гэта практыкаванне, якое спрыяе падначаленню душы і цела духу, а праз гэта — Богу. Адначасова пост ёсць дзейсная зброя ў барацьбе з грахоўнымі спакусамі і заганамі, з сатаной (Мф. 17:21; Мк. 9:29).

Усякі пост павінен быць праявай асаблівага пакаяння, тварэннем шчырай малітвы і добрых спраў. У час пастоў праваслаўныя хрысціяне спавядаюцца і прычашчаюцца. Пры гэтым пост не можа быць паказны́м і крывадушным.

У дні посту з рацыёну зусім выключаюцца тлушч, мяса, малако, яйкі. Ежа раслiннага паходжання ўжываецца ва ўмеранай колькасці.

Усяго шматдзённых пастоў чатыры. Самы галоўны і строгі — **Вялікі**, які доўжыцца сем тыдняў перад Пасхай (Вялікаднём) і які складаецца з саракадзённага посту (Чатырыдзесятніцы) і посту Страсной сядміцы «ради спасительных страстей» Хрыстовых. У Вялікі пост царкоўны ўстаў дазваляе ўжываць алей толькі па суботах, нядзелях і ў дні памяці асабліва шаноўных святых, а рыбу — толькі ў святы Благавешчання (7 красавіка) і Уваходу Гасподняга ў Іерусалім (Вербная нядзеля). Прычым тлушч і мяса выключаюцца з ежы ўжо ў апошні прадпосны тыдзень — Масленіцу, ва ўсе дні якой дазваляецца ўжываць малочную ежу.

Другі пост — **Пятроўскі** (народная назва — Пятроўка) пачынаецца праз тыдзень пасля Святой Троіцы (Сёмухі) і працягваецца да свята першавярхоўных святых апосталаў Пятра і Паўла (12 ліпеня). Працягласць гэтага посту бывае рознай, бо яго пачатак залежыць ад даты Вялікадня, а заканчэнне прыпадае на пярэдадзень пастаяннага свята. Пост усталяваны для наследавання прыкладу святых апосталаў, якія пасля прыняцця дароў Святога Духа постам і малітваю рыхтавалі сябе да сусветнай пропаведзі Евангелля. У гэты пост у панядзелак, сераду і пятніцу нельга ўжываць ні тлушчу, ні рыбы, ні алею. Калі дзень 12 ліпеня прыпадае на сераду ці пятніцу (посныя дні на працягу ўсяго года), дык пачатак ужывання мясной ежы (разгавенне) пераносяць на наступныя суткі, а ў гэты дзень ядуць толькі рыбу.

Блізкім па строгасці да Вялікага з'яўляецца двухтыднёвы **Успенскі пост** (народная назва — Спасаўка) — з 14 па 27 жніўня. Ім святая Царква надае павагу Прасвятой Багародзіцы, якая нязменна моліцца за нас, звяртаючыся да Бога. У гэты пост рацыён харчавання такі ж, як і ў Вялікі. Рыба дазваляецца толькі ў свята Пра-

абражэння Гасподняга — 19 жніўня. Пры супадзенні свята Успення з серадой ці пятніцай у гэты дзень дазваляецца есці толькі рыбу, а разгавенне пераносіцца на наступныя суткі.

Калядны пост (народная назва — Пiлiпаўка) працягваецца шэсць тыдняў перад Ражаством Хрыстовым — з 28 лістапада па 6 студзеня (уключна). Харчаванне такое ж, як і ў Пятроўскі пост. Пасля дня памяці свяціцеля Нікалая (19 снежня) рыба дазваляецца толькі ў суботу і нядзелю. Напярэдадні Каляд (6 студзеня) царкоўны ўстаў дазваляе ўжываць толькі сочыва (пшаніцу з мёдам).

Акрамя названых пастоў святой Царквою ўсталяваны **аднадзённыя строгія пасты:** напярэдадні Хрышчэння Гасподняга — 18 студзеня, у дні Усекнавення галавы святога Іаана Прадцечы — 11 верасня і Уздзвіжання Крыжа Гасподняга — 27 верасня. Дазваляецца ўжываць алей.

На працягу ўсяго года, як ужо адзначалася, **поснымі днямі з'яўляюцца серада і пятніца**: у памяць здрадніцтва Іуды Іскарыёта — серада, укрыжавання і смерці Збавіцеля — пятніца (калі дні гэтыя не прыпадаюць на суцэльныя святочныя сядміцы).

Асаблівае месца ў жыцці праваслаўнага хрысціяніна займае **індывідуальны пост** непасрэдна пры падрыхтоўцы да таінства Прычасця, які павінен доўжыцца не менш трох сутак (калі па царкоўным календары посту няма).

АБ МАНАСТВЕ І МАНАСТЫРАХ

З першапачатковых часоў існавання хрысціянскай Царквы вернікі намагаліся весці чыстае і святое жыццё, як таго патрабавала Евангелле. Аднак сярод іх знаходзіліся тыя, хто шукаў больш высокага подзвігу. Адны добраахвотна адмаўляліся ад маёмасці і раздавалі яе беднякам, іншыя (па прыкладу Божай Маці, святога Іаана Прадцечы, апосталаў Паўла, Іаана і Іакава) ускладалі на сябе абавязак цноты, праводзячы час у несупыннай малітве, посце, устрыманні і працы. Такія людзі называліся аскетамі, г. зн. падзвіжнікамі.

У III стагоддзі, калі хрысціянства хутка распаўсюджвалася ў свеце, строгасць хрысціянскага жыцця стала паслабляцца. Падзвіжнікі веры пачалі сыходзіць у горы і пустэльні, дзе воддаль ад жыццёвых спакус праводзілі дні ў неабходнай строгасці. Такіх людзей пачалі называць **пустэльнікамі.** Так быў пакладзены пачатак манаству («иночеству»), г. зн. інакшаму, аддаленаму ад свету, спосабу існавання.

Манаства становіцца зместам жыцця для тых, хто мае непераадольнае ўнутранае жаданне цалкам прысвяціць сябе Богу. Той, хто выбірае гэты шлях, павінен памнажаць у сябе сілы духоўнага жыцця, выконваць волю сваіх духоўных настаўнікаў, адмовіцца ад звыклага: сваёй маёмасці і нават ад былога імя.

Не з'яўляючыся самамэтай, манаства ёсць самы дзейсны сродак для набыцця маральнай сілы, для ратавання душы. Адначасова манаства — гэта велічны подзвіг малітоўнага служэння свету. Яно абараняе свет, моліцца за яго, духоўна яго жывіць.

Радзімаю манаства лічыцца Егіпет, а яго заснавальнікам — прападобны Антоній Вялікі (памяць 30 студзеня). Прападобны Антоній быў заснавальнікам **пустэльніцкага манаства.** Кожны такі манах жыве асобна ад іншых у хаціне альбо пячоры, аддаючыся посту, малітве і працы, кіруецца парадамі свайго настаўніка.

Ужо пры жыцці Антонія Вялікага ўзнікла яшчэ адна разнастайнасць манаскага

існавання. Падзвіжнікі збіраліся ў абшчыну, працавалі на агульную карысць, падначальваючыся агульнапрынятаму парадку ці статуту. Такія абшчыны сталі называцца **манастырамі.** Заснавальнікам **супольнажыццёвага манаства** з'яўляецца прападобны Пахомій Вялікі (памяць 28 мая), які жыў таксама ў Егіпце.

З Егіпта манаства хутка распаўсюдзілася ў Азіі, Палесціне і Сірыі, а пасля — у Еўропе. На Русі яно з'явілася амаль адначасова з прыняццем хрысціянства. Заснавальнікамі супольнажыццёвага манаства былі прападобныя Антоній і Феадосій (памяць 15 верасня), якія жылі ў створаным імі Кіева-Пячэрскім манастыры. Буйныя манастыры (некалькі соцень манахаў) пачалі называцца лаўрамі. На Русі акрамя Кіева-Пячэрскай лаўры праславіліся Троіца-Сергіева лаўра, Опціна пустынь.

Манаства прымаюць не толькі мужчыны, але і жанчыны, трымаючыся аднолькавых правіл. Жаночыя манастыры існуюць таксама са старажытных часоў.

Той, хто мае намер стаць манахам, найперш павінен прайсці выпрабаванне (паслушніцтва) і тады ўжо даваць непарушны абет.

Манаства аказвае вялікі дабратворны ўплыў на грамадства. Дапамагаючы духоўным патрэбам бліжніх, манахі не адмаўляюцца служыць і зямным патрэбам людзей. Здабываючы сабе неабходнае працай, яны дзеляцца сваім з немаёмнымі. Манастыры даюць прытулак багамольным вандроўнікам, адтуль рассылаецца міласціня вязням, галодным і бядотным.

Аднак галоўная заслуга манахаў перад грамадствам — у іх несупыннай малітве аб Царкве, Айчыне, аб усіх жывых і памерлых. «У манастырах творыцца набажэнства, адпаведнае чыну, поўнае, працяглае,— пісаў свяціцель Феафан Затворнік (памяць 23 студзеня).— Царква праяўляецца тут ва ўсёй прыгажосці свайго аблічча». Сапраўды, у манастыры — невычэрпная крыніца навучання для вернікаў. У сярэднявеччы манастыры мелі вялікае значэнне як цэнтры навук і распаўсюджвальнікі асветы. Аўтарам першага летапісу на Русі («Аповесць мінулых гадоў») быў прападобны Нестар, манах Кіева-Пячэрскай лаўры (памяць 3 лістапада).

Сярод беларускіх манастыроў найперш трэба назваць такую беларускую святыню, як старажытны Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у Полацку, заснаваны ў XII стагоддзі. Там і сёння спачываюць мошчы прападобнай Еўфрасінні (памяць 5 чэрвеня), знакамітай асветніцы, апякункі жаночага манаства на нашай зямлі. Усім вядомы і Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр ля Слоніма, заснаваны ў канцы XV стагоддзя на месцы, дзе была знойдзена цудадзейная ікона Божай Маці (святкаванне 20 мая). Гэта ікона прыцягвае да сябе мноства набожных паломнікаў. У манастыры месціцца цяпер і духоўная семінарыя — навучальная ўстанова для падрыхтоўкі святароў.

І яшчэ неабходна зазначыць: у некаторых мясцінах Беларусі аднаўляюцца былыя манастыры.

АДНОСІНЫ ХРЫСЦІЯНІНА ДА НЯСТАЧЫ, ХВАРОБ І СМЕРЦІ

Многім хрысціянам даводзіцца быць у нястачы, цярпець нягоды. У большасці сапраўдных хрысціян няма вялікіх лішкаў матэрыяльнага набытку — яны непрымальныя для іх. Гасподзь паказвае нам, як, аддаўшыся спакусам, багацей не заўважае Лазара, які пакутуе ў жабрацтве (Лк. 16:19-21). Багацце небяспечнае для людзей, бо «цяжка багацею ўвайсці ў Царства Нябеснае» (Мф. 19:23).

Сёння ходкай стала формула: «час — гэта грошы». Яна ў дастатковай меры выкрывае грахоўнасць тых, хто яе прымае, бо грошы — заўжды толькі сродак, а не каштоўнасць і мэта. Той, хто грошам надае выключнае значэнне,— адмаўляе сапраўдныя мэты і каштоўнасці. Гасподзь папярэджвае: «Не можаце служыць Богу і мамоне*» (Мф. 6:24).

Апостал Павел піша да свайго вучня Цімафея: «Маючы ежу і вопратку, будзем задаволены тым. А хто жадае ўзбагачацца, набываюць спакусу, трапляюць у пастку, у неразумную і шкодную пажаднасць, што нясе людзям бедства і згубу» (1 Цім. 6:8-9). Пра гэта ж пісаў і святы праведны Іаан Кранштацкі: «Калі ўзбагаціць жабракоў, дык многія, многія з іх забудуцца на Бога і дабрадзеяў сваіх, загубяць душы свае ў раскошы. Так згубна багацце і так асляпляе яно вочы сардэчныя. Яно робіць грубым і няўдзячным сэрца».

Вось чаму Гасподзь часцей за ўсё вядзе хрысціяніна тым шляхам, які азначаецца словамі з кнігі Прытчаў Саламонавых: «Жабрацтва і багацця не давай мне, насычай мяне хлебам надзённым. Каб, перасыціўшыся, я не адмовіўся ад Цябе... і каб, збяднеўшы, не пачаў красці і ўпамінаць імя Бога майго без патрэбы» (Пр. 30:8-9).

Адначасова выбраннікам сваім Гасподзь дазваляе часам спазнаць і жабрацтва, каб больш ўзнагародзіць іх за подзвіг цярплівасці.

Разам з усім чалавечым родам хрысціянін падуладны немачы і хваробам. Па сутнасці няшчасце для чалавека ёсць не хвароба цела, а прычына яе — хвароба душы.

«Усе нашы хваробы ёсць пакаранне Божае за грахі; хваробы ачышчаюць, яднаюць нас з Богам і вяртаюць нам любоў Яго»,— адзначае святы праведны Іаан Кранштацкі.

Для вылячэння хваробы патрэбна перш за ўсё пакаянне. Перад тым як ацаліць нядужага, Гасподзь прабачыў яму грахі (Мк. 2:3-12). А калі ён вылечыў ля «авечай купелі» хварэўшага 38 гадоў, то сказаў яму: «Вось ты паправіўся; не грашы болей, каб не здарылася з табою горшага» (Ін. 5:14).

У хваробах нам трэба спадзявацца не толькі на дапамогу зямных дактароў, але на літасць Божую і для гэтага — шчыра каяцца ў сваіх грахах, шукаць выратавання ў таінствах Споведзі, Прычасця і Саборавання, жыць па запаведзях Гасподніх. Будзем памятаць: доктар лечыць, а Бог ратуе.

Гасподзь пасылае нам і працяглыя перадсмяротныя хваробы. Гэта апошні сродак для ратавання душы. Ён хоча, каб у гэты час душа задумалася над жыццём, усвядоміла сваю нечысціню, жахнулася сваёй нікчэмнасці, успомніла ўдзячна пра Бога і з пакаяннем і надзеяй на Яго літасць скіравала б да Яго сваё сэрца.

---

* **Мамона** — бажаства багацця.

Наадварот, нечаканая смерць без хваробы, без магчымасці падрыхтоўкі да яе пакаяннем лічыцца неспрыяльнай умовай. Вернікі загадзя павінны рыхтаваць сябе духоўна да няўхільнасці заканчэння зямнога жыцця. Таму ў царкве і моляцца аб дараванні нам «христианской кончины живота нашего», аб мажлівасці падрыхтоўкі да смерці, Пакаяння і Прычасця перад ёй.

Між тым назіраецца адваротнае. «У большасці выпадкаў намагаюцца зняверыць хворага ў небяспецы, хаця самі разумеюць, што хворы безнадзейны. Зразумела, што такая крывадушнасць ля ложка хворага, як бы не апраўдвалася, акрамя маральнай шкоды нічога не можа яму прынесці, а часта і саміх крывадушных, у выпадку паскарэння смерці хворага без патрэбнага хрысціянскага наказу, вельмі засмучае». Так справядліва пісаў свяціцель Феафан Затворнік.

Калі жадаюць палегчыць перадсмяротныя пакуты хворага — больш за яго моляцца. І што б ні прасілі ў малітвах, трэба завяршаць сваю просьбу так, як закончыў сваю малітву ў Гефсіманскім садзе Хрыстос, ведаючы пра блізкую смерць на крыжы: «Урэшце не як Я хачу, а як Ты» (Мф. 26:39).

Можа паўстаць пытанне: нястачы, пакуты, сама смерць — ці не залішне дарагая «плата за ўваход»? Аднак узнагарода ўдастоеных Царства Нябеснага перабольшвае ўсялякае ўяўленне. Пра гэта піша апостал Павел: «Не бачыла таго вока, не чула вуха, і не прыходзіла тое на сэрца чалавеку, што падрыхтаваў Бог маючым ласку Яго» (1 Кар. 2:9). Увайсці ў Царства Нябеснае мажліва толькі праз Яго і па Яго найвялікшай літасці да нас, грэшнікаў.

«Госпадзі! узлюбіў я прыстанне дома Твайго і месца жылля славы Тваёй» (Пс.25:8)

«Хваліце Яго на звонкіх кімвалах, хваліце Яго на кімвалах гучных» (Пс.150:5)

«Святары Твае ахінуцца праўдаю, і святыя Твае ўзрадуюцца» (Пс.131:9)

Споведзь

Прычасце

«...вы маеце памазанне ад Святога...» (1 Ін.2:20)

«...што Бог злучыў, таго чалавек хай не разлучае» (Мф.19:6)



Пропаведзь

Крыж — захавальнік сусвету

«Госпадзі! звяртаюся да Цябе: паспяшайся да мяне, слухай голас малення майго...»
(Пс. 140:1)

МАЛІТВЫ

Бог любіць Сваё тварэнне — кожнага з нас, ён — наш Нябесны Айцец. Як дзецям уласціва жаданне бачыць сваіх бацькоў і гутарыць з імі, так і нам павінна быць уласціва радасць ад духоўных зносін з Богам.
Поўная ўшанавання гаворка чалавека з Богам і называецца малітваю. Адначасова душа чалавечая, яднаючыся ў малітве з Богам, уваходзіць у духоўны свет Ангелаў і праведнікаў. Паводле слоў святога Іаана Кранштацкага, «малітва ёсць залатая сувязь чалавека-хрысціяніна, падарожніка і прышэльца на зямлі, са светам духоўным, якога ён жылец, і перш за ўсё з Богам — пачаткам жыцця». Так, малітва — даверлівая, ачышчальная размова душы з Госпадам Богам, у якой мы набываем духоўны мацунак веры. Малітва — аснова духоўнага жыцця хрысціяніна.
Звычайна, выказваючы малітву словамі, мы хрысцімся, робім паклоны, прыпадаем на калені — выказваем знешнімі знакамі глыбокую пашану да нашага Усявышняга Суразмоўцы. Аднак малітва можа ўзносіцца і без слоў, без знешніх праяў. Гэта — унутраная паглыбленая малітва, якая вядома многім набожным людзям.

РОЗНАСЦЬ МАЛІТВАЎ

У малітве хрысціянін раскрывае перад Богам усю сваю душу: услаўляе Бога за Яго неабсяжныя дасканаласці, дзячыць за міласці і дабрадзействы, звяртаецца за дапамогай. Адсюль вынікаюць тры галоўныя разнастайнасці (віды) малітваў: славаслоўе, падзяка і прашэнне.

Славаслоўе — самы дасканалы і бескарыслівы від малітвы. Чыстыя і беззаганныя асобы ярчэй успрымаюць неабдымныя дасканаласці Божыя, славячы іх у шчырай малітве. Несупыннай хвалою услаўляюць Госпада Ангелы на нябёсах. Па словах свяціцеля Феафана Затворніка, «славаслоўе не ёсць халоднае сузіранне якасцей Божых, а жывое адчуванне іх з радасцю і ўзрушэннем».

Падзяка пасылаецца чалавекам за атрыманыя дабрадзействы Божыя. Яна нязмушана ўзнікае ва ўдзячнай і чуйнай душы. Як сведчыць апостал і евангеліст Лука, з дзесяці пракажоных, аздароўленых Збавіцелем, толькі адзін самаранін вярнуўся, каб падзячыць Яму.

Прашэнне, выкліканае ўсведамленнем намі сваёй нямогласці, недасканаласці, з'яўляецца найбольш распаўсюджаным відам малітвы. З прычыны грахоў і страсцей душа наша хворая і слабая. Таму і неабходна прасіць у Бога адпушчэння грахоў

і дапамогі ў пераадоленні заганаў. Часта малітоўнае прашэнне выказваецца, калі наблізілася небяспека, нястача, гора. «Прасіце, і дадзена будзе вам»,— гаворыць Гасподзь (Мф. 7:7). Калі ж у нашых малітвах амаль не гучаць словы хвалы і ўдзячнасці, гэта сведчыць аб невысокім узроўні духоўнага развіцця.

Розныя віды малітваў часта спалучаюцца. Чалавек просіць Бога дапамагчы ў патрэбах і разам з тым услаўляе веліч Яго і благасць, дзячыць Яго за тое, што можа смела звяртацца да Яго як да свайго міласэрнага Айца. Самыя ўрачыстыя царкоўныя хваласпевы пераходзяць часам у замілавальныя прашэнні, а маленні аб дапамозе ператвараюцца ў велічнае песнапенне падзякі і хвалы.

ЯК ТРЭБА МАЛІЦЦА

Пачынаючы маліцца, чалавек павінен вызваліцца ад звычных турбот і заняткаў, сабраць свае рассеяныя думкі, як бы зачыніць дзверы душы для ўсяго зямнога і звычайнага, накіраваць усю сваю ўвагу да Бога. Па словах свяціцеля Ігнацiя Бранчанінава, «падрыхтоўкай да малітвы слугуюць: неперасычанасць ежаю, адсячэнне дробязных клопатаў мечам веры, дараванне ад шчырага сэрца ўсіх крыўд, падзяка Богу за ўсе смутныя выпадкі жыцця, вызваленне ад рассеянасці, летуценнасці і багавейнага страху». І ён жа гаворыць: «Усведамленне сваёй грахоўнасці, усведамленне сваёй нямогласці, сваёй нікчэмнасці — неабходная ўмова для таго, каб малітва была літасціва прынятая і пачутая Богам».

Павучальны прыклад шчырага малельца мы маем у асобе мытніка*, апраўданага Богам за сваю пакорлівасць.

Пакорлівасць хрысціяніна не нараджае тугі і безнадзейнасці, наадварот, яна спалучаецца з цвёрдай вераю ў благасць і ўсемагутнасць Айца Нябеснага. Толькі малітва веры можа быць пачутая Богам: «Усё, чаго ні будзеце прасіць у малітве, верце, што атрымаеце,— і будзе вам» (Мк. 11:24).

Гасподзь толькі тады прымае нашу малітву, калі мы адрынулі ўсякую злобу і варажнечу, прабачылі крыўду і прымірыліся з усімі. «Калі стаіце на малітве, прабачце, калі што маеце на каго, каб і Айцец ваш Нябесны прабачыў вам грахі вашы. Калі ж не прабачыце, дык і Айцец ваш Нябесны не прабачыць вам грахоў вашых» (Мк. 11:25-26).

ШТО ПРОСІМ У МАЛІТВАХ

Прападобны Ісаак Сірын піша пра тое, што трэба прасіць у Бога: «Не будзь безразважны ў просьбах тваіх, каб не ўгневаць Бога тваёй неразумнасцю. Але будзь мудры, каб атрымаць слаўных дароў. Прасі шматкаштоўнае ў Таго, Хто не мае скупасці, і атрымаеш ад Яго шматкаштоўнае адпаведна разумнаму пажаданню твайму. Саламон прасіў мудрасці, а з ёю атрымаў і зямное царства, бо разумна прасіў у Вялікага Цара. Елісей прасіў большай благадаці ў параўнанні з тою, што

---

* **Мытнік** — зборшчык падаткаў.

меў яго настаўнік, і прашэнне яго было задаволена. Хто просіць нікчэмнага ў Цара, славу Яго прыніжае».

Найвялікшым вучыцелем малітвы з'яўляецца наш Збавіцель, малітва была ратавальнай спадарожніцай Яго жыцця. Гасподзь маліўся, прымаючы хрышчэнне ад Іаана, правёў у малітве ўсю ноч перад выбраннем апосталаў, маліўся ў час Праабражэння, маліўся ў Гефсіманскім садзе перад арыштам, маліўся перад крыжоваю смерцю. Самыя апошнія, перадсмяротныя словы ўкрыжаванага Госпада — словы малітвы: «Ойча! У рукі Твае аддаю дух Мой» (Лк. 23:46).

«ОЙЧА НАШ...»

Пад уражаннем вобраза Хрыста, Які натхнёна і шчыра маліўся, адзін з вучняў звярнуўся да Яго з просьбаю: «Госпадзі, навучы нас маліцца». У адказ Ісус Хрыстос даў малітву, кароткую ў словах, але выключна багатую зместам, тую дзівосную і непараўнальную малітву, якая і сёння ратуе нас, яднаючы з Богам. Малітва гэтая называецца «Ойча наш» ці «Малітва Гасподняя».

Ойча наш, Ойча Нябесны!
Хай славіцца імя Тваё,
хай прыйдзе Царства Тваё,
хай будзе воля Твая
і на зямлі, як на небе.

Хлеб наш надзённы
дай на сённяшні дзень,
і даруй грахі нашы,
як і мы даруем чужыя.

І не ўводзь у спакусу,
але збаў ад ліхога,
бо ёсць Тваё Царства
і сіла, і слава навекі. Амінь.
(Мф. 6:9-13).

Малітва Гасподняя вучыць нас у якім парадку і аб чым трэба маліцца. Звяртаючыся да Бога: «Ойча наш», мы ўсведамляем сябе Яго дзецьмі, а ў адносінах адзін да аднаго — братамі. Таму молімся не толькі за сябе, але і за ўсіх людзей.

«Хай славіцца імя Тваё» — хай будзе імя Тваё святым і ўслаўленым сярод усіх людзей і словамі, і справамі.

«Хай прыйдзе Царства Тваё». Царства Божае пачынаецца ў душы верніка, калі благадаць Божая, пасяляючыся там, ачышчае яго душу, перайначвае ўнутраны свет. Адначасова з гэтым благадаць яднае ўсіх — людзей і Ангелаў — у адну вялікую духоўную сям'ю, названую Царствам Божым альбо Царквою.

Каб дабро разыходзілася сярод людзей, трэба прасіць: «Хай будзе воля Твая і на зямлі, як на небе», г. зн. няхай усё ў свеце адбываецца па ўсеблагай і прамудрай волі Божай, няхай і мы, людзі, таксама ахвотна выканаем волю Божую на зямлі, як выконваюць яе Ангелы на небе.

«Хлеб наш надзённы дай на сённяшні дзень» — дай нам пажытак для мацавання душы і цела: пажытак, неабходны для нашага шчаслівага існавання і высокага прызначэння, пажытак для нашай веры, для выканання Запаведзяў Гасподніх; дай нам пажытак і для падтрымання фізічнага стану; дай нам усё гэта на сёння, бо пажытак на заўтра для набыткаў маёмасных і ў запас — ён грахоўны.

«І даруй грахі нашы, як і мы даруем чужыя». Кожны чалавек грэшны перад Богам і людзьмі, бо не робіць патрэбнае. Гэтае прашэнне ў малітве з асаблівай сілаю пераконвае нас у неабходнасці прабачыць нашым бліжнім усе крыўды. Бо, не прабачыўшы іншым, мы не можам прасіць аб прабачэнні Богам нашых грахоў.

«І не ўводзь у спакусу», г. зн. не спакушай выпрабаванне нашых маральных сіл шляхам нашага грахоўнага ўчынку.

«Але збаў ад ліхога» — ад усялякага зла і яго віноўніка — дыявала, каварнага і лжывага.

Малітва завяршаецца ўпэўненасцю ў выкананне прасімага, бо Богу належыць на гэтым свеце бясконцая ўсемагутнасць, вечнае Царства і слава.

Такім чынам, малітва Гасподняя, спалучаючы ў сабе ўсё, аб чым трэба маліцца, вучыць нашы патрэбы ставіць у належным парадку: спачатку прасіць аб вышэйшым дабры — аб славе Божай, аб распаўсюджванні дабра сярод людзей, аб ратаванні душы, а пасля ўжо — аб звычайных патрэбах. Акрамя таго, мы павінны цалкам перадаваць сябе ў валоданне волі Божай.

Прыклад такой малітвы пакінуў нам Гасподзь Ісус Хрыстос, молячыся ў Гефсіманскім садзе перад крыжовымі мукамі: «Ойча Мой! Хай міне гэта чаша Мяне. Але воля Твая» (Мф. 26:39).

ЧАС ДЛЯ МАЛІТВЫ

Апостал Павел вучыць нас: «Несупынна маліцеся» (1 Фес. 5:17). Неабходна маліцца ў тыя святыя, высокія моманты жыцця, калі душа перажывае Наведванне з нябёсаў, імкнецца да Яго і адчувае патрэбу ў малітве. Але трэба маліцца і ва ўсе прызначаныя для малітвы гадзіны, няхай сабе мы і не схільны ў той момант маліцца. Каб душа захавала здатнасць да малітвы, неабходна заахвочваць сябе да малення, паставіць за мэту маліцца ўвесь час, незалежна ад нашых памкненняў.

У праваслаўных прынята маліцца штодзённа ўранку, устаўшы ад сну, і ўвечары перад сном. Малітваю належыць пачынаць і завяршаць усякую добрую справу. Малітвай агульнаю мы молімся ў храме. У гэтых стасунках «малітваслоў» (зборнік малітваў) для праваслаўнага хрысціяніна неабходны спадарожнік у жыцці.

ПЛАДЫ МАЛІТВЫ

Малітва аздабляе ніву нашай душы і робіць яе прыдатнай да атрымання нябесных дарункаў, шчодрых духоўных пладоў. Малітва прыносіць нам благадаць Святога Духа, мацуе нашу веру, надзею і любоў, даруе асвету нашаму розуму, рыхтуе нас да выканання дабра, суцяшае сэрца ў скрусе і нягодах — дае нам усё, што служыць дабру і блажэнству. Паводле вучэння святых айцоў Царквы, малітва — «дыханне душы», вяршыня духоўных хрысціянскіх набыткаў.

КАРОТКІЯ МАЛІТВЫ

У імя Айца,
і Сына,
і Святога Духа. Амінь.

«У імя» — імем, у гонар, у славу.
«Амінь» — сапраўды так.
Гэтая малітва называецца начальнаю, бо мы вымаўляем яе раніцаю, устаўшы пасля сну, перад чытаннем іншых малітваў.

У ёй мы просім Прасвятую Троіцу благаславіць нас на будучую справу дзеля добрых пладоў.

Госпадзі, благаславі!

Гэта малітва перад пачаткам кожнай Богаўгоднай справы.

Госпадзі, памілуй!

«Памілуй» — будзь міласцівы, прабач.
Малітву вымаўляем, калі ўспамінаем нашы грахі і шчыра каемся ў іх.

Слава Табе, Божа наш, слава Табе.

Малітва вымаўляецца пасля заканчэння справы ў знак удзячнасці Богу за Яго міласць да нас, у знак выключнай пашаны да Яго.

Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, памілуй нас.

«Богам» мы называем першую Асобу Святой Троіцы — Бога Айца; «Моцным» — Бога Сына; «Несмяротным» — Духа Святога.

Малітва чытаецца тры разы ва ўслаўленне Трох Асоб Святой Троіцы і называецца «**Трысвятое**».

Слава Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер і заўжды, і на векі вякоў. Амінь.

У малітве мы нічога не просім у Бога, а толькі славім Яго ў Трох Асобах Святой Троіцы.

Найсвяцейшая Багародзіца, ратуй нас!

Мы просім Божую Маці, каб Яна Сваімі святымі малітвамі перад Сынам Сваім і нашым Богам ратавала нас грэшных.

МАЛІТВА ДА ПРАСВЯТОЙ ТРОІЦЫ

Прасвятая Троіца, памілуй нас; Госпадзі, даруй нам грахі нашы; Уладыка, прабач беззаконні нашы; Святы, прыйдзі, ацалі нашы немачы, дзеля імя Твайго.

Мы просім Святую Троіцу («Госпадзі» — Ойча; «Уладыка» — Сын Божы; «Святы» — Дух Святы) прабачыць грахі нашы, беззаконні нашы і ацаліць ад духоўных і фізічных нямогласцей.

МАЛІТВА ЗА ЖЫВЫХ

Ратуй, Госпадзі, і памілуй айца майго духоўнага (імя яго), бацькоў маіх (імёны іх), родных, настаўнікаў і дабрадзеяў, і ўсіх праваслаўных хрысціян.

«Айца духоўнага» — святара, у якога мы спавядаемся.

МАЛІТВА ЗА ПАМЕРЛЫХ

Супакой, Госпадзі, душы спачылых рабоў Тваіх (імёны бацькоў) і ўсіх спачылых родных і благачыннікаў маіх, і прабач грахі іх свядомыя і несвядомыя, і даруй ім Царства Нябеснае.

«Супакой» — змясці разам са святымі ўгоднікамі ў векавечным блажэнным (шчаслівым) жытле.

«Царства Нябеснае» — векавечнае блажэннае жыццё з Богам.

МАЛІТВЫ ПЕРАД ЯДОЙ

Благаслаўёны Ты, Госпадзі. Насычаеш нас хлебам жыцця.

«Благаславёны» — услаўлены.

На Цябе спадзяванне, Госпадзі. Ты насычаеш ежай. Шчодрае благаваленне Тваё.

«Благаваленне» — добрая воля і міласць.

«Ойча наш...»

МАЛІТВЫ ПАСЛЯ ЯДЫ

Дзякуй, Госпадзі. Ты насыціў нас хлебам зямным. Насычай нас Хлебам Духоўным.

Дзякуй, Госпадзі. Ты насыціў нас дарам зямным. Не пазбаў і Царства Нябеснага.

МАЛІТВЫ РАНІШНІЯ

У імя Айца,
і Сына,
і Святога Духа. Амінь.

Божа, будзь міласны да мяне, грэшніка.

Гэта малітва мытніка, які шчыра раскаяўся ў сваіх грахах, вырашыў ніколі не грашыць і атрымаў прабачэнне і ўхвалу Госпада (Лк. 18:13).

Да Цябе, Чалавекалюбны Уладыка, звяртаюся ў шчырай малітве:
памажы мне ў справах маіх, збаў ад марнасці і грахоўных спакус, адкрый Векавечнага Царства шляхі.
Ты — мацунак надзеі, апірышча веры, крыніца любові.
Хай узносіцца слава Твая, хай здзяйсняецца воля Твая і цяпер, і заўжды, і на векі вякоў. Амінь.

Трысвятое...

«Ойча наш...»

МАЛІТВЫ ПЕРАД СНОМ

**У імя Айца,
і Сына,
і Святога Духа. Амінь.**

Госпадзі Божа наш, Міласцівы і Чалавекалюбны, калі саграшыў я справаю, словам ці намыслам, прабач мне.

Ты — апякун нашых душ і цела. Падай ціхамірны сон. Пашлі Ангела — засцярогу ад зла.

Мы ўзносім славу Табе — Айцу, і Сыну, і Святому Духу — цяпер і заўжды, і на векі вякоў. Амінь.

Трысвятое...

«Ойча наш...»

МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ

Магутны Божа

(Беларускі рэлігійны гімн)

Наталля Арсеннева

Магутны Божа, Уладар сусветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых,
Над Беларусяй, ціхай і ветлай,
Рассып праменні Свае хвалы.

Дай спор у працы, штодзённай, шэрай,
На лусту хлеба, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласць — дай.

Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
Краіну нашу і наш народ!

«Да цябе, Госпадзі, узношу душу маю» (Пс.24:1)

«Госпадзі, памілуй мяне і пачуй малітву маю» (Пс.4:2)

«Судзі мяне, Госпадзі, паводле праўды маёй і паводле беззаганнасці ўва мне» (Пс.7:9)

«Хай пачуе цябе Гасподзь у дзень смутку, хай абароніць цябе імя Бога Іакаўлева» (Пс.19:2)

«Госпадзі, Божа наш! Як велічна імя Тваё па ўсёй зямлі!» (Пс.8:10)

«Вось, земляроб чакае каштоўнага плода зямлі
і дзеля яго церпіць доўга, пакуль атрымае дождж ранні і позні.
Доўгацярпіце і вы, умацуйце сэрцы вашыя,
бо прышэсце Гасподняе блізіцца»
(Іак. 5:7-8)

НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Светапогляд, вопыт жыццёвых назіранняў, традыцыі, таленавітае, добразычлівае слова... Гэты набытак народнай спадчыны складае змест «Народнага календара». І сёння пачэсны абавязак сумленнага беларуса — аднавіць, захаваць тыя культурныя і духоўныя каштоўнасці, што па нашай віне пачалі адыходзіць у нябыт. Вядома, адрадзіць страчанае немагчыма без сучаснага асэнсавання спадчыны. Даты «Народнага календара» дадзены паводле новага стылю на 1999 год.

Каляды

7—19 студзеня

Каляды (ад лац. «*calendae*», што азначае першы дзень кожнага месяца, ці ад слова «кола») — зімовае свята. Асноўны духоўны сэнс яго — выратавальная падзея Нараджэння Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста — дапаўняецца ладам жыцця беларуса, яго побытам, аграрнымі вымогамі. У гадавым каляндарным коле свята атаясамліваецца з зімовым сонцастаяннем, паваротам часу на лета. Са старажытных часоў дбайнаму гаспадару Каляды нясуць добрыя спадзяванні на ўраджай, на лепшае жыццё.

На працягу ўсіх Каляд з дня ў дзень паўтараюцца народныя абрады, звычаі, забавы, гульні і нават варажба. Бясспрэчна, шмат непрымальнага тут для адукаванага чалавека, для хрысціяніна. Святая Царква не супраць забаў, народных традыцый. Аднак яны не павінны парушаць чысціні думак і пачуццяў, не павінны быць непрыстойнымі для слыху і для вачэй, не павінны прыніжаць чалавечай годнасці. Не разгул і гучныя свецкія забавы робяць свята Хрыстова прыемным і радасным для нас, а суцяшальная слодыч Божай ласкі, што даруецца толькі тым, хто ўхіляецца ад усяго, чым зневажаецца любоў Божая, чым абражаецца святое імя Хрыста, чым парушаецца святасць вялікай падзеі Нараджэння Госпада.

З даўніх часоў у славян існавалі звычаі пераапранацца, рыхтаваць маскі, вадзіць карагоды, паліць вогнішчы, варажыць і інш. З распаўсюджаннем хрысціянства гэтыя язычніцкія абрады былі пераасэнсаваны, яны перайначыліся, утварыліся новыя, на хрысціянскай аснове. Каляды — гэта пераважна «святыя дні». Таго, што не адпавядае іх святасці,— не павінна быць! У канцы XVII стагоддзя патрыярх Іаакім, апісваючы маскоўскія Святкі, абураецца тым, што «мужіе съ женамі і девками ходять по улицамъ и къ бесовскимъ песнямъ многія сквернословія присово-

купляютъ, и плясанія творять на разженіе блудныхъ нечистотъ, преобразующееся въ неподобныя отъ Бога созданія, образъ человеческій применяюще, православныхъ христіанъ прельщаютъ». Што тычыцца варажбы, дык да яе наша Царква ставіцца вельмі адмоўна і рашуча забараняе. У 61-ым правіле Шостага Усяленскага Сабора гаворыцца: «Предающіеся волшебникамъ, или другимъ подобнымъ, дабы узнати отъ нихъ, что восхотятъ имъ открыти, согласно съ прежними отеческими о нихъ постановленіями, да подлежатъ правилу шестилетней епитиміи*. Той же епитиміи надлежитъ подвергати и техъ, кои произносятъ гаданія о счастіи, о судьбе, а равно и такъ именуемыхъ, обаятелей, делателей предохранительныхъ талисмановъ и колдуновъ...». Сучасная святочная варажба хоць і пачынаецца іншы раз жартам, але завяршаецца вялікай шкодаю для душы. Бог утоіў ад нас будучае. Хто безразважна намагаецца адкрыць заслону будучага варажбою, той ідзе супраць Бога, той верыць не ў сілу Божую, а ў ерась. Сапраўдны хрысціянін павінен памятаць, што толькі ў надзеі на Бога, у глыбокай адданасці і пакоры Яго святой волі — наша суцяшэнне, наша моц і наша шчасце і што варажба аддаляе ад нас міласэрнасць і дапамогу Божую. Занятак ёю ў святыя дні ўслаўлення народжанага Збавіцеля ёсць акрамя ўсяго зневажанне святасці гэтых дзён.

Першая Куцця (Посная, Бедная)

6 студзеня

Паводле намеру Святой Царквы пярэдадзень Ражаства Хрыстовага ёсць дзень завяршальнай падрыхтоўкі і сустрэчы вялікага свята ўсіх хрысціян. Сярод набожных беларусаў існуе звычай рыхтавацца да яго працяглым постам, які мае народную назву «Піліпаўка» і пачынаецца 28 лістапада адразу пасля дня памяці апостала Філіпа. Перад святам наводзіцца парадак, усё мыецца, прыбіраецца, назапашваюцца прадукты харчавання. Царква заклікае завяршыць саракадзённы Калядны пост найбольш строгім устрыманнем. Толькі ўвечары, пасля заканчэння службы, дазваляецца распачынаць вячэру каштаваннем «куцці» з мёдам — слодычы духоўных дароў.

Святкаванне пачынаецца 6 студзеня са з'яўленнем на небе першай зоркі. Вячэра гатуецца без жывёльнага тлушчу і складаецца з трох ці больш страў: квасу з грыбамі, бліноў з макам ці мёдам, кісялю і абавязкова куцці — кашы з ячменю. У многіх мясцінах вячэра ладзіцца наступным чынам. Стол накрываецца абрусам, пад які падсцілаецца сена. Запальваецца свечка ці лампадка, чытаюцца малітвы. Гаспадар сядае на покуці, за ім — па старшынству яго сыны, а на другі бок стала — гаспадыня і астатнія дзеці. Зачарпнуўшы першую лыжку куцці, гаспадар стукае ў сцяну і просіць, каб мароз «не марозіў ячменю, пшаніцы, гароху і ўсяго, што Бог судзіць пасеяць». Такое ж пажаданне выказвае і гаспадыня, пералічваючы гародніну. Пасля таго як усе каштуюць кожную страву, вячэра завяршаецца зноў куццёй і малітваю. Раніцай калядным сенам кормяць карову, авечак, што павінна быццам бы засцерагчы жывёлу ад немачы.

Каштаванне пералічаных на вячэры страў сімвалічна адлюстроўвае нараджэнне

---

* **Епітым'я** — пакаранне.

7 Зак. 2210

і смерць Ісуса Хрыста (узвар гатуецца звычайна з нагоды нараджэння немаўляці; куцця бывае на пахаванні). Сенам напамінаецца месца нараджэння Дзіцяткі і яслі, у якія Яно было пакладзена пасля нараджэння.

У гэты дзень трымаюцца і забарон. Напрыклад, не сварацца, не працуюць.

Калядны Мясаед

7 студзеня

З 7 студзеня дазваляецца ўжываць скаромнае, есці мяса. Свята набывае асаблівую разнастайнасць і ўрачыстасць. Расказваюцца казкі, легенды, адгадваюцца загадкі, ладзяцца ігрышчы. У залежнасці ад мясцовай традыцыі гуляюць у «Яшчура», у жартоўную шлюбную гульню «Жаніцьба Цярэшкі», ладзяць батлейку (народны лялечны тэатр). З гэтага дня калядоўшчыкі ходзяць па вуліцах і хатах пераапранутыя ў цыганоў, водзяць «казу», «мядзведзя», «жорава», носяць «звязду», спяваюць духоўныя і калядныя песні, скачуць пад скрыпку, дуду і бубен. Абавязкова спяваюцца песні ў гонар Ражаства Хрыстовага і велічальныя песні гаспадарам, іх дзецям з самымі шчодрымі пажаданнямі.

Звычай калядавання таксама бярэ свой пачатак з дахрысціянскіх часоў. Працягваецца ён у некаторых мясцінах Беларусі да заканчэння Калядаў. З цягам часу калядаванне страціла свой язычніцкі характар і набыло хрысціянскі сэнс. Абаронцы праваслаўя надавалі асаблівае значэнне духоўным песням у гонар надзвычайнай падзеі Нараджэння Гасподняга. Парадак калядавання вызначаўся царкоўнымі брацтвамі. Гэта спрыяла шырокаму распаўсюджанню звычая. Выхаванцы нашых духоўнанавучальных устаноў мелі рукапісныя зборнікі калядных песень і спявалі іх у свята Ражаства Хрыстовага. Цяпер калядаванне ў большасці выпадкаў страціла свой рэлігійна-царкоўны характар і ўтрымлівае шмат непрыстойнага і абразлівага для хрысціянскага пачуцця. Услед за песняю рэлігійнага зместу можна пачуць блюзнерскія каламбуры і непрыстойныя мірскія песні, і самі песні з услаўленнем Ражаства Хрыстовага маюць грубыя скажэнні.

Звычай насіць «звязду», ладзіць батлейку вымагае ад калядоўшчыкаў умення іх майстраваць. «Звязду» робяць з выкарыстаннем прамасленай паперы: на адным баку выява Багадзіцы, а на другім — пакланенне Яму пастухоў альбо вешчуноў. «Звязду» ўносяць на падворак ці ў хату, спяваючы калядныя песні. Батлейка — мініяцюрны, пераважна двухпавярховы тэатр са шпянькамі лялькамі, прызначэнне якога — паказаць у дзеянні і персанажах гісторыю Нараджэння Хрыстовага, забойства віфлеемскіх дзяцей. Аднак у гэтых прадстаўленнях шмат сумесі біблейскага з вульгарным. Зразумела, святар той царквы, у прыходзе якога адбываецца калядаванне, павінен дапамагчы зрабіць яго высакародным, каб яно на самой справе служыла ўслаўленню Хрыста і зрабілася сапраўдным песенным віншаваннем у гонар вялікага хрысціянскага свята.

Другая Куцця (Мясная, Багатая, Скаромная)
Шчодры вечар (Святы вечар, Шчадруха, Шчодрык)
Новы год паводле старога стылю
13 студзеня

Вечар напярэдадні Новага года паводле старога стылю звязаны ў народзе з думкай пра адраджэнне Сонца, якое прыносіць лета і ўраджай. Рыхтуецца абрадавая вячэра, і вызначаецца яна багаццем і разнастайнасцю скаромных страў. Таму перадпавагодні вечар ды сама вячэра маюць адпаведную назву.

Пасля таго як за сталом збярэцца ўся сям'я, гожа запаляць свечку на покуці і памоляцца, гаспадар пытае ў сваёй жонкі:

— А ці бачыш ты мяне?

— Не бачу,— адказвае звонка жанчына.

— Каб белага свету не бачыла ты за гуркамі, капустаю, морквай, ды за гарбузамі ўлетку на шчодрым гародзе!

— А ці бачыш ты мяне? — пытаецца цяпер гаспадыня.

— Не бачу,— адказвае муж па старой завядзёнцы.

— Каб жа ты свету белага не бачыў за скірдамі, за снапамі, за копамі ўлетку!

У гэты дзень пачынаюць «шчадраваць» дзяўчаты. На ролю «шчодрай» выбіраецца гожая дзяўчына, якую апранаюць у святочнае адзенне, надзяюць папяровы вянок з рознакаляровымі стужкамі. Пяюць песні-«шчадроўкі» пад вокнамі і ў хатах, славяць гаспадароў. Са Шчодрым вечарам звязаны некаторыя забароны, павер'і і варажба пра лёс моладзі.

Звычай сустракаць і праводзіць першы дзень Новага года шумлівымі гулянкамі, вясёлымі забавамі ўзнік у старажытных рымлян-язычнікаў. Лічылася: хто весела сустрэне Новы год, той на працягу цэлага года будзе жыць весела і бесклапотна. Быць п'яным у гэты дзень пажадана было кожнаму. Мужчыны і жанчыны пераапраналіся ў незвычайнае адзенне, прыпадабняліся да розных жывёл і сваіх язычніцкіх багоў, хадзілі з песнямі, крыкам, скокамі з дома ў дом. Чараўнікі і прадказальнікі апантана варажылі на будучыню. І гэта працягвалася ўсю ноч. З раніцы віншавалі адзін аднаго, разносілі падарункі, выказвалі пажаданні.

Міжвольна ўспамінаюцца павучанні святога Іаана Златавуста з яго Слова на Новы год: «Калі ты ўбачыш канец года, дык будзь удзячны Уладыку, што Ён увеў цябе ў такі кругазварот гадоў, засмуціся сэрцам, задумайся над мінулым, скажы самому сабе: дні цякуць і мінаюць, гады сканчаюцца... а што зрабілі мы добрага?».

Сапраўды, дзіўна і недаравальна хрысціяніну чакаць надзвычайных багаццяў ад таго, як ён сустрэў Новы год, забыўшыся на тое, што сапраўднае шчасце залежыць не ад імклівасці часу, але ад волі Божай і ад праведнасці нашага жыцця. Святая Царква схіляе нас да чыстасардэчнага раскаяння ў грахах і цвёрдага намеру пазбягаць зла, вучыць, што даброты жыцця залежаць ад Бога і належаць тым, хто спяшаецца рабіць добрыя ўчынкі, г. зн. сапраўдным хрысціянам.

Толькі сапраўдны хрысціянін і можа ўсцешыцца спакойным, чыстым сумленнем — найкаштоўнейшым з усіх скарбаў; толькі ён можа ў непахісным спадзяванні на Бога пераносіць усе бедствы і спакусы; толькі ён можа правільна карыстацца багаццямі свету для славы Божай, для ратавання душы сваёй і тварэння дабра людзям; толькі ён можа быць задаволены сваім лёсам, які ніспаслаў яму Гасподзь. У

гэтым і ёсць сутнасць шчасця на зямлі. Такога шчасця і неабходна жадаць з надыходам Новага года і сабе, і бліжняму. Толькі яго трэба гарачымі малітвамі прасіць у Госпада.

Васілле (Васілей)

14 студзеня

У першы дзень Новага года паводле старога стылю наша Царква адзначае дзень памяці архіепіскапа Васілія Вялікага. Палымнеючы хрысціянскай любоўю да бліжняга, Васілій быў гатовы цярпець нягоды і ахвяраваць усім дзеля чалавека, трываць усё дзеля ісціны Хрыстовай. За свае заслугі перад Царквою і незвычайнае высокамаральнае і падзвіжніцкае жыццё свяціцель Васілій названы «Вялікім». Таму і народнае свята мае адпаведную назву — Васілле.

У народным павер'і першы дзень года, праведзены прыстойна, гарантуе ўдачу на ўвесь год. Існуюць і прыкметы: калі снег на Новы год падае з самага ранку, то і ўся зіма прадбачыцца снежная; калі вецер дзьме з усходу — можна чакаць гарачага і сухога лета; калі з поўдня — умеранага; заходні вецер абяцае мокрае лета; паўночны — халоднае, з градам. На Васілле малымі дзецьмі выконваецца абрад засявання: рассыпаюць у хаце жыта, віншуюць з Новым годам.

Трэцяя Куцця (Апошняя, Галодная, Вадапосная)

18 студзеня

У пярэдадзень Хрышчэння Гасподняга (Вадохрышча) у Царкве ўспамінаецца з абодвух Запаветаў Святога Пісання ўсё, што тычыцца старазапаветных правобразаў і прароцтваў аб Хрышчэнні, аб самой падзеі Хрышчэння і яе пладах. У храмах адбываецца водаасвячэнне. На гэты прысвятак таксама каштуецца адваранае зерне ці «куцця» з мёдам. Вытрымліваецца строгі пост.

Вадохрышча

19 студзеня

Вадохрышчам завяршаюцца Калядныя святкаванні. Абноўленыя духоўна падзеяй Хрышчэння Гасподняга, мы набываем надзею і спадзяванне на міласэрнасць Гасподнюю, на працяг нашага дабрадатнага, праведнага існавання. Пасля Літургіі адбываецца асноўны абрад святкавання — хрэсны ход і вялікае водаасвячэнне на рэках ці іншых вадасховішчах. Наша Царква, святкуючы Хрышчэнне Гасподняе, мацуе нашу веру ў Святую Троіцу Адзінаісную і Непадзельную — Айца, Сына, і Святога Духа — абуджае пачуццё любові і вялікай удзячнасці да Госпада, запаведуе нам ачышчэнне душ і сэрцаў.

Грамніцы

15 лютага

У народзе лічыцца, што гэта дзень сустрэчы зімы з летам, што ўжо пачынаецца прадвесне і трэба рыхтавацца да вясновых работ. На Грамніцы спяваюць першую песню-вяснянку:

Зіма з летам
сустракалася,
Пра здароўейка
пыталася...

Вядома і прымаўка: «Як прыйдуць Грамніцы — скідай рукавіцы».

Існуе ў народзе звычай асвячаць у царкве свечкі, захоўваць і карыстацца імі ўвесь год з вераю ў ачышчальную сілу агню. З грамнічнай свечкай сустракаюць нованароджанага, яе ўжываюць у вясельных абрадах, кладуць у рукі нябожчыку. Свечка выкарыстоўваецца пры першым выгане жывёлы на пашу і першай яе сустрэчы з пашы, пры засеўках і ў час жніва. Але ці не галоўным прызначэннем грамнічных свечак з'яўляецца ахова дома, у якім яны знаходзяцца. Калі пачынаецца навальніца, сяляне іх запальваюць з вераю ў дапамогу, каб маланка не спаліла хату. Запаленая свечка быццам бы зберагае і ад іншых нябесных стыхій (засухі, вынішчальных дажджоў і граду).

Узнікненне гэтага звычаю адносіцца да часоў Уніі і тлумачыцца ўплывам каталіцкай царквы, дзе штогод у дзень Ачышчэння Прасвятой Дзевы Марыі (так называюць каталікі свята Стрэчання) на Літургіі адбываецца асвячэнне свечак.

Свята Грамніцы звязана і з шэрагам метэаралагічных прыкмет. Найбольш пашыраная з іх: «Калі на Грамніцы певень з-пад страхі нап'ецца вадзіцы, то на Юр'я вол пад'есць травіцы».

Беручы пад увагу народныя традыцыі, Праваслаўная Царква з асаблівай дакладнасцю распавядае гісторыю Стрэчання Гасподняга, тлумачыць сутнасць дванадзесятага свята.

Дзяды (Зімовыя, Масленыя, Стрэчанскія)

13 лютага (дата рухомая)

Дні памінання нябожчыкаў, спачылых продкаў (Дзяды) адзначаюцца некалькі разоў на год у залежнасці ад мясцовай традыцыі: на Радаўніцу, напярэдадні Сёмухі, перад Змітравым днём і г. д. На Дзяды рыхтуюць памінальны стол з няпарнаю колькасцю абрадных страў. Акрамя абавязковай куцці гатуюць клёцкі, грыбы, бліны, яечню, мяса, узвар і іншыя стравы. У гэты дзень наведваюць могілкі, парадкуюць магілы, ідуць у царкву, моляцца.

На Стрэчанскія Дзяды (на дзевятым перадвялікодным тыдні, у суботу, напярэдадні Мясапуснага тыдня) за памінальным сталом збіраецца ўся сям'я. У шклянку з зернем ставіцца запаленая свечка. Паводле звычаю, частку кожнай стравы сімвалічна адкладваюць у асобны посуд для нябожчыкаў і на ноч са стала не прыбіраюць. Пасля малітвы каштуюцца нарыхтаваныя стравы, успамінаюцца спачылыя родзічы і блізкія.

У суботу, а не ў іншы дзень, Святая Царква моліцца аб спачылых таму, што субота як дзень спакою па сваім значэнні ёсць найлепшы для такіх малітваў. Апроч таго, малітвамі аб спачыне Царква нагадвае аб непазбежным для кожнага сконе, аб нарыхтаваным для нас непадкупным Суддзёю выпрабаванні. Разумеючы падуладнасць Госпаду, неабходнасць жыць праведна, мы, акрамя сказанага, рыхтуемся быць гатовымі да строгага выканання надыходзячага выратавальнага посту.

Масленіца

З 15 лютага (дата рухомая)

Гэтае перадвесняе свята доўжыцца некалькі дзён на Сырным (Масленічным) тыдні і звязана з адраджэннем пладаносных сіл зямлі. Асноўная накіраванасць абраднасці — провады зімы, жаданне хуткага прыходу вясны. Існуюць разнастайныя масленічныя абрады, у тым ліку прысвечаныя маладажонам. Як правіла, на Масленічным тыдні маладыя гасцююць у бацькоў жонкі (прыезд зяця да цешчы «на бліны»).

Увогуле Масленіцы ўласціва незвычайная весялосць. Дзяўчаты, маладзіцы ўбіраюцца ў лепшыя строі. Моладзь наладжвае гушканне на арэлях, коўзанне з горак на санках. Чым вышэй узляціш на арэлях, чым далей скоцішся з горкі — тым даўжэйшы быццам бы будзе лён. На Масленіцу абавязкова ласуюцца блінамі, спяваюць масленічныя песні.

Сырны тыдзень атрымаў сваю назву ад таго, что Святая Царква, паступова ўводзячы вернікаў у подзвіг Вялікага посту, з надыходам Сырнага тыдня ставіць іх на апошнюю ступень падрыхтоўчага ўстрымання: забараняецца ўжываць мяса і дазваляецца есці сыр, яйкі і масла. Каб, паступова адмовіўшыся ад прыемных страў, без цяжкасці перайсці да посту. Таму сапраўды набожным вернікам у Сырны тыдзень неабходна быць ва ўсім асабліва стрыманым, хоць устрыманне неабходна заўжды.

У нас жа, на вялікі жаль, Сырны тыдзень (Масленіца) па скажоным чалавечым разуменні і звычаі ператвараецца часам у тыдзень празмернасці ў ежы, у дні празмерных свецкіх забаў і з'яўляецца супрацьлегласцю намерам Святой Царквы. Відавочна, святкаванне Масленіцы мае язычніцкую пераемнасць. Існаваў язычніцкі бог — вынаходнік хмяльнога пітва, якому прысвячаліся некаторыя святы (вакханаліі), і такія святкаванні праводзіліся з усялякімі непрыстойнасцямі.

Неабходна памятаць святога Ціхана Задонскага павучанне: «Хто праводзіць Масленіцу ў бясчынствах, той становіцца відавочным неслухам Царквы і паказвае сябе не вартым самога імя хрысціяніна».

Саракі

22 сакавіка

Лічба, што ўваходзіць у назву свята, шырока абыгрываецца ў павер'ях і абрадавых дзеяннях, якія бытуюць у гэты дзень. Саракі прыпадаюць на дзень вясновага раўнадзенства. Чакаюць далейшага пацяплення. Калі ў гэты дзень бывае замаразак, то мяркуюць, што будуць яшчэ сорак маразоў; калі ад Грамніц трымаецца добрае надвор'е, то лета намячаецца засушлівае; калі добра растаюць ледзяшы, спадзяюцца на добрую вясну.

На Саракі пякуць для дзяцей з цеста «жаваранкаў», якіх дзеці падкідаюць угору і просяць пры гэтым, каб хутчэй прыляталі птушкі.

У гэты дзень, шануючы народныя традыцыі, кожны хрысціянін павінен прасякнуцца велічнасцю духоўнага подзвігу сарака Севасційскіх пакутнікаў, быць вартым іх святога жыцця, мацаваць сябе вераю ў Госпада.

Гуканне вясны

7 красавіка

У залежнасці ад геаграфічных мясцовых умоў на свята Благавешчання адбываецца (ужо не першая) сустрэча вясны. Адухоўленае евангельскай падзеяй — паведамленнем Дзеве Марыі пра Нараджэнне ад Духа Святога Сына Іісуса — гуканне вясны набыло надзвычай паэтычныя формы. Гурты дзяўчат збіраюцца на самым высокім месцы, на беразе ракі ці возера, спяваюць вяснянкі, клічучы вясну з цёплымі дзянькамі, частымі дажджочкамі, распальваюць вогнішчы, водзяць карагоды («Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць»). Хлопцы з дудкамі і гармонікамі далучаюцца да дзяўчат. Бліжэй да вечара на ўсё наваколле сягаюць песні. Пачынаюць часам вяснянку ў адной вёсцы, падхопяць у другой, працягваюць у трэцяй... Шырыцца, лунае песня над абшарамі, лучыць людзей з прыродаю, саграве і ачышчае душу...

Благавешчаніко святое,
Пашлі сонейка залатое,
Каб зямелька адышла,
Ды вясна да нас прыйшла...

Па асаблівасцях гэтага дня робяцца прагнозы на ўраджай. Як на Благавешчанне дождж — збярэш багата хлеба; калі суха, то летам магчыма засуха. Умеранае надвор’е — умеранае будзе лета і такі ж ураджай.

Пасля гэтага дня ўрабляюць зямлю пад новыя пасевы.

Вербніца

4 красавіка (дата рухомая)

Галінкам вярбы, асвячоным у цэрквах на свята Уваходу Гасподняга ў Іерусалім, надаецца гаючая ўласцівасць. З даўніх часоў лічыцца, што праз непасрэдны дотык пры дапамозе такіх галінак можна перадаць здароўе і моц, сілу прыроды, якая адраджаецца. У некаторых мясцінах, віншуючы з Вербніцай, «сцёбаюць» адзін аднаго асвячонымі галінкамі, зычаць здароўя. Галінкі на працягу года захоўваюць у хаце, імі ўпрыгожваюць абразы, выганяюць жывёлу на першы выпас, кладуць на магілы блізкіх людзей. Такім чынам, асвячоная на дзень Уваходу Гасподняга ў Іерусалім вярба іграе ў жыцці простага чалавека важную ролю. І неабходна, каб абрады, звычаі гэтага святкавання не трацілі рэлігійна-царкоўнага характару.

Вербная нядзеля (Вербніца) — апошняя нядзеля перад Вялікаднём.

Вялікдзень

11 красавіка (дата рухомая)

Найвялікшае народнае свята са старажытных часоў. З прыняццем хрысціянства яно атрымала асаблівы духоўны сэнс і ачышчальную моц, з'яўляецца выключна радасным і ўрачыстым у шэрагу ўсіх хрысціянскіх свят.

Падрыхтаваўшы сябе духоўна Вялікім сямітыднёвым постам, на перадвелікодным Белым тыдні пачынаюць рыхтавацца да правядзення святочных дзён. У Чысты Чацвер чысцяць, прыбіраюць хату і двор. У Вялікую Суботу, напярэдадні Вялікадня, гатуецца, варыцца, смажыцца мноства розных страў. Пякуцца пірагі, фарбуюцца ў розныя колеры і распісваюцца ўзорамі курыныя яйкі (пісанкі). Увечары гэтага ж дня прыбіраюцца ў святочную вопратку, бяруць з сабой падрыхтаваную для асвячэння «пасху», ідуць у царкву на ўсяночную службу (а 18 гадзіне).

Святкаванне пачынаецца снеданнем пасля адпаведнай малітвы. Разгаўляюцца асвячоным (свянцоным) яйкам, потым іншай асвячонай ежай. Адзначаецца свята звычайна тры дні, у якія імкнуцца быць асабліва добрымі, шчодрымі і міласэрнымі.

Любімая гульня ў моладзі — біткі. Стукаюцца велікоднымі яйкамі, і пераможцам аказваецца той, у каго яно застаецца цэлае («мацак»). Ходзяць на свята і спевакі-валачобнікі. Абыходзячы двары, велічаюць гаспадароў, руплівую працу, жадаюць шчаслівай долі.

Дай табе Божа,
гаспадарочак,
І ў каморы,
і ў аборы.
А дзе гара —
там жыта капа.
А дзе лагчына —
там жыта сціртa,
А дзе лог —
там сена стог.
Дай табе Божа,
гаспадарочак,
Піва варыці,
сына жаніці...

Сутнасць і змест Вялікадня — свята ўсіх свят хрысціян — вызначаюць падзеі апошніх дзён зямнога жыцця Ісуса Хрыста і яго Уваскрасення. Пасля смерці Збавіцеля на крыжы Іосіф і Нікадзім (вучні Хрыста) знялі цела Яго, абгарнулі чыстаю плашчаніцаю і паклалі ў пахавальнай пячоры. Уваход быў прывалены цяжкім каменем, а па загаду ворагаў Хрыстовых пастаўлена варта. «Як прайшла субота, досвіткам... прыйшла Марыя Магдаліна і другая Марыя паглядзець магілу. І вось зрабіўся вялікі землятрус: бо Ангел Гасподні, які сышоў з нябёс, прыступіўшы, адваліў камень ад увахода ў магілу і сядзеў на ім; выгляд жа яго быў, як маланка, і ўбранне яго белае, як снег. І ад страху перад ім спалохаліся вартаўнікі і сталі, як

На Пасху (Вялікдзень) мы абменьваемся фарбаванымі (пераважна ў чырвоны колер) яйкамі. У Святым Паданні апавядаецца, што аднаго разу Марыя Магдаліна, прапаведваючы веру Хрыста, прыйшла да імператара Рыма і падаравала яму яечка са словамі: «Хрыстос Уваскрос!». У сапраўднасці слоў святой Магдаліны ўладар імперыі пераканаўся відавочна: звычайнае яечка ў ягоных руках раптам пачало ружавець і ўрэшце стала ярка-чырвоным.

З тых даўніх часоў мы падчас найвялікшага свята Вялікадня даруем адзін аднаму фарбаваныя яйкі як сімвал несмяротнасці жыцця і крыжовых пакут Ісуса Хрыста дзеля нашага ўратавання і кажам пранікнёныя словы: «Хрыстос Уваскрос!».

Увогуле ж Пасха — свята старазапаветнае, усталяванае як памяць аб сыходзе яўрэяў з Егіпта, аб вызваленні з егіпецкага рабства. Назва яго паходзіць ад яўрэйскага слова «*pesach*», што значыць «праходзіць міма». Вось адно з упамінанняў свята ў Бібліі: «Праз два дні павінна было адзначацца свята Пасхі і праснакоў; і шукалі першасвятары і кніжнікі, каб узяць Яго (Ісуса Хрыста.— *Аўт.*) хітрасцю і забіць» (Мк. 14:1).

Хрысціянскі ж свет адзначае Пасху з часоў вызначальнай падзеі Уваскрасення Ісуса Хрыста. Святкаванне яе адбывалася ўжо ў апостальскай (заснаванай вучнямі Збавіцеля) Царкве. У II стагоддзі існавалі два святы, дзве Пасхі: адна — у знак смерці Збавіцеля, другая — у гонар Уваскрасення Хрыстовага, яго Узнясення (саракавы дзень пасля Уваскрасення), сашэсця Святога Духа на апосталаў (Пяцідзесятніца — пяцідзесяты дзень пасля Уваскрасення). Прытым першая Пасха праводзілася ў журбе і строгім посце. З V стагоддзя назва «Пасха» стала надавацца толькі святу ў гонар Уваскрасення Хрыстовага.

У хрысціянскай Царкве свята Пасхі ў абагульняючым сэнсе пачало азначаць уваскрасенне з мёртвых, пераход ад смерці да жыцця, абнаўленне і ўратаванне. Свята Пасхі — трыумф хрысціянскай веры, дабрадзейнасці, надзеі.

У праваслаўных хрысціян ёсць звычай на першы дзень Пасхі рыхтаваць для асвячэння ў царкве хлеб (пірог), фарбаваныя курыныя яйкі, мяса, сыр — свяціць «пасху». Звычай мае пэўны сэнс, бо разгаўляюцца пасля Вялікага посту і малітвы асвячоным чырвоным яечкам, сімвалізуючым несмяротнасць жыцця і крыжовыя пакуты Ісуса Хрыста. Далей ядуць асвячоны хлеб, мяса, сыр, што таксама робіцца як напамін аб нябачнай прысутнасці Уваскрэслага Хрыста, Які разам з апосталамі ўжываў простую ежу.

Нездарма нашы продкі ўзвялічвалі Пасху асаблівымі вераваннямі і звычаямі. Вялікдзень — свята вясны і абуджэння прыроды, спалучыўшыся з вялікай рэлігійнай пасхальнай ўрачыстасцю, атрымала асаблівае хараство і прывабнасць.

Святкаванне Пасхі — Уваскрасення Хрыстовага — набыло ў цяперашні час важнае сацыяльна-грамадскае гучанне. Гэта свята Уваскрасення нашай духоўнасці, свята Уваскрасення Бацькаўшчыны!

Юр'е (вясновы)

6 мая

Даўняе гадавое свята земляробчага календара ў гонар заступніка жывёлы і сельскай гаспадаркі велікамучаніка Георгія (Юрыя, Ягорыя) Пераможцы. З гэтага дня пачынаецца сталая вясновая пара для працаўніка. Выконваецца шэраг абрадаў ахоўнай накіраванасці, якія сваёй мэтай маюць захаванне свойскай жыўнасці. Перш

чым выганяць жывёлу на «юраўскую расу», карыстаюцца атрыбутамі абрадавых дзеянняў: грамнічнай свечкай, асвячонай вярбой, святаянскімі зёлкамі, яйкам; святому велікамучаніку правіцца малебен, акрапляюцца святой вадою пастухі і статак.

Вельмі ўрачыста адбываюцца і аграрныя абрады агледзін зарунелай нівы. Атрыбутамі тут з'яўляюцца: каравай, яйкі, рэшткі страў ад велікоднай ежы. Мэта абрадаў — засцерагчы ніву, будучы ураджай, задобрыць сілы зямлі.

У гэты дзень водзяць карагоды, частуюцца, танцуюць пад дуду, скрыпку, спяваюць юраўскія песні.

Юр'е лічыцца яшчэ і вялікім святам пастухоў. Кожны гаспадар дае ім харчы, і яны раскладваюць на пашы вогнішча, ладзяць сабе частаванне, якое мае таксама абрадавае значэнне.

Дбайны гаспадар не прапускае без увагі надвор'я ў гэты дзень і робіць для сябе пэўныя высновы: «Як на Юр'е пагода, то на грэчку няўрода», «Калі будзе раса, хопіць коням аўса», «Калі на Ягор'я мароз, будзе добры авёс» і г. д.

Радаўніца (Радаўніцкія Дзяды)

20 красавіка (дата рухомая)

Праз тыдзень пасля Вялікадня, заўжды на аўторак, прыпадае адзін з найбольш значных памінальных дзён. Спачатку ідуць памінаць блізкіх у царкву, а потым на могілкі. Крыху памінальнай трапезы, у тым ліку велікоднае яйка, пакідаюць «для мёртвых».

Памінанне спачылых пасля Пасхі адбывалася і ў глыбокай старажытнасці. Пачатак урачыстага памінання ў веры памерлых пакладзены ў Новазапаветнай Царкве як памінанне мучанікаў.

Мікола (вясновы)

22 мая

Да Міколы (дзень свяціцеля і цудатворца Нікалая) паспяваюць многае пасеяць, пасадзіць. Паводле народных вераванняў, святы Мікола выступае заступнікам земляроба, клапоціцца пра ўраджай: «Святы Мікола па межах ходзіць, жыта раўнуець... Дзе вымакла — там падсушыць, дзе высахла — там падмочыць». У народзе трымаюцца парад наконт работ, якія трэба закончыць да свята і якія — пасля яго. З Міколавага дня, напрыклад, трэба паспяшацца пастрыгчы авечак, пакуль яны не пачалі ліняць: «Да Міколы не сей грэчкі, не стрыжы авечкі».

Мікола — свята пастухоў і конюхаў. Вядома ж, конь у сялянскай гаспадарцы да сённяшняга часу лічыцца незаменным памочнікам у нялёгкай працы. Каб засцерагчы коней ад хвароб, ад сурокаў, каб захаваць іх моц, выконваюцца адпаведныя для той ці іншай мясцовасці абрады.

З асаблівай шчырасцю народ услаўляе памяць святога Нікалая, найчасцей звяртаецца да яго ў сваіх малітвах. Свяціцель Нікалай, архіепіскап Міраў Лікійскіх, цудатворац — заступнік ад усіх бедстваў і скрухі.

Сёмуха (Троіца)

30 мая (дата рухомая)

Сёмуха — нядзеля, якою завяршаецца сёмы тыдзень пасля Вялікадня. Гэта старажытнае земляробчае свята славянскіх народаў. У аснове свята — культ зеляніны (заканчэнне веснавых палявых работ), шлюбу і продкаў. Лакальная назва свята — Зелянец («На Зелянец вясны канец»).

Напярэдадні Сёмухі, у суботу, спраўляюцца Сёмушныя, ці Траецкія, Дзяды, каб ушанаваць памяць продкаў і заручыцца іх падтрымкай на добры ўраджай.

Перад святам прыбіраюць і ўпрыгожваюць хаты і двары «маем» (аерам, галінкамі і дрэўцамі бярозы, клёна, рабіны, дуба). Бярозе надаецца асаблівае значэнне, бо яна зелянее раней за іншыя дрэвы і найбольш увасабляе жыватворную сілу зямлі. Ёю ўпрыгожваюць покуць, ставяць каля брамы, веснічак. На падлозе сцелюць траву (часцей аер); кветкамі прыбіраюць абразы, сталы, вокны.

Святкуецца Сёмуха тры дні. У час свята ладзяць гульні, карагоды, плятуць вянкі, потым — агульнае частаванне. У некаторых мясцовасцях адбываецца кумаванне, спраўляецца шмат вяселляў. Дзяўчаты на свята адпраўляюцца ў лес «завіваць бярозкі», бяруць пры гэтым ежу і напоі, спяваюць сёмушныя (траецкія) песні, матывы кахання і шлюбу ў якіх асноўныя. Плятуць на Сёмуху вянкі і пускаюць іх на ваду, вызначаючы такім чынам свой лёс на замужжа. Існуе яшчэ і абрад «Ваджэнне куста», які мае, як і ўсе сёмушныя ўрачыстасці, аграрны і сямейна-шлюбны змест. Маладую дзяўчыну ўпрыгожваюць галінкамі («маем»), і дзявочы гурт абыходзіць двары з песнямі. «Куставыя» песні маюць велічальны характар і, паводле народных уяўленняў, спрыяюць добраму ўраджаю, замужжу дзяўчат, якім адрасуюцца песні.

Цяпер на свята Троіцы кветкі і галінкі дрэў, зеляніна ўпрыгожвае не толькі жытло чалавека, але і храмы. Яны прыносяцца Богу як начаткі жыватворных сіл вясны і разам з тым служаць сімвалам Царквы Хрыстовай, якая са з'яўленнем у ёй благадатнасці Святога Духа расквітнела і абнаўляе людзей.

Купалле

6 ліпеня

Гэта — старажытнае язычніцкае свята часу летняга сонцастаяння, найвышэйшага росквіту расліннага свету, жыватворных сіл зямлі. Селянін клапоціцца, каб сабраць і давесці да ладу плён сваёй працы — ураджай, каб ніякія нядобрыя сілы не перашкодзілі яму ў гэтым. Адсюль аграрна-ахоўнае назначэнне шматлікіх купальскіх абрадаў.

Святкуецца Купалле ў ноч з 6 на 7 ліпеня. Днём дзяўчаты ідуць на луг, у поле збіраць купальскія зёлкі. Лічыцца, што яны маюць асаблівую лекавую моц.

Галоўнае месца сярод абрадаў і гульняў Купалля займае купальскае вогнішча, якое надае святу найбольшую ўрачыстасць і каларыт. Увечары да яго, раскладзенага за паселішчам, з купальскімі песнямі збіраюцца вяскоўцы. Тут жа гатуюць абрадавую вячэру, водзяць карагоды, моладзь забаўляецца гульнямі, юнакі і дзяўчаты скачуць цераз агонь. Уздымаецца на высокім шосце запаленае кола, што

сімвалізуе сонца, якое з гэтага часу робіць паварот на зіму. Полымя нясе ачышчэнне, быццам бы праганяе смерць, яно — крыніца жыватворных сіл прыроды.

А ў нас сёння Купала, Купала,
Пойдзем, дзевачкі, цвяточкі рваць,
А вечарам — у чыстае поле,
У жыта купалачку сабіраць,
А ў лесе касцёр будзем раскладаць,
Купальную ночачку праваджаць.

З Купаллем звязана рамантычная легенда пра папараць-кветку. Вераць, што на Купалле апоўначы ў гушчары лесу зацвітае кветка папараці. «А хто гэтую кветку адшукае — будзе мець усё». У паданнях расказваецца, што ў Купальскую ноч расліны размаўляюць між сабою, дрэвы пераходзяць з месца на месца, а рэкі свецяцца прывідным святлом. Сярод цудаў Купальскай ночы быццам назіраецца разгул змрочных сіл прыроды. Таму робяць розныя засцярогі ад нячысцікаў і сурокаў.

Пашырана на Купальскім святе і варажба. Напрыклад, па кінутых на ваду вянках дзяўчаты і хлопцы вызначаюць, што чакае іх у будучыні, загадваючы на будучага мужа ці жонку. Пад раніцу моладзь купаецца ў рацэ, качаецца па купальскай расе, сустракае ўсход сонца, назіраючы, як яно «іграе» — пераліваецца рознымі колерамі. Гэтыя дзеянні маюць, па павер'і, ачышчальную сілу, дазваляюць набрацца здароўя, пазбавіцца хвароб і немачы.

Купалле святкуецца напярэдадні жніва, таму дбайнага гаспадара не пакідаюць думкі пра ўраджай («Святы Іван колас наліваець... пчолы садзіць, коску правіць»). Лічыцца добрым знакам на Купалле прайсці першы пракос.

Пад імем Купалы нашы продкі абагаўлялі жыццятворную сілу вады і цеплыню сонца, верылі, што гэты Купала скрыты і ў вадзе, і ў агні, і ў раслінах. У часы хрысціянскія па сваёй недасведчанасці, духоўнай недасканаласці, змешваючы язычніцкае з хрысціянскім, нашы старажытныя папярэднікі далучылі свята Купала да свята Іаана, Хрысціцеля Гасподняга, даўшы святому Прадцечы празванне Івана Купалы.

Любячы бязмежна Госпада — Творцу ўсяго існуючага ў Свеце, услаўляючы Яго праявы і тварэнні, мы павінны выкараняць шкодныя псеўдасвяткаванні, прымхі, забабоны, зневажальныя для хрысціян і абразлівыя для памяці Хрысціцеля Гасподняга Іаана.

Пятро (Пётр і Павел)

12 ліпеня

Прымеркаваных народных абрадаў свята не мае. Калі спрыяе надвор'е, пачынаюць сенакос («Хто ў Пятроўку сена не косіць, той зімой у сабак просіць»). Думаюць ужо і пра набліжэнне жніва («Святы Пятро — жытцу ядро»). Пасля Пятра лета хіліцца на восень («Прыйшоў Пятрок — апаў лісток»).

Увогуле ж Пятро выступае як своеасаблівы працяг Купалля. У час святкавання спяваюцца арганічна звязаныя з купальскімі пятроўскія песні. У наш час асноўныя іх матывы — каханне і шлюб.

Пятрова ночка невялічка,
Да не выспалася дзевачка.
Ягадкі брала — драмала,
Перабірала — заснула.
Прыехаў дзяцінка — не чула.
Махнуў хустачкаю — не дамахнуў,
Пакаціў пярсцёнак — не дакаціў,
Злез з коніка да пабудзіў:
«Устань, дзевачка, да не ляжы,
Паднімі пярсцёнак да на мяжы,
Да на праву ручку ўзлажы,
Да нясі мамачцы пакажы».

Па дню Пятра народныя метэаролагі прадказваюць ураджай, пагоду і непагадзь: «На Пятро дождж — мокры сенакос», «Калі перад Пятром перастае куваць зязюля — будзе восень халодная і ранняя зіма».

Святая Царква ў службе дня памяці Пятра і Паўла ўслаўляе святых апосталаў: «сябры Хрыстовы»,«рэкі прамудрасці», «сусвету насыціцелі», «дабрадзейныя прапаведнікі», «падмурак Царкве, стаўпы і сцены, і трубы Хрыстовага вучэння і пакут».

Ілля

2 жніўня

У народным календары гэта свята, якое азначае канец лета («Прыйшоў Ілля, то і лета няма») і пачатак восені, пахаладання, дажджоў («Ілля нарабіў гнілля»). Заканчваюць касавіцу, пачынаюць араць паравое поле, рыхтуючыся спакваля да сяўбы азімых.

Ад Іллі пачынаецца доўгачаканае жніво («Свята Ілля — слаўная жняя»). Выспяванне жыта часта вывяраюць па ягадах у лесе: паспелі на Іллю чарніцы, значыць, паспела і жыта. У гэты час праводзяць «зажынкі». Абрадавы сэнс гэтага старадаўняга звычаю скіраваны на тое, каб забяспечыць добры збор ураджаю, выказаць пашану селяніна да хлеба, стварыць своеасаблівы яго культ. Навёўшы парадак у хаце, прыбраўшыся сама, зажынальніца (гаспадыня з дочкамі альбо нявесткамі) бярэ прыгатаваныя харчы і ідзе ў поле. Нажаўшы першы сноп, падсілкаваўшыся, з гэтым снапом вяртаецца дадому, дзе ён займае пачэснае месца на покуці пад абразамі (зерне з яго дамешваюць у насенне). Затым ладзіцца святочная вячэра, а ў наступныя дні пачынаецца цяжкая праца. Спяваюцца жніўныя песні.

Заканчваецца жніво «дажынкамі», якія абстаўляюцца адпаведнай урачыстасцю і абраднымі дзеяннямі: «завіваннем барады», ушанаваннем апошняга снапа, шчодрым частаваннем і зноў жа песнямі, але ўжо дажынкавымі.

Ой, хвала табе, Божа,
Што жыта пажалі,
У снапочкі павязалі,
У бабачкі пастаўлялі
І копачкі палічылі...

З прычыны адвольнага разумення падзей Біблейскага Пісання ў народзе існуе вера, што прарок Ілія ёсць непасрэдны распарадчык грозных і дабрадатных сіл прыроды. У народным уяўленні прарок быццам бы ездзіць на сваёй вогненнай калясніцы па небе і робіць гром. З глыбокай даўніны народ шанаваў гэтага ўгодніка Божага, а яго дзень быў святочны і непрацоўны. Лічылася, што непачцівасць да святога прарока і свята непазбежна вяла да Божага пакарання.

Першы Спас (Макавей)

14 жніўня

Спас — свята земляробчага календара, прымеркаванае да часу выспявання садавіны, гародніны («Спас — усяму час»). Гэта мяжа паміж летнім і асеннім цыкламі работ. Спасаў усяго тры. Першы Спас яшчэ завецца ў народзе Макавей. Праводзяцца абрады з макам, яго ядуць, робяць варэнікі з макам. Царква ў гэты дзень услаўляе подзвіг сямі святых мучанікаў Макавеяў, «мужных і вялікіх духам». У асобных мясцовасцях Беларусі са Спаса пачынаюць сяўбу азімых. На Макавея падкопваюць маладую бульбу і па ёй мяркуюць пра ўвесь ураджай. Пчаляры падглядаюць пчол, выганяюць мёд. Звычайна на Спас буслы адлятаюць у вырай. Калі яны адлятаюць за тыдзень перад святам, гэта прадказвае, што зіма надыдзе раней і будзе марозная, а вясна цяплейшая; калі пасля свята — восень будзе цёплая, зіма позняя, вясна халодная.

І ўсё ж свята не дае гаспадару забыцца, што доўга адпачываць няма калі: «Святы Спасік, пільны часік, папар строіць, жытцо малоціць».

Раней на Спас наладжваліся кірмашы, прадавалі садавіну, гародніну, мёд, збожжа, грыбы, скаціну, птушку, рамесныя вырабы.

У гэты дзень адбываецца ўшанаванне Святога Крыжа, Усяміласцівага Спаса і Прасвятой Багародзіцы. У цэрквах праводзяцца адпаведныя службы і малое водаасвячэнне. З гэтага дня пачынаецца Успенскі пост.

Другі Спас (Яблычны)

19 жніўня

Самы пашыраны і вядомы ў народзе Спас. Лічыцца, што да яго нельга есці яблыкаў, бо яны не паспелі. На Яблычны Спас іх, а таксама іншую садавіну асвячаюць у царкве. Гэты звычай замацаваўся якраз у дзень 19 жніўня на свята Праабражэння Спаса нашага Ісуса Хрыста. У царкву прыносяць плады для благаславення ў знак падзякі за атрыманне гэтых пладоў для харчавання чалавека. Святы Іаан Златавуст вучыць: «Земляроб атрымлівае плады ад зямлі не столькі за сваю працу і руплівасць, колькі па міласэрнасці Бога».

Звычай асвячэння пладоў мае і пэўнае павучальнае значэнне. Плады, калі яшчэ растуць, не вельмі прывабнага выгляду і смаку; паспяваючы, яны набываюць дасканалую прыгажосць, зусім ператвараюцца. Так і чалавек, калі ён карыстаецца словам Божым, жыве праведна, паступова духоўна выспявае і, як «пшаніца спелая ў час жніва», прымаецца ў жытніцу Айца Нябеснага.

Вялікая Прачыста (Першая Прачыста)
28 жніўня

Успенне Найсвяцейшай Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі адносіцца да двунадзесятых свят. Няма ў Праваслаўнай Царкве богаслужэння, няма малітвы, дзе б Царква не мацавала сваіх прашэнняў імем і малітвамі Прасвятой Багародзіцы. Яна — наша бязмерная Міласэрніца, дбайная Заступніца і Маці.

Вялікая Прачыста (народная назва Успення) — самае значнае свята канца лета. Селянін падводзіць вынікі сваёй працы. Ён з асаблівай радасцю ставіцца да новага хлеба: «Прачыстая прынясе хлеба чыстага». Як Спас славіцца асвячэннем яблыкаў, так Прачыста — асвячэннем хлеба. Асвячонае жыта перамешваюць з астатнім і адкладваюць да сяўбы, каб пасля яно добра расло. Адразу пасля свята пачынаецца сяўба азіміны, і гаспадар мусіць быць падрыхтаваны: «Успенне — ці гатова насенне?».

Свята Успення Багародзіцы бярэ свой пачатак са старажытных часоў хрысціянства. Падзеяй успення Багародзіцы Царква навучае нас, што смерць не ёсць канец нашага быцця; яна толькі пераход ад зямлі на неба, ад разбурэння да векавечнай бессмяротнасці. Так і зжатае зерне дае неўміручасць жыццю.

Трэці Спас (Хлебны)
29 жніўня

У народзе гавораць: «Трэці Спас — хлеба прыпас». У многіх раёнах Беларусі працягваюць спраўляць «дажынкі». Паспяваюць арэхі, і таму свята нярэдка называюць Арэхавым Спасам. Усё ў прыродзе сведчыць, што надышла восень, а прыказка нагадвае: «Спас — бяры рукавіцы ў запас».

Праваслаўныя хрысціяне памятаюць, што гэты дзень вызначаецца падзеяй перанясення ў Канстанцінопаль Нерукатворнага Вобраза Господняга, Спаса нашага Ісуса Хрыста.

Багач (Другая Прачыста)
21 верасня

У гэты дзень Праваслаўная Царква святкуе надзвычайную падзею нараджэння праблагаслявёнай Дзевы Марыі, Маці Госпада нашага Ісуса Хрыста. Разам з тым селянін радуецца заканчэнню напружанай і працаёмкай пары — жніва. Тут важную ролю адыгрывае так неабходная сейбіту рэч — «багач» — сявенька з жытам ці пшаніцай і ўстаўленай свечкай (жыта вымалочваецца з першага зажынкавага снапа і зносіцца па жменьцы з кожнага двара). З «багачом» абходзяць усе двары ў вёсцы, а на заканчэнне збіраюць на выгане статак і абносяць вакол яго «багач». Пасля свята «багач» ставяць у хаце пэўнага гаспадара і пакідаюць да наступнага жніва. Паводле народных павер'яў, «багач» павінен забяспечыць дому багацце і шчасце.

Святочны дзень, як заўсёды, не толькі падводзіў вынік зробленаму, але і настройваў на далейшыя работы: «Багач — кідай рагач (саху), бяры сявеньку, сей памаленьку». Звычайна да гэтага дня ўпраўляюцца шмат з якой работай, асноўным

клопатам гаспадара застаецца сяўба азімых. Ужо рана вечарэе, становіцца больш вольнага часу, і ў моладзі з'яўляецца магчымасць строіць пэўныя планы на шлюб. Ад Другой Прачысты пачынаюцца вячоркі.

На Багач робяць прадказанне на пачатак зімы. Калі пасля свята жывёліна імкнецца на пашу вельмі рана, то і зіма чакаецца ранняя. Прадчуваючы зазімкі, скаціна цягнецца болей скубянуць свежай травы.

Аднак кожны хрысціянін павінен ведаць, што нараджэнне Прасвятой Дзевы Марыі ёсць пачатак выканання ўсіх запаветаў Божых, якімі жыло і суцяшалася чалавецтва на працягу тысячагоддзяў; гэта пачатак свят, што служыць уваходам для дабрадатнасці і ісціны. Па словах святога Іаана Дамаскіна, «Ражаство Багародзіцы ёсць свята сусветнай радасці, бо Багародзіцаю абнавіўся ўвесь род чалавечы».

Пакрова (Трэцяя Прачыста)

14 кастрычніка

Да свята Пакрова Найсвяцейшай Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі звычайна завяршаюцца ўсе работы на полі і ў садзе, уцяпляецца жыллё. Пачынаецца новы цыкл работ: нарыхтоўка паліва, перавод жывёлы на стойлавае ўтрыманне. Існуе красамоўная прымаўка: «Прыйшла Пакрова, пытае, ці ты да зімы гатова». Юр'е (вясновы) і Пакрова змыкаюцца між сабою, бо з першым святам звязаны выган жывёлы пасля зімы, а з другім — пачатак зімавання скаціны ў хляве («Прыйшлі Пакровы — заганяй у хлеў каровы»). Пакрова сабрала шмат прыкмет і парад, звязаных з карміцелькаю-каровай: «Прыйшла Пакроўка — не дала малака кароўка» (г. зн. запускаецца); або ў дачыненні да няўвішнага гаспадара: «Хто сее на Пакрове — не будзе мець чаго даць карове».

Пакрова лічыцца паказчыкам для прагнозаў надвор'я: калі да Пакрова дня снег не пакрые зямлю, то і на Каляды не будзе снегу; якое надвор'е ў дзень Пакровы, такое яно будзе і ўсю зіму да вясны.

З надыходам свята дзяўчаты сур'ёзна думаюць пра замужжа, а хлопцы выглядаюць сабе нявест.

У Праваслаўнай Царкве гучаць гэтым днём наступныя словы: «Узрадаваныя Тваім, Богамаці, прышэсцем, і Твой прымаючы вобраз, замілавана просім: накрый нас благадатным Тваім покрывам, і пазбаў нас ад усялякага зла, уратуй душы нашы».

Змітраўскія Дзяды

6 лістапада (дата рухомая)

На трэцім тыдні пасля Пакровы, у суботу напярэдадні дня святога вялікамучаніка Дзімітрыя Салунскага (Змітрава дня), выконваецца агульны памінальны абрад. Памінанне адбываецца, як і ў іншыя памінальныя дні, з нязначнымі абрадавымі адхіленнямі ў розных мясцінах Беларусі.

Юр'е (зімовы)
9 снежня

Юр'е і Мікола святкуюцца ўвесну і ўзімку з невялікім перапынкам адзін пасля другога. Наконт гэтых зімовых свят у народзе гаворыцца: «Юр'е мосціць, а Мікола гвоздзіць»; «Да Юр'я хлеба (сена) і ў дурня». Існуе прыкмета: калі перад Юр'ем зімовым многа снегу, то да Юр'я вясновага будзе трава.

У гэты дзень падстрыгаюць грывы і хвасты коням, адымаюць жарабят ад матак і ставяць іх у стойлы да вясны.

Праваслаўная Царква гэты дзень адзначае як штогадовае свята ў гонар духоўнай перамогі над сваімі мучыцелямі святога велікамучаніка Георгія, атрымаўшага найменне Пераможцы. Вясною (6 мая) існуе яшчэ адзін дзень памяці св. Георгія — цярплівага пакутніка, палонных вызваліцеля, жабракоў абаронцы, нямоглых ратавальніка, дыявальскіх намераў пераможцы.

Мікола (зімовы)
19 снежня

Мікола вясновы і Мікола зімовы ў народным аграрным календары як бы адкрываюць кожны свой сезон: «Мікола — сапраўдная зіма, Мікола — сапраўднае лета». Прыказка заклікае гаспадара: «Беражы сена ад Міколы і да Міколы».

Святая Царква таксама шануе памяць свяціцеля Нікалая два разы на год (22 мая і 19 снежня). Атрымаўшы ад Госпада дар цудадзейства, святы Нікалай многія вялікія цуды стварыў на зямлі і на моры, дапамог у бедствах: і ад патаплення ратаваў, і з глыбіняў марскіх на сушу выносіў, і ад палону і цямніц пазбаўляў, і ад сячэння мячом абараняў, ад смерці ратуючы; многім даравáў вылячэнні: невідушчым — зрок, кульгавым — хаду, глухім — слых, нямым — гаворку; многіх у жабрацтве пакутнікаў узбагаціў, галодным даў насычэнне, усякаму ва ўсялякай патрэбе быў памочнікам. І сёння святы гатовы дапамагчы ўсім, хто да яго звяртаецца.

Прасвяты Нікалай, перасцеражы і пазбаў нас ад злой бяды, уратуй тваімі малітвамі!

8 Зак. 2210

Каляды ў Мінску



Батлейка

Пісанкі

Юр'е (вясновы). Гульня пастухоў

Дзяды

«...і пачуты быў голас іх, і ўзышла малітва іх
у святое жыллё Яго на нябёсы»
(2 Пар. 30:27)

БЕЛАРУСКІЯ ПРАВАСЛАЎНЫЯ СВЯТЫНІ

Праваслаўная вера на Беларусі мае тысячагадовую гісторыю. Пад уздзеяннем вучэння Праваслаўнай Царквы грубыя язычнікі станавіліся дабрачыннымі хрысціянамі. Павялічылася дабрадзейнасць і ўзнялася мараль. Вызначыліся новыя ўяўленні аб жыцці, новыя ідэі, новыя разуменні. Людзі імкнуліся іх ажыццявіць. Сярод носьбітаў гэтых духоўных памкненняў вылучаліся вернікі, якія раздавалі бедным маёмасць, пакідалі свае дамы і сыходзілі ў аддаленыя мясціны для малення і падзвіжніцкага жыцця. Яны станавіліся манахамі, у ліку якіх знатныя былі нароўні з простымі. Высокія ідэалы і святасць жыцця давалі падставу лічыць іх святымі людзьмі. ***Святыя*** *— гэта людзі, якія прынеслі сябе ў ахвяру Хрысту, каб ачысціцца ад грахоў. Яны выбралі шлях адрачэння ад мітуслівага свецкага жыцця, ад служэння плоці, зракліся зямных уцех дзеля духоўнага ўдасканалення, дзеля служэння Богу і бліжнім.*

Святыя падзвіжнікі жывуць мэтаю не толькі свайго ратавання. Яны намагаюцца малітваю, павучаннем і прыкладам уласнага жыцця ратаваць і далучаць да Госпада ўсіх астатніх.

Сярод мноства святых вылучаюць: ***роўнаапостальных*** *(тых, хто нароўні з апосталамі асвяцілі святлом Хрыстовым цэлыя народы);* ***мучанікаў***; ***свяціцеляў*** *(царкоўных іерархаў: святых патрыярхаў, мітрапалітаў, епіскапаў);* ***прападобных*** *(манахаў) і* ***праведных*** *(тых, хто, выказаўшы хрысціянскую любоў у свецкім жыцці, пазбег грахоўных спакус).*

САБОР БЕЛАРУСКІХ СВЯТЫХ

Угоднікі Божыя зямлі Беларускай, якія ішлі да выратавання ў розныя эпохі гісторыі, з'яўляюцца заступнікамі і малітоўнікамі прад Богам за сваіх зямных суродзічаў і за нашу Бацькаўшчыну.

3 красавіка (н. ст.) 1984 г. па благаславенні Свяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Пімена было ўсталявана святкаванне Сабора Беларускіх Святых у Нядзелю трэцюю па Пяцідзесятніцы. Паводле царкоўнага календара дні памяці Беларускіх Святых — наступныя:

Сабор Беларускіх Святых	Дзень памяці н. ст. / с. ст.	Год спачыну
Свяціцель Міна, епіскап Полацкі	3.07 / 20.06	1116
Прападобны Марцін Тураўскі	10.07 / 27.06	1150
Дабраверны вялікі князь Расціслаў	27.03 / 14.03	1167
Прападобная Еўфрасіння, ігумення Полацкая	5.06 / 23.05	1173
Свяціцель Дзіянісій, епіскап Полацкі	10.07 / 27.06	1182
Свяціцель Кірыла, епіскап Тураўскі	11.05 / 28.04	1183
Свяціцель Лаўрэнцій, епіскап Тураўскі	11.02 / 29.01	1194
Прападобны Елісей Лаўрышаўскі	5.11 / 23.10	1250
Свяціцель Сімяон, епіскап Полацкі	16.02 / 3.02	1289
Праведная дзева Юльянія, князёўна Альшанская	11.10 / 28.09	1550
Праведная Сафія, княгіня Слуцкая	1.04 / 19.03	1612
Прападобнамучанік Афанасій, ігумен Брэсцкі	18.09 / 5.09	1648
Прападобнамучанік Макарый, ігумен Пінскі	20.09 / 7.09	1678
Мучанік дзіця Гаўрыіл Беластоцкі	3.05 / 20.04	1690
Свяціцель Георгій Каніскі, Архіепіскап Магілёўскі і Беларускі	26.02 / 13.02	1795
Праведны Іаан Кармянскі	31.05/18.05	1917

СВЯТЫЯ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

Свяціцель Міна, епіскап Полацкі

Дата нараджэння свяціцеля невядома. Мяркуецца, што гэта адбылося ў 50—60-ыя гады XI стагоддзя ў Полацку. Там прамінула дзяцінства і пачалося духоўнае падзвіжніцтва навучанага Святому Пісанню юнака. Імкненне большага служэння Богу прывяло яго ў Кіева-Пячэрскі манастыр, вядомы на той час высокай багачыннасцю сваіх насельнікаў. Там у 1105 годзе ён быў узведзены ў сан епіскапа Полацкага. Яго дзейнасцю ўзмацняліся цэрквы і манастыры Полаччыны, выхоўваліся ў законах дабралюбнасці служыцелі Госпада і вернікі. Падчас епіскапства Міны прыняла манаскі пострыг сама Еўфрасіння — дачка князя Георгія Усяславіча. Была выхавана ім у любові да Слова Божага і Святога Пісання.

Свяціцель Міна ўслаўляецца Праваслаўнай Царквою як адзін з першых архіпастыраў, якія сваім жыццём і служэннем спрыялі благадатнаму распаўсюджанню веры Хрыстовай пасля Хрышчэння зямлі Беларускай.

Зямное жыццё епіскапа Міны закончылася летам 1116 года. У Васкрасенскім летапісе пад гэтым годам маецца запіс: «Того же лета преставился Мина, епископ Полоцкий июня 20».

Прападобны Марцін Тураўскі

Блажэнны Марцін Тураўскі служыў кухарам у епіскапаў Сімяона, Ігнація, Іаакіма і Георгія — духоўных пастыраў зямлі Тураўскай. Гасподзь даў магчымасць бачыць яму іх святое жыццё, чуць святыя малітвы аб збаўленні народа беларускага. Будучы ў старых гадах, праведны старац не мог несці паслушэнне ў архірэйскім доме, але не пакінуў манастыр святых Барыса і Глеба. У адзін з дзён Вялікага посту ён прыняў манаства і далей жыў у затворы. Ад цяжкай даўнейшай працы ён часта хварэў. Аднаго разу, асабліва пакутуючы ад хваробы, яму адкрылася бачыць святых князёў Барыса і Глеба. Яны далі яму напіцца вады і ацалілі ад хваробы.

Прападобны затворнік Марцін Тураўскі памёр 27 чэрвеня (с. ст.) 1150 года, пражыўшы год пасля цудадзейнага ацалення.

Апошнія гады жыцця святы Марцін правёў у несупынным служэнні Богу і вялікай удзячнасці за Ягоныя міласці, у шчырых малітвах за праваслаўны народ беларускі.

Святы дабраверны Расціслаў, Вялікі князь Кіеўскі і Смаленскі

Гэты князь, празваны Набожным, быў надзвычай любімы і паважаны людзьмі за хрысціянскае жыццё, хоць лёсам было наканавана яму весці міжусобную барацьбу. Ён шануецца народам, Царквою і як заступнік дзяржаўнасці. Пра такіх князёў складаліся песні, паданні і жыція.

З імем князя Расціслава, сына князя Кіеўскага Мсціслава-Феадора Вялікага, звязана ўмацаванне і ўзвышэнне Смаленскага княства і Смаленскай епархіі ў XII стагоддзі.

Князь Расціслаў атрымаў Смаленскае княства ад свайго бацькі (1125) і кіраваў ім больш за 40 гадоў. Дзякуючы клопатам і намаганням князя Расціслава Смаленская зямля забудоўвалася гарадамі, упрыгожвалася храмамі і манастырамі.

У 1136 годзе Расціслаў дамогся ўтварэння асобнай Смаленскай епархіі і выдання яе Статута. Клопатамі князя быў перабудаваны і пашыраны вялікі Успенскі сабор, закладзены яго дзедам Уладзімірам Манамахам, пабудаваны Смаленскі Крэмль і Спаскі сабор Смядыньскага Барыса-Глебскага манастыра.

У 1159 годзе Расціслаў заняў Кіеўскі пасад і заставаўся вялікім князем да канца жыцця. Шмат гадоў ён меў цесныя зносіны з манахамі Кіева-Пячэрскага манастыра, асабліва з архімандрытам Палікарпам, які быў блізкім яму чалавекам.

Сярод дзяржаўных уладароў князь Расціслаў вылучаўся сваёй мудрасцю, справядлівасцю, бездакорным паслушэнствам і пашанаю да Царквы. Для нашчадкаў ён — увасабленне праўдзівасці і праведнасці.

Памёр князь 14 сакавіка (с. ст.) 1167 года. Яго цела пакладзена ў Кіева-Феадораўскім манастыры.

Прападобная Еўфрасіння, ігумення Полацкая

Прападобная Еўфрасіння (свецкае імя Прадслава) паходзіла з роду князёў, была прапраўнучкай роўнаапостальнага князя Уладзіміра і княгіні Рагнеды, унучкай Полацкага князя Усяслава Чарадзея і дачкою князя Георгія Усяславіча. Жыціе апавяшчае, што Прадслава з дзіцячых гадоў выявіла вялікую любоў да кніжнага навучання і шчырай малітвы. Калі бацькі пачалі думаць аб яе шлюбе, дванаццацігадовая Прадслава ім адказала: «Што рабілі нашы продкі перад намі? Жаніліся і выходзілі замуж, і княжылі, але не вечна жылі, жыццё іх мінула, і згінула іх слава, бы прах...». І ў супрацьлегласць такога жыцця Прадслава прыняла прыклад жыцця падзвіжнікаў, што пайшлі за Хрыстом: «...і яны помняцца на зямлі, а імёны іхнія напісаны на нябёсах, дзе яны разам з Ангеламі несупынна ўслаўляюць Бога».

Дзяўчына цвёрда вырашыла прысвяціць сваё жыццё Богу. Яна пакінула бацькоўскі дом, пайшла ў манастыр і прыняла пострыг з імем Еўфрасіння. З благаславення Полацкага епіскапа Іліі Еўфрасіння стала жыць пры Сафійскім саборы, займацца перапісваннем кніг. Напэўна, пры саборы шчыравалі таленавітыя майстрыкніжнікі, бо вялікая бібліятэка ўсё пашыралася, а для стварэння нават адной кнігі неабходна была праца цэлай майстэрні.

Прыкладна ў 1128 годзе епіскап Ілія благаславіў прападобную Еўфрасінню на заснаванне жаночага манастыра, вызначыўшы месца абіцелі — Сяльцо, дзе была царква Спаса і месца пахавання Полацкіх епіскапаў. Новаўладкаваны Еўфрасінняй Спаса-Праабражэнскі манастыр набывае шырокую вядомасць у полацкіх землях. У абіцелі на месцы былой драўлянай царквы Еўфрасінняй распачалося будаўніцтва каменнага сабора. І гэты сабор, збудаваны ў 1161 годзе, захаваўся да нашага часу. У манастыры святая навучала маладых інакіняў перапісванню кніг, спевам, шыццю і іншым рамёствам.

Непадалёку ад Спаса-Праабражэнскай абіцелі ігумення Еўфрасіння ўзвяла яшчэ адну царкву — Багародзіцкую, пры якой адкрыла мужчынскі Багародзіцкі манастыр. Для гэтай абіцелі і царквы прападобная набыла з дазволу Канстанцінопальскага Патрыярха Лукі цудатворную Эфескую ікону Божай Маці, напісаную, згодна з паданнем, самім евангелістам Лукой.

У манастырах, заснаваных прападобнай Еўфрасінняй, існавалі іканапісныя майстэрні. Там вырабляліся рэчы царкоўнага ўжытку, аклады для абразоў. Адным з ювеліраў, майстрам Лазарам Богшам, быў зроблены знакаміты Крыж — са святымі часцінамі Гасподнімі і часцінамі мошчаў Божых угоднікаў. Пад кіраўніцтвам Еўфрасінні дзейнічалі майстэрні па перапісванні кніг. Мудрасць прападобнай выяўлялася і ў тым, што яна не пайшла шляхам барацьбы са старымі мясцовымі традыцыямі, а намагалася асвяціць святлом Евангелля ўсё, што магло служыць хрысціяніну. Педагагічная дзейнасць вялікай падзвіжніцы дала адчувальны штуршок для развіцця адукацыі народа. Школы Еўфрасінні Полацкай з'яўляліся перадавымі для свайго часу і па праграмам навучання, і па складу навучэнцаў. Апошнія ў большасці сваёй былі дзецьмі простых людзей.

Еўфрасіння Полацкая ў вырашэнні палітычных праблем края выступала як міратворца, як абаронца народа.

Незадоўга да смерці прападобная Еўфрасіння выправілася ў паломніцтва да Святых Месцаў. Пакланіўшыся святыням Канстанцінопаля, яна дабралася да Іерусаліма, дзе ў Рускім манастыры Прасвятой Багародзіцы Гасподзь спадобіў яе на мірны

спачын 23 мая (с. ст.) 1173 года. Прыкладна ў 1187 годзе цела святой было перанесена ў Кіева-Пячэрскі манастыр, а ў 1910-ым мошчы святой Еўфрасінні ўрачыста перавезлі ў Полацк, у заснаваны ёю манастыр.

Еўфрасіння Полацкая — адна з першых кананізаваных жанчын на ўсходнеславянскіх землях. Народ наш шануе святую як апякунку Беларусі і шчырую малітоўніцу прад Госпадам за ўсіх нас.

Малітвамі святой Еўфрасінні Полацкай хай памілуе Гасподзь нас грэшных.

Свяціцель Дзіянісій, епіскап Полацкі

Гістарычных звестак пра жыццёвы шлях свяціцеля няма. Лічыцца, што ён быў манахам Кіева-Пячэрскай лаўры. З благаславення Полацкага ўладыкі Дзіянісія ў сваё святоўнае падарожжа на Святую Зямлю адправілася прападобная Еўфрасіння Полацкая. Верагодна, што ён быў ініцыятарам яе царкоўнага ўслаўлення. Пры ім былі напісаны жыцце і складзена служба святой Еўфрасінні.

Летапісцы паведамляюць (Іпацьеўскі спіс), што епіскап Дзіянісій памёр у 1182 годзе.

Памяць Полацкага ўладыкі здаўна шануецца ў народзе і сведчыць аб невядомых нам выяўленнях благадаці Святога Духа на гэтым благачынным свяціцелі.

Свяціцель Кірыла, епіскап Тураўскі

Свяціцель Кірыла Тураўскі — настаўнік дабрамыснасці, праведнік і багаслоў-тэолаг, аскет-стоўпнік, кніжнік, паэт і прамоўца, празваны «Златословом, просиявшим паче всех на Руси», вялікі знаўца Святога Пісання і святаайчыннай літаратуры, які плённа шчыраваў на ніве слова Божага, пасеяўшы дабротнае семя духоўнасці.

Свяціцель нарадзіўся ў горадзе Тураве ў 30-ых гадах XII стагоддзя. «Сын заможных бацькоў, ён не любіў, аднак жа, багацця і тленнай славы гэтага свету; але найперш намагаўся спасцігнуць вучэнне Боскіх кніг і дабрамысна спрактыкаваўся ў святых пісаннях»,— апавядае нам жыцце. Атрымаў добрае хатняе выхаванне, спасціг вышэйшыя навукі і мастацтва. Ведаў візантыйскую культуру, асабліва паэзію і красамоўства. Дасягнуўшы самастойнага ўзросту, Кірыла адмовіўся ад спадчыны бацькоў і прыняў пострыг у Тураўскім Барыса-Глебскім манастыры. Праз пэўны час ён прымае затворніцтва, мацуецца ў духоўным подзвігу, «многа Божественна Писания изложи».

Шмат людзей звярталася да яго па духоўныя парады. Святасць жыцця і высокая адукаванасць прыцягвалі да яго і манахаў, і простых вернікаў. Яго абіраюць на Тураўскую кафедру. Схільны да адзіноцтва, Кірыла пакідае епіскапскую кафедру і цалкам прысвячае сябе напісанню духоўных твораў. Да гэтай неацэннай спадчыны належаць словы-казанні, прытчы пра душу і цела, казанні пра манаскі чын і ангельскі вобраз, пасланні да Васілія, ігумена Пячэрскага, каноны, спавядальныя малітвы, пропаведзі на царкоўныя святы. Мабыць, лепшае з напісанага святым Кірылам — гэта «Малітвы на ўсю сядміцу». У «Слове на антыпасху» ён праз вясновае абнаўлен-

не прыроды стварае гімн нашаму Збавіцелю: «Ныне солнце, красуяся, к высоте восходит и, радуясь, землю огревает: взиде бо нам от гроба праведное солнце Христос и вся верующая Ему спасает...».

Спачыў святціцель Кірыла 28 красавіка (с. ст.) 1183 года.

Ён раздаваў «словы Божыя, даражэйшыя за золата, і каштоўныя камяні, саладзейшыя за мёд і соты...».

Святціцель Лаўрэнцій, затворнік Пячэрскі, епіскап Тураўскі

Манаскае жыццё прападобны Лаўрэнцій пачаў у Кіева-Пячэрскім манастыры. «Калі ты молішся, зайдзі ў пакой свой і, зачыніўшы дзверы твае, памаліся Айцу твайму, Які ў тайнасці; і Айцец твой, Які бачыць у тайнасці, аддасць табе на яве» (Мф. 6:6). Гэтыя словы Ісуса Хрыста глыбока запалі ў душу святціцеля, і ён дабрамысна і малітоўна служыў Госпаду ў строгім затворы. Прызначыўшы сабе самыя суровыя ўмовы манаскага жыцця ў манастыры святога велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага, што знаходзіўся бліз Кіева-Пячэрскай лаўры, святціцель атрымаў дар Гасподні ацаляць людзей ад цялесных і душэўных хвароб. Пасля ацалення перад іконай Пячэрскай Божай Маці апанаванага нячысцікам чалавека прападобны Лаўрэнцій зноў стаў служыць у святой Лаўры.

Глыбокая вера і адданасць Царкве манаха Лаўрэнція звярнулі ўвагу Кіеўскага мітрапаліта, які ў 1182 годзе прызначыў Лаўрэнція ўладыкам на Тураўскую кафедру, дзе ён стаў пераемнікам святога Кірылы Тураўскага. Нягледзячы на сан, прападобны Лаўрэнцій працягваў духоўны подзвіг, даючы прыклад служэння Царкве і Богу.

З прычыны старасці ўладыка спрасіў дазволу мітрапаліта вярнуцца ў Пячэрскі манастыр. Там прападобны Лаўрэнцій у 1194 годзе знайшоў месца вечнага спачыну. Нятленныя мошчы святога Лаўрэнція былі змешчаны ў той самай пячоры, дзе ён адбываў сваё затворніцтва пры жыцці.

Прападобны Елісей Лаўрышаўскі

Ёсць звесткі, што прападобны Елісей быў сынам князя Трайната, займаў высокую пасаду пры двары вялікага князя Міндоўга. Прыняўшы хрышчэнне, пакінуў двор і сышоў у пустэльню. У «Гісторыка-статыстычным апісанні Мінскай епархіі» ёсць звесткі, што каля Наваградка, у тым месцы, дзе цяпер Лаўрышаўская прыходская Успенская царква, існаваў мужчынскі манастыр, заснаваны каля 1225 года інакам Елісеем.

Па смерці прападобнага (1250) яго мошчы даравалі ацаленне. Калі ў 1505 годзе татары наблізіліся да Лаўрышаўскага манастыра, Гасподзь явіў цуд праз Свайго ўгодніка: татарам здалося, што манастырскі двор запоўнены адмысловай конніцай, і яны ў жаху разбегліся. Магчыма, гэта падзея і стала нагодай для кананізацыі прападобнага Елісея мітрапалітам Іосіфам Солтанам на саборы ў 1514 годзе. Мошчы святога падчас вайны былі схаваныя, аднак пасля спалення манастыра не знойдзены.

Свяціцель Сімяон, епіскап Полацкі

Паходзіў свяціцель Сімяон з полацкіх князёў. Атрымаў добрую на той час адукацыю і быў выхаваны ў духу хрысціянскіх дабрачыннасцей і любові да святых кніг. Не дзіўна, што юнак пажадаў пазбегчы свецкага спакушальнага жыцця і знайшоў суцяшэнне для сваёй душы ў адным з полацкіх манастыроў. Невядома, у які час ён быў рукапакладзены ў свяцiцельскі сан, але ёсць звесткі, што, будучы Полацкім епіскапам, святы Сімяон заснаваў за горадам Нікольскі манастыр.

Ніканаўскі летапіс сцвярджае: свяціцель «вельмі дасведчаны і моцны быў у кнігах Божага Пісання, адукаваны, дабрадзейны; да жабракоў, сірот ды ўдоў спагадлівы; абаронца скрыўджаных...». Гістарычнае апавяданне захавала размову святога Сімяона з полацкім князем Канстанцінам, які спытаў свяціцеля: «Дзе будуць цівуны (суддзі) на тым свеце?». Сімяон адказаў: «Цівун будзе там, дзе і князь». Князю гэта не спадабалася, ён запярэчыў: «Цівун судзіць несправядліва, хабар бярэ, мучыць людзей, а я што кепскага раблю?». Уладыка растлумачыў: «Калі князь добры і богабаязны, шкадуе людзей, любіць праўду ды паставіць цівуна — чалавека добрага і богабаязнага, разумнага і праўдалюбівага, то князь будзе ў раі і цівун ягоны будзе з ім. Калі ж князь не мае страху Божага, не шкадуе хрысціян, не думае аб сіротах ды ўдовах і паставіць начальніка злога, непамяркоўнага, каб толькі грошы яму здабываць... то і князь будзе ў пекле, і цівун ягоны з ім».

Нягледзячы на высокае паходжанне, епіскапу Сімяону прыйшлося пакінуць Полацкую кафедру па прычыне ўціску раздражнёных яго справядлівасцю валадароў. Полацкі іерарх знаходзіць сардэчны прыём у Цвяры, якая на той час належала Полацкай епархіі. Пачынаючы з 1285 года епіскап прыкладаў шмат намаганняў для важнай справы — узвядзення каменнай царквы ў імя Збавіцеля. На жаль, свяціцель не дажыў да завяршэння будоўлі. Ён памёр у 1289 годзе. «Дужа разумны і моцны ў кнігах Божага Пісання, вучыцельны, дабрадзейны, абаронца ўбогіх, сірот і ўдоў, заступнік пакрыўджаных...», епіскап Сімяон карыстаўся і народнай любоўю, і пашанай іерархаў.

Праведная дзева Юльянія, князёўна Альшанская

З канца XIV стагоддзя ў Кіеве набываюць уладу праваслаўныя беларускія магнаты Альшанскія. У князя Грыгорыя Альшанскага была дачка Юльянія. Выхоўваючыся ў духу хрысціянскай пакоры і дабралюбнасці, Юльянія любіла кніжныя навукі, паважала іерэйскі чын, вызначалася сціпласцю ў жыцці, шчодра адорвала Кіева-Пячэрскую лаўру. Аднак ёй наканавана было жыць усяго 16 гадоў. Князёўну пахавалі ў святой лаўры паблізу Пячэрскай царквы Успення Прасвятой Багародзіцы. Праз 100 гадоў было высветлена, што цела яе нятленнае. Па прапанове мітрапаліта манахі пры мошчах пачалі чытаць акафісты. Ад таго часу распачаліся цудадзейныя з'явы — мошчы прыносілі ацаленне. Падчас пажару мошчы згарэлі, астанкі пераклалі ў раку, а на грабніцы быў зроблены надпіс: «Па волі Творцы неба і зямлі жыве векавечна Юльянія, памочніца і вялікая ў небе заступніца. Тут косці — ацаленне ўсіх пакут... Райскія селішчы сабою ўпрыгожвае, Юльянія, як кветка цудоўная...».

Культ святой князёўны Юльяніі мацуе рэлігійную свядомасць праваслаўных насельнікаў беларускай зямлі.

Праведная Сафія, княгіня Слуцкая

Праведная Сафія належала да роду князёў Алелькавічаў, нашчадкаў вялікага літоўскага князя Альгерда. Яе бацька, князь Юрый Юр'евіч Алелькавіч, быў шчодрым дарыльшчыкам праваслаўным цэрквам і манастырам.

Дабраверная Сафія нарадзілася ў 1586 годзе. У тым жа годзе памерла яе маці, а праз год пахавалі і бацьку. Апекунамі сіраты былі родзічы. Яны заключылі пісьмовае пагадненне з князямі Радзівіламі аб тым, што пры дасягненні Сафіяй паўналетняга ўзросту яна павінна стаць жонкаю Януша Радзівіла, князя Нясвіжскага. І калі прыйшоў час, Януш Радзівіл звярнуўся да Рымскага папы за дазволам: яму, католіку, узяць шлюб з князёўнай Сафіяй. Яна ж заставалася ў праваслаўі і паставіла цвёрдую ўмову, каб дзеці ад гэтага шлюбу былі выхаваны праваслаўнымі.

Вянчанне Сафіі Слуцкай з Янушам Радзівілам адбылося 1 кастрычніка (с. ст.) 1600 года паводле праваслаўнага абраду ў адным з сабораў Брэста.

Ці была шчаслівая ў шлюбе з князем-гулякам яго маладая жонка? Наўрад ці. Бо тое, што мог ёй прапанаваць Януш, шчасцем княгіня не лічыла. Усю любоў і шчодрасць душы яна аддала справе Хрыстовай. Праведная Сафія не толькі аказвала матэрыяльную і маральную падтрымку духавенству і жыхарам Слуцкага Праабражэнскага праваслаўнага Брацтва, не толькі ахвяравала асабіста вышытыя золатам і срэбрам святарскія рызы і аблачэнні, але давала сродкі для пабудовы храмаў, як паломніца наведвала самыя аддаленыя прыходы. Княгіня Сафія пераканала свайго мужа хадайнічаць аб выданні польскім каралём граматы, якая б забараняла прымушаць праваслаўных вернікаў да уніі*. І грамата ад караля была атрымана. Слуцк застаўся адзіным горадам на Беларусі, які захаваў чысціню і недатыкальнасць Праваслаўнай веры, з'явіўся цвярдыняй Праваслаўя на Беларусі.

Спачыла праведная Сафія 19 сакавіка (с. ст.) 1612 года ад першых родаў ва ўзросце 26 гадоў. Яна завяршыла сабою род князёў Алелькавічаў, не пакінуўшы нашчадкаў.

Нятленныя мошчы святой Сафіі захоўваюцца ў Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска, напамінаючы ўсім аб святоўным подзвігу слуцкай княгіні.

Прападобнамучанік Афанасій, ігумен Брэсцкі

Нарадзіўся прападобнамучанік Афанасій каля 1597 года на Брэстчыне ў набожнай хрысціянскай сям'і Філіповічаў. Атрымаў добрую адукацыю, ведаў багаслоўскую і гістарычную літаратуру, валодаў польскай, лацінскай, грэчаскай, славянскай мовамі. Афанасій займаўся навучаннем моладзі ў сем'ях беларускіх шляхціцаў і нейкі час жыў пры двары літоўскага канцлера Льва Сапегі.

У 1627 годзе пакінуў двор Сапегі і прыняў манаскі пострыг ад ігумена Іосіфа ў Віленскім Свята-Духавым манастыры. У 1632 годзе быў рукапакладзены ў іераманаха і прызначаны намеснікам ігумена ў Дубойнскім манастыры за Пінскам. Жыў

---

* У гэты час пасля заключэння царкоўнай уніі з Рымам (1596) Слуцк належаў княгіні Сафіі.

у Куцеінскім (пад Оршай), Міжгорскім (пад Кіевам), Купяціцкім (каля Пінска) манастырах.

У 1637—1638 гадах ездзіў да расійскага цара ў Маскву. Пра мэту і вынікі візіту напісаў спецыяльную рэляцыю «Гісторыя падарожжа ў Маскву». Гэта — першы твор Філіповіча, у якім ён, выкарыстоўваючы арыгінальныя паэтычныя прыёмы, расказаў пра цяжкае становішча праваслаўнага люду Беларусі і Украіны ў складзе Рэчы Паспалітай і выказаў спадзяванні на расійскага цара Міхаіла Фёдаравіча як на апору праваслаўных.

У 1640 годзе прападобны Афанасій абраны ігуменам Берасцейскага Сімяонаўскага манастыра. Ён аказаўся там у самым цэнтры супрацьстаяння Праваслаўя з уніяй, бо Брэст быў горадам, у якім найбольш умацавалася «грэка-каталіцтва». Каб абараніць праваслаўных, ігумену давялося ехаць у Варшаву і звярнуцца да караля. Але выніку гэта не дало.

За актыўнае процідзеянне Брэсцкай царкоўнай уніі (1596) і рэзкія выпады ў адрас караля на дзяржаўных соймах (1641 і 1643) Афанасія саслалі ў Кіеў. Прападобны не пакідае змагацца супраць уніі і абараняць правы праваслаўных. Будучы ў Кіева-Пячэрскім манастыры, ён працуе над зборам сваіх твораў пад назвай «Дыярыуш» (1646). Туды ўвайшлі падарожныя і тлумачальныя запіскі, успаміны і дзённікі, аўтабіяграфічны нарыс, легенды, пасланні і лісты, выкрывальныя прамовы, канспектыўныя накіды асобных артыкулаў, багаслоўскія трактаты і духоўныя вершы.

У дні паўстання Багдана Хмяльніцкага (1648) падчас Літургіі ў Сімяонаўскім манастыры ігумена Афанасія арыштавалі, абвінаваціўшы ў дапамозе паўстанцам. Яго ўгаворвалі адмовіцца ад Праваслаўя. Фанатычныя гайдукі ваяводы Масальскага па даносах іезуітаў пасля жорсткіх катаванняў расстралялі мучаніка Афанасія каля вёскі Гершановічы пад Брэстам. Нятленнае цела святога інакі перанеслі ў манастыр і праз некалькі дзён з пашанай пахавалі ў галоўным храме. У 1815 годзе драўляная манастырская царква згарэла, але ацалелыя астанкі мошчаў былі знойдзены, пакладзены ў каўчэг і пастаўлены для пакланення.

У 1893 годзе ў імя святога прападобнамучаніка Афанасія Брэсцкага ў Гродзенскім Барыса-Глебскім манастыры ўзведзены храм, а праз год часціца святых мошчаў угодніка Божага была перанесена ў Леснінскі жаночы манастыр. Гасподзь дараваў цудатворную сілу ацалення мошчам прападобнамучаніка Афанасія.

Аднойдзенне мошчаў пазначана ў календары датаю 2 жніўня (н. ст.).

Прападобнамучанік Макарый, ігумен Пінскі

Прападобны Макарый нарадзіўся ў 1605 годзе ў Оўручы на Вільні ў заможнай сям'і. З маладых гадоў вылучаўся благачыннасцю, поспехамі ў спасціжэнні кніжнай мудрасці, паслушэнствам, любоўю да храма Божага і царкоўнай службы. У 1620 годзе ён навучаўся пры Успенскім Оўруцкім манастыры і па смерці бацькоў зрабіўся паслушнікам гэтага манастыра. У 1625 годзе інак Макарый з благаслаўлення архімандрыта пакідае Успенскі манастыр і выпраўляецца да Пінскага епіскапа Аўрамія, які накіроўвае яго ў Купяціцкі манастыр. У 1630 годзе Макарыя пасвячаюць у сан іерадыякана, а ў 1632-ім— у сан іераманаха.

З 1637 года прападобны Макарый выконвае абавязкі настаяцеля Камянецкага

Уваскрасенскага манастыра (непадалёку ад Пінска). Камянецкі манастыр у часы настаяцельства прападобнага Макарыя ператварыўся ў апору Праваслаўя на заходніх землях Беларусі. Пры ім было адкрыта вучылішча, дзе інакі і гараджане навучаліся пісьму і чытанню закона Божага, кнігам Святога Пісання, знаёміліся з творамі святых айцоў.

З 1660 года ў сане архімандрыта прападобны Макарый становіцца на чале брацііі роднага Успенскага Оўруцкага манастыра. Гэта быў цяжкі час для праваслаўных хрысціян заходніх беларускіх земляў. Каталіцкая Польшча імкнулася навязаць праваслаўнаму народу унію і лацінства. У 1671 годзе пасля спусташэння Оўруча татарамі архімандрыт Макарый вымушаны быў пакінуць манастыр, у якім не засталося ніводнага манаха, і накіраваўся ў Кіева-Пячэрскую лаўру. Праз два гады яго прызначаюць ігуменам Успенскага манастыра горада Канева, які стаў месцам апошняга служэння прападобнага. Там угоднік Божы праславіўся шматлікімі цудамі і благадатным дарам празорлівасці. Мноства ўбогіх, бяздомных і хворых людзей прыходзілі да яго ў абіцель, дзе атрымлівалі і духоўнае настаўленне, і ацаленне.

За два гады да смерці прападобны Макарый прадказаў заняпад Канева і сваю пакутніцкую смерць. Сапраўды, у Каневе пачаўся голад, і чалавекалюбны архімандрыт, дапамагаючы людзям, раздаў маёмасць манастыра. У верасні 1678 года туркі і татары напалі на горад і захапілі манастыр. З крыжам у руках прападобны Макарый сустрэў ворагаў на паперці храма. Татары патрабавалі выдаць ім манастырскія скарбы. «Маё золата на нябёсах, а не на зямлі... маёмасць царквы — у благадаці і міласці Божай»,— адказаў ім святы ўгоднік.

Іншаверцы жорстка катавалі Макарыя, а затым адсеклі яму галаву. Гэта здарылася 7 верасня (с. ст.) 1678 года. Вернікі занеслі яго цела ў манастырскі храм і зачыніліся. Але ворагі падпалілі храм, і людзі загінулі. Цела прападобнамучаніка было знойдзена нятленным. Святыя мошчы пахавалі пад ахвярнікам храма.

У 1688 годзе мошчы былі ўрачыста перанесены ў Пераяслаўскую Уваскрасенскую царкву, у 1713 годзе — у Спаса-Міхайлаўскі манастыр, у 1786-ым — у Пераяслаўскі Увазнясенскі манастыр. Цяпер мошчы святога ўгодніка спачываюць у храме Ражаства Прасвятой Багародзіцы ў горадзе Чаркасы.

Памяць прападобнамучаніка Макарыя адзначаецца двойчы: 20 верасня (н. ст.) — у дзень смерці і 26 мая — у дзень першага перанясення мошчаў.

Мучанік дзіця Гаўрыіл Беластоцкі

У 1684 годзе ў вёсцы Звяркі Заблудаўскага* прыхода ў сям'і набожных сялян Пятра і Анастасіі Гоўдзель нарадзілася дзіця. Хрысцілі немаўлятку з імем Гаўрыіл у храме Заблудаўскага Свята-Успенскага манастыра.

Шасцігадоваму Гаўрыілу былі ўласцівы незвычайныя ў яго ўзросце якасці: удумлівасць, схільнасць да малітвы і самоты.

Аднаго разу, калі маці Гаўрыіла панесла абед мужу, які араў поле, у іх выкралі хлопчыка. Дзіця было тайна вывезена ў Беласток і аддадзена на смяротныя мучэнні сектантам. Цела замардаванага Гаўрыіла было знойдзена на ўскрайку леса — ні

* Заблудаў, як і Беласток, знаходзіўся на землях тагачаснага Слуцкага княства.

звяры, ні птушкі яго не кранулі. Бацькі і вяскоўцы пахавалі дзіця на могілках у Звярках. Гэта адбылося ў 1690 годзе.

Адчуваючы цудадзейную сілу, што сыходзіла ад месца пахавання Гаўрыіла, памерлых дзяцей хавалі бліжэй да яго магілы. Мінула 30 гадоў. Падчас чарговага пахавання была выпадкова прыадчынена труна дзіцяткі. Цела мучаніка аказалася нятленным. Вестка аб гэтым імгненна разнеслася па наваколлі, і святыя мошчы былі перанесены ў царкоўны склеп. Праз 16 гадоў царква згарэла, але нятленныя астанкі «міласць Божая ў агні захавала». Тады ж, у 1746 годзе, мошчы святога мучаніка Гаўрыіла былі вывезены ў Слуцкі Свята-Троіцкі манастыр. Пасля яны пераносіліся ў Мінск і ў Гродна. Цяпер захоўваюцца ў кафедральным Свята-Нікалаеўскім саборы горада Беластока.

Паводле падання, дзіця Гаўрыіл з'яўляецца малітоўным заступнікам хворых і гаротных дзяцей.

Свяціцель Георгій Каніскі, архіепіскап Магілёўскі і Беларускі

Нямала праведнікаў загінула пакутніцкай смерцю ў час каталіцкай і уніяцкай экспансіі ў межах Польска-Літоўскай дзяржавы. Многія духоўныя настаўнікі падавалі свой голас у абарону веры айцоў, культуры і мовы народа. Шмат нашчадкаў Хрыстовых аддалі жыцці і свабоду за праваслаўнае спавяданне Госпада Бога і Збавіцеля нашага Іісуса Хрыста.

Адзін з абаронцаў веры Хрыстовай і Праваслаўя быў архіепіскап Магілёўскі Георгій Каніскі — выдатны царкоўны дзеяч, педагог, пісьменнік і прапаведнік, уславулены Богам і ўшанаваны нашчадкамі.

Нарадзіўся будучы дабрачынны іерарх 30 лістапада (с. ст.) 1717 года ў горадзе Нежыне ў заможнай і знатнай сям'і ўкраінскіх дваран Каніскіх. Вучыўся 15 гадоў у Кіева-Магілянскай акадэміі, якую скончыў «з асаблівай пахвалою». Пасля сканчэння акадэміі прыняў манаскі пострыг і быў пакінуты выкладчыкам акадэміі на кафедры красамоўства. З 1747 года на працягу пяці гадоў узначальваў кафедру філасофіі і адначасова быў прэфектам. З 1751 года ён — рэктар акадэміі, прафесар багаслоўя, а з 1752-га — архімандрыт Кіева-Брацкага манастыра.

З 1755 года пачынаецца новы перыяд яго жыцця і дзейнасці: ён прызначаецца беларускім епіскапам і пераязджае ў Магілёў. З 1783 года Каніскі становіцца беларускім праваслаўным архіепіскапам, членам Святога Сінода. Гэта быў самаахвярны крок у найцяжэйшы для праваслаўнай Беларусі час. Тады на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, якое ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, заставалася толькі адна праваслаўная епархія з цэнтрам у Магілёве. У афіцыйных колах Польска-Літоўскай дзяржавы ўжо абмяркоўвалася пытанне аб ліквідацыі і гэтай епархіі.

Радасная і ўрачыстая сустрэча доўгачаканага епіскапа з магілёўскаю паствою не прыхавала ад свяціцеля Георгія жахлівага заняпаду, які быў выкліканы доўгімі гадамі прыгнёту і ганенняў на Праваслаўе. Пазней у сваёй пропаведзі свяціцель адзначаў: «Маглі вы яшчэ бачыць у ёй (Беларускай епархіі.— *Аўт.*) нейкую колькасць цэркваў праваслаўных, але і тыя на пуні і хлеўнікі жывёльныя падобны, а не на храмы хрысціянскія... Адняты ў іх (у праваслаўнага насельніцтва.— *Аўт.*) святло навучання: школам і семінарыям быць недапушчальна, а таму не толькі ніжэйшага

саслоўя людзі, але і само дваранства ў крайняй прастаце і невуцтве вымушана быць».

Змрочная рэчаіснасць не напалохала епіскапа Георгія. Ён рашуча наважыўся выканаць подзвіг апостальскага служэння, абараняючы Праваслаўе, абапіраючыся на мужную волю, энцыклапедычную адукаванасць і на дапамогу Госпада.

З першых дзён свяціцельскай дзейнасці Георгій Каніскі клапоціцца аб распаўсюджанні святла Праваслаўя, а з моманту сваёй прысутнасці на беларускай зямлі супрацьстаіць уціску уніятаў і католікаў, якія захапілі праваслаўныя храмы. У 1757 годзе свяціцель адкрыў пры архірэйскім доме друкарню і выдаў твор Феафана Пракаповіча — «Катэхізм, ці Кароткае пачатковае Хрысціянскае вучэнне на карысць і збавенне юным, як і сталым ненавучаным...» і бясплатна разаслаў яго па храмах епархіі. Тады ж ім былі заснаваны і школы накшталт брацкіх царкоўных вучылішчаў. У 1759 годзе Каніскі арганізаваў пры Спаскім манастыры Духоўную семінарыю. Для паспяховага супрацьстаяння уніяцтву праасвяшчэнны Георгій збірае архіўныя дакументы аб магілёўскіх праваслаўных цэрквах. Ён прапагандуе ідэю аб’яднання беларускага народа з рускім і ўкраінскім народамі. Свае ідэі выказвае ў публічных прамовах і царкоўных пропаведзях. Ім складзена каля 80 прамоў і пропаведзяў («слоў»).

Каніскі — аўтар курсаў паэтыкі («Правілы паэтычнага мастацтва») і філасофіі, гістарычных запісак пра Магілёўскую епархію, інтэрмедый, духоўных вершаў, проціатэістычнай трагікамедыі «Уваскрасенне мёртвых...». Каніскі крытыкаваў крайнасці феадалізму, жорсткую эксплуатацыю і прыгнёт народа, невуцтва, забабоны, духоўную галечу тых, хто меў уладу. Творы свяціцеля Каніскага высока ацэньваў А. С. Пушкін.

У 1768 годзе зноў пачаўся ўціск праваслаўных. Зламысныя ганіцелі-каталікі задумалі пазбавіць жыцця архіепіскапа Георгія. Ён вымушаны быў ад’ехаць у Смаленск і прабываў у выгнанні да 1772 года, падтрымліваючы актыўную сувязь са сваёй паствою. Каніскі хадайнічаў перад рускай імператрыцай і Сінодам аб тых праваслаўных, якія сілаю ўтрымліваліся уніяй. І быў прыняты неабходны ўказ. А ў 1785 годзе здзейснены праект свяціцеля Георгія аб утварэнні асобнай праваслаўнай епархіі ў Польшчы.

Свяціцель Георгій спачыў 26 лютага (н. ст.) 1795 года і быў пахаваны ў ім жа асвячоным Спаскім саборы Магілёва.

Паводле рашэння Святога Сінода Беларускага Экзархата Рускай Праваслаўнай Царквы архіепіскап Георгій Каніскі ў 1993 годзе далучаны да ліку святых Беларускай Праваслаўнай Царквы. Дзень памяці свяціцеля адзначаецца 26 лютага (н. ст.) — у дзень яго праведнага спачыну і 6 жніўня — у дзень яго ўслаўлення.

Праведны Іаан Кармянскі

20 кастрычніка (н. ст.) 1837 года ў сям’і іерэя Іаана Гашкевіча ў мястэчку Стрэшын Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні нарадзіўся сын. Немаўлятку ахрысцілі і далі імя Іаан у знак пашаны да апостала Іаана Багаслова.

Калі хлопчык падрос, ён стаў дапамагаць бацьку ў Свята-Пакроўскім храме, сам шчыра маліўся. З цягам часу ў яго ўзнікла мара наведаць Кіева-Пячэрскую лаўру, пакланіцца яе святыням. Пасля заканчэння царкоўнапрыходскай школы і духоў-

9 Зак. 2210

нага вучылішча ва ўзросце 18 гадоў Іаан паступае ў Магілёўскую духоўную семінарыю. Скончыўшы яе ў 1859 годзе, едзе ў Агародненскую царкоўнапрыходскую школу выкладаць Закон Божы. Там ён бярэ шлюб з дачкой мясцовага святара Марыяй і там жа архіепіскапам Магілёўскім і Мсціслаўскім Яўсевіем Арлінскім рукапакладзены ў іерэі і накіраваны служыць у Шарсцінскую царкву Ражаства Багародзіцы.

У малітвах і пастырскай працы праходзілі гады служэння іерэя Іаана Гашкевіча. Пасля 1876 года айцец Іаан пераводзіцца ў Свята-Нікольскую царкву вёскі Агароднія Гомельскага павета. На новым месцы Гасподзь раскрывае ў поўнай меры яго духоўныя сілы. Храм становіцца для яго месцам малітоўнага подзвігу. У новым прыходзе бацюшка прыкладаў шмат намаганняў для добраўпарадкавання храма і царкоўных пабудоў. Сваёй жа маёмасці ён ніколі не меў. Напрыканцы дзён жыў сціпла ў старэнькай хацінцы, крытай саломаю.

З 1893 года тры гады запар айцец Іаан займае пасаду духоўнага следчага ў благачынні. Гэтым часам яго абіраюць у благачынніцкі савет. Дванаццаць гадоў ён нясе руплівае паслушанне, і ў 1906 годзе Свяцейшы Сінод узнагароджвае бацюшку ордэнам св. Анны ІІІ ступені.

Калі айцу Іаану споўнілася 70 гадоў і мінула 45 гадоў яго свяшчэннаслужэнства, гомельскі епіскап Мітрафан Краснапольскі ўзвёў яго ў сан протаіерэя. Праз 5 гадоў айца Іаана ўзнагароджваюць ордэнам св. Роўнаапостальнага князя Уладзіміра IV ступені.

Ва ўзросце 75 гадоў айцец Іаан саступае месца служэння свайму малодшаму сыну Іаану. Дзяцей у бацюшкі было сямёра. Усе яго чатыры сыны прысвяцілі жыццё служэнню Царкве і Богу. Пасля нараджэння малодшага бацюшка здзейсніў мару дзяцінства — наведаў Кіева-Пячэрскую лаўру. Там ад старцаў атрымаў благаславенне трымацца манаскага жыцця. Айцец Іаан да скону не ўжываў мясной ежы, строга пасціўся, шмат каму дапамагаў словам і справай, быў шчырым малельцам за нас, грэшнікаў.

Аднаго разу прыйшла да бацюшкі ўдава, у якой засталося пяць сірот. Спагадлівы і міласэрны айцец Іаан аддаў ёй сваю карову. «Вядзі, тваім дзеткам яна больш патрэбна»,— падбадзёрыў жанчыну. Другім разам бацюшка са слязьмі пакорна маліўся за ацаленне бесноватай дзяўчыны. Пасля ацалення яму давалі грошы. «Калі браць за гэта ўзнагароду — будзе грэх,— сказаў айцец Іаан.— Бо не маё гэта, а дар Божы. Як атрымаў ад Госпада дарам, так і вам аддаю».

Зямны шлях протаіерэй Іаан Гашкевіч скончыў увосень 1917 года, але не скончылася яго зямная і нябесная слава. Гасподзь прадвызначыў яму жыццё векавечнае. Пахаваны ён у вёсцы Агароднія Добрушскага раёна Гомельскай вобласці. У ліпені 1991 года былі аднойдзены нятленныя мошчы Божага ўгодніка, якія пры малітоўнай ушане вернікаў цяпер спачываюць у Свята-Пакроўскім храме вёскі Карма Добрушскага раёна.

Да грабніцы святога сыходзіцца шмат народу. І паводле веры сваёй атрымліваюць людзі благадаць Гасподнюю і ацаленне.

Сінодам Беларускага Экзархата 31 мая (н. ст.) 1998 года протаіерэй Іаан Кармянскі (Гашкевіч) прылічаны да святых. Дзень памяці святога праведніка — 31 мая. Такім чынам, Сабор Беларускіх Святых павялічыўся яшчэ на аднаго малітоўніка за зямлю нашу і народ.

Мучанікі Віленскія — Антоній, Іаан і Яўстафій

У пачатку XIV стагоддзя праваслаўная вера ў Літве рабіла першыя крокі. Праваслаўным хрысціянінам быў і вялікі князь літоўскі Альгерд. Аднак у першыя гады княжання ён вымушаны быў дзеля ўмацавання ўлады падпарадкавацца язычніцкім жрацам. Пасля князь зноў вярнуўся да Праваслаўя, хрысціў сваіх дзяцей, а перад смерцю пастрыгся ў схіму і быў пахаваны ў збудаваным ім храме Прачыстай Дзевы.

Святыя мучанікі Антоній, Іаан і Яўстафій належалі да роду знатных літоўскіх баяр і неслі прыдворную службу ў князя Альгерда. Іаан і Антоній — родныя браты — прынялі ад святара Нестара святое Хрышчэнне. Ад яго маладыя прыдворныя дазналіся пра Іісуса Хрыста, спазналі Святы Запавет і ўмацаваліся вераю. Хрысціянская свядомасць не дазваляла ім трымаць у тайнасці рэлігійную прыналежнасць. Князь абвінаваціў братоў Антонія і Іаана ў здрадзе веры язычнікаў і загадаў пасадзіць у вязніцу. Шмат народу прыходзіла да гэтай вязніцы, каб паслухаць пропаведзі мучанікаў, і шмат каго святыя браты звярнулі да Хрыста. Напалоханыя жрацы патрабавалі смяротнай кары Божым угоднікам. Раніцай 14 красавіка (27 красавіка па н. ст.) 1347 года мучанік Антоній (малодшы брат Іаана) быў павешаны на дубе, дзе звычайна адбываліся пакаранні смерцю. 24 красавіка быў задушаны святы Іаан, а цела яго было павешана на тым самым дубе.

Трэцім мучанікам за веру Хрыстову стаў Яўстафій. Аднаго разу ён прылюдна назваў сябе хрысціянінам і адмовіўся парушыць Калядны пост. Яго жорстка катавалі, а 13 снежня 1347 года таксама павесілі.

На месцы канчыны святых мучанікаў па жаданні жонкі князя Альгерда Юльяніі была збудавана капліца, а князь Канстанцін Астрожскі паставіў там храм у імя Святой Троіцы.

У 1374 годзе Віленскія мучанікі кананізаваны Усяленскім Патрыярхам Філафеем.

У XVI стагоддзі мошчы святых угоднікаў пераносяцца ў Свята-Духаў манастыр, а падчас другой сусветнай вайны перавозяцца ў Маскву. Вяртанне іх адбылося 26 ліпеня 1946 года. Штогод гэты дзень святкуецца ў Віленскім Свята-Духавым манастыры.

Мучанікі Віленскія не ўваходзяць у Сабор Беларускіх Святых, але паўсюдна шануюцца на Беларусі.

24—26 ліпеня (н. ст.) 1993 года адбылася значная падзея ў жыцці праваслаўных вернікаў Беларусі: з Віленскага Свята-Духава манастыра ў Мінскі Свята-Петра-Паўлаўскі сабор былі перанесены часткі мошчаў святых Віленскіх мучанікаў. Мошчы закладзены ў ікону трох Віленскіх мучанікаў, напісаную смаленскім іканапісцам Сяргеем Кульманавым. Мітрапалітам Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, быў адслужаны ўрачысты малебен перад іконай з мошчамі на старажытным Мінскім Замчышчы. 26 ліпеня ікона са святымі мошчамі ўрачыста перанесена ў Мінскі Свята-Петра-Паўлаўскі сабор на пастаяннае месца знаходжання.

Ініцыятарам і арганізатарам перанясення часціц мошчаў стала Беларускае Праваслаўнае Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў. Кожную сераду перад іконай са святымі мошчамі адбываецца богаслужэнне з Акафістам святым мучанікам Антонію, Іаану і Яўстафію з удзелам брацкага хору.

ІКОНЫ

Заступніца Мінска

Гэтая ікона, што размяшчаецца з левага боку ад галоўнага іканастаса Мінскага кафедральнага Свята-Духава сабора, адразу прыцягвае да сябе ўвагу. Багатае ўбранства, святло лампад, безліч свечак на падсвечніках, мноства вернікаў, жадаючых ёй пакланіцца,— усё гаворыць аб выключным яе шанаванні.

Мінская ікона Божай Маці... Расказ аб яе шматвяковай гісторыі не можа не стаць аповедам і аб таямнічым намысле Божым, звязаным з гэтай святыняй.

Паводле Царкоўнага Падання, яна была напісана апосталам ад 70-ці, евангелістам Лукой і шмат гадоў знаходзілася ў Візантыі. Адтуль ікона трапіла ў Крым, у горад Корсунь, калі сястра візантыйскіх імператараў царэўна Ганна, якая выйшла замуж за кіеўскага князя Уладзіміра, у ліку многіх царкоўных рэліквій прывезла яе на Русь. Пазней святы роўнаапостальны князь Уладзімір змясціў абраз у знакамітай Кіеўскай Дзесяціннай царкве. З таго часу мінула больш за тысячу гадоў...

Кіеў неаднойчы разбураўся качэўнікамі. Ад згаданай Дзесяціннай царквы засталіся адны руіны. Аднак Гасподзь захаваў ікону Сваёй Маці.

Падчас узяцця Кіева крымскім ханам Менглі-Гірэем адзін з татар садраў з іконы каштоўную аправу, упрыгожанні, а сам абраз кінуў у Днепр. І зноў Гасподзь захаваў святыню ад гібелі. Праз некаторы час яна была знойдзена ў нашым горадзе: ікона плыла па рацэ Свіслачы, прыстала да берага і свяцілася незвычайным святлом. Яе ўрачыста перанеслі ў царкву Ражаства Прасвятой Багародзіцы на Замчышчы. Было гэта 13 жніўня (с. ст.) 1500 года.

На пачатку XVII стагоддзя пасля далучэння многіх праваслаўных цэркваў да уніі ікона была перанесена ў Свята-Духаву царкву, што месцілася ў Мінску на тэрыторыі сучаснай плошчы Свабоды. Тады ж, мабыць, уніяты зрабілі частковае паднаўленне іконы, намагаючыся надаць ёй некаторыя заходнія рысы, і павялічылі фармат абраза за кошт дадатковых дошак.

З канца XVIII стагоддзя Мінская ікона Божай Маці знаходзілася ў Петра-Паўлаўскім саборы (раней царква Святога Духа).

Шмат чаго пабачыў горад за гэтыя гады. Няма цяпер у Мінску царквы Ражаства Багародзіцы, у 1937 годзе быў разбураны кафедральны Петра-Паўлаўскі сабор. Мноства царкоўнай маёмасці і абразоў незваротна загінулі пры гэтым, але зноў Гасподзь захаваў цудадзейную ікону. Да самай Айчыннай вайны ікона знаходзілася ў дрывяным складзе непадалёку ад акруговага Дома афіцэраў, захоўвалася ў непрыстасаваных для гэтага ўмовах, магла лёгка прыйсці ў нягоднасць, улічваючы яе старадаўнасць. Аднак і на гэты раз намысел Божы не дапусціў гібелі святыні. Падчас вайны набожная праваслаўная жыхарка Мінска Варвара Васільеўна Слабко звярнулася да нямецкіх акупацыйных улад з хадайніцтвам аб перадачы царкве маёмасці, што знаходзілася ў згаданым складзе. Дазвол быў атрыманы. І вось пад слоем пылу жанчына ўбачыла дзівосны лік Найсвяцейшай Багародзіцы. Так зноў была знойдзена ікона. Спатрэбілася руплівая рэстаўрацыя яе мастаком і іканапісцам Г. Віэрам, якая цалкам пацвердзіла старадаўняе паходжанне абраза. Затым іко-

на была перададзена ў толькі што адкрытую Свята-Кацярынінскую (у той час Петра-Паўлаўскую) царкву, дзе знаходзілася да снежня 1944 года, г. зн. да закрыцця гэтай царквы. У 1945 годзе яна была перанесена ў кафедральны Свята-Духаў сабор, дзе знаходзіцца да сённяшняга дня.

Якая глыбока павучальная для нас гісторыя гэтай цудадзейнай святыні!. Колькі разоў Мінская ікона Божай Маці магла загінуць, але кожны раз аказвалася недасяжнаю для агню, ворагаў і ўсепаглынальнага часу. Кожны раз намысел Божы таямніча зберагаў святы абраз для нашага ўратавання і павучання. Так Маці Божая, заступніца нашага горада (нездарма ж яна змешчана ў акружэнні Ангелаў на старажытным гербе Мінска), праз сваю ікону відавочна прымала і прымае малітвы і спадзяванні шматлікіх пакаленняў мінчан. І ў наш нялёгкі час несупынна ідуць і ідуць да яе людзі, моляцца, ставяць свечкі, просяць дапамогі і заступніцтва за ўсіх нас з несумненнаю верай у яе ратавальную моц.

Бялыніцкая ікона Божай Маці

Мяркуецца, што гэта ікона Божай Маці напісана ў XIII стагоддзі. Паданне расказвае, што яна спачатку знаходзілася ў праваслаўным храме Магілёўшчыны. Пасля заключэння уніі (1596) ікона была пастаўлена ў касцёле каталіцкага манастыра. Аднак і пасля гэтага шанавалася праваслаўнымі. У 1876 годзе касцёл з цудадзейнай іконаю быў перададзены ў праваслаўнае ведамства, і 25 красавіка (н. ст.) у храме адслужылі першую Літургію ў гонар Нараджэння Прасвятой Багародзіцы.

Бялыніцкая ікона з'яўляецца агульнай святыняй хрысціян на Беларусі. Здаўна праваслаўныя багамольцы, выпраўляючыся ў Кіеў, спярша прыходзілі ў Бялыніцкі манастыр.

Ікона ўславілася шматлікімі цудадзействамі. Ад Царыцы Нябеснай маюць заступніцтва і суцяшэнне веруючыя хрысціяне.

Жыровіцкая ікона Божай Маці

На Гродзеншчыне, у Жыровіцкім Свята-Успенскім мужчынскім манастыры, знаходзіцца глыбока шанаваная ікона Усяміласцівай нашай Заступніцы — Маці Госпада нашага Ісуса Хрыста, Прасвятой Багародзіцы. У манастыры заўжды шмат багамольцаў і паломнікаў. З малітваю і выключнай багачыннасцю падыходзяць да святыні людзі.

У 1470 годзе пастухі мястэчка Жыровічы ў лесе праваслаўнага баярына Аляксандра Солтана заўважылі святло, якое струменілася праз галіны грушавага дрэва. Пастухі падышлі бліжэй і на дрэве ў прамяністым ззянні ўбачылі невялікага памеру ікону Божай Маці. Яе аднеслі Аляксандру Солтану, але той не прыдаў значэння аповеду пастухоў і схаваў ікону ў куфэрак. На наступны дзень да Солтана прыйшлі госці, і гаспадару захацелася паказаць знаходку. Але, наўздзіў, іконы ў куфэрку не аказалася. Яе зноў на грушавым дрэве знайшлі пастухі. На гэты раз Аляксандр Солтан паставіўся да іконы з вялікай пашанай і вырашыў на месцы яе з'яўлення збудаваць драўляны храм. Так у гонар Найсвяцейшай Багародзіцы была ўзведзена

праваслаўная царква. Каля 1520 года яна згарэла, і ўсе думалі, што ікона загінула. Але сялянскія дзеці на месцы згарэлага храма ўбачылі дзівоснае відовішча: там на вялікім камені сядзела Дзева надзвычайнага хараства. Дазнаўшыся пра гэта, жыхары мястэчка на чале са святаром скіраваліся да каменя і ўбачылі на ім запаленую свечку і не пашкоджаную агнём ікону Божай Маці. Пасля такога здарэння ікона знаходзілася ў доме святара. Калі на месцы драўлянага храма збудавалі каменны і асвяцілі ў імя Божай Маці, цудатворную ікону змясцілі ў ім.

Праз сто гадоў вакол храма паўстаў мужчынскі манастыр. На пачатку XVII стагоддзя яго захапілі уніяты, але Жыровіцкая ікона шанавалася не толькі імі, але і каталікамі. У 1839 годзе манастыр быў вернуты праваслаўным і стаў месцам аднаўлення праваслаўнага богаслужэння ў заходнебеларускіх землях.

Падчас першай сусветнай вайны Жыровіцкую ікону вывезлі ў Маскву, а на пачатку 20-ых гадоў зноў вярнулі ў абіцель. Цяпер яна знаходзіцца там ва Успенскім саборы і глыбока шануецца за яе благадатную моц.

Ікона выразана на камені і змяшчаецца на далоні.

Крупецкая ікона Божай Маці

Пакроўская царква вёскі Крупцы, што непадалёку ад Мінска, славіцца сваёй цудатворнай іконай Божай Маці. З надпісу на адваротным баку іконы вынікае, што да 1612 г. гэты абраз знаходзіўся ў капліцы, адкуль потым быў перанесены ў храм. Мясцовае паданне сцвярджае, што нямоглыя, якія з вераю маліліся гэтай іконе, атрымлівалі ацаленне і дапамогу па хадайніцтву Царыцы Нябеснай.

Паданне згадвае і пра іншую ікону той жа Пакроўскай Крупецкай царквы, вельмі падобную на папярэднюю, але меншую памерамі.

Фальковіцкая ікона Божай Маці

Фальковіцкая царква, у якой знаходзіцца ікона Божай Маці, размяшчаецца непадалёку ад Віцебска, у мястэчку Фальковічы, што па Маскоўскай шашы. Ікона была знойдзена на пачатку XVIII стагоддзя ў бярозавым гаі на беразе рэчкі, якая струменілася бліз царквы. На гэтым месцы пабудавалі храм у гонар Нябеснай Заступніцы, дзе аднойдзеная ікона праславілася шматлікімі цудадзействамі.

Падчас Айчыннай вайны 1812 года Фальковіцкі храм пацярпеў ад французаў. Адзін салдат прыставіў лесвіцу да іконы Багародзіцы з намерам зняць з яе рызу. Але толькі яго рука кранулася рызы, як лесвіца абарвалася і салдат пакалечыўся.

Гэты абраз асабліва праславіўся ў 1831 годзе. Нечакана пачалася эпідэмія халеры. Народ звярнуўся за дапамогай да Госпада. Сабраўшыся ў царкве, людзі прасілі святара абысці хрэсным ходам з іконаю Божай Маці мястэчка Фальковічы. Адразу ж пасля гэтага адчулася заступніцтва Царыцы Нябеснай: смяротнасць паменшылася. Слава пра ікону Божай Маці распаўсюдзілася далёка за межамі краю.

КРЫЖ ПРАПАДОБНАЙ ЕЎФРАСІННІ, ІГУМЕННІ ПОЛАЦКАЙ

Пасля ўкрыжавання Хрыста Збавіцеля крыж стаўся асноведдзю царкоўнай абраднасці, хрысціянскім сімвалам перамогі над грахом і смерцю. Крыж — носьбіт «хрэснай жыватворчай» сілы. Крыж — «невыказная благадаць!» — усклікаў Іаан Дамаскін.

У 1161 годзе пасля пабудовы Спаскага храма блажэнная Еўфрасіння турбавалася аб забеспячэнні яго богаслужбовымі кнігамі і ўсім неабходным. Яна запрасіла мастакоў, якія адмыслова распісалі сцены храма біблейскімі сюжэтамі. Асобнае месца было адведзена для захавання унікальнага шасціканцовага напрастольнага Крыжа — яго прападобная Еўфрасіння заказала лепшаму ювеліру Кіеўскай Русі Лазару Богшу, родам з Беларусі. Той, маючы выключны талент і прафесійнае майстэрства, распачаў цэлы накірунак у старажытнарускім ювелірным мастацтве.

Наяўнасць дакладнай даты вырабу — 1161 год — і імені майстра, пазначаных на Крыжы, даюць падставу лічыць полацкі шэдэўр вялікай каштоўнасцю культуры Старажытнай Русі. Полацкі Крыж да таго ж — усеправаслаўная святыня, каштоўная рэліквія ўсяленскага хрысціянства.

Шасціканцовая форма Крыжа, на думку багасловаў, сімвалізуе першабытны сусвет: шэсць промняў азначаюць шэсць дзён тварэння свету. Выявы Крыжа прападобнай Еўфрасінні ўвасабляюць амаль усю гісторыю Новага Запавета і першабытнай Царквы.

Крыж аздоблены каштоўнымі камянямі і металамі. Выявы Ісуса Хрыста, Багародзіцы, Іаана Прадцечы, Архангелаў Міхаіла і Гаўрыіла, чатырох евангелістаў, апосталаў Пятра і Паўла, святой Еўфрасінні і іншых святых угоднікаў выкананы на пласцінах перагародчатай эмалі — гэта выключна складаная ювелірная тэхніка сярэднявечча.

Асаблівую каштоўнасць надаюць рэліквіі часціцы святых мошчаў, размешчаныя ў Крыжы. На вонкавым яго баку — Кроў Хрыстова ў верхнім скрыжаванні, «Дрэва Жыватворчае» ў ніжнім скрыжаванні. На адваротным баку — камень ад Гроба Прасвятой Багародзіцы ў верхнім скрыжаванні, часціца ад Гроба Госпадняга ў ніжнім скрыжаванні. У Крыж укладзена таксама кроў святога Дзімітрыя, часціцы мошчаў святога велікамучаніка і цаліцеля Панцеляймона і іншых угоднікаў Божых. Гэтыя святыя рэліквіі былі дастаўлены ў Полацк спецыяльнай экспедыцыяй, якую выправіла ў Візантыю прападобная Еўфрасіння.

Стварэнне задуманага каштавала такой вялікай працы і намаганняў, патрабавала такіх значных матэрыяльных сродкаў, што на бакавых пласцінах Крыжа прападобная заказчыца благаславіла выгравіраваць надпіс, чыім намаганнем, для якой царквы быў зроблены Крыж і колькі гэта каштавала. Знакамітыя князі часам ахвяравалі ў храмы вельмі каштоўныя рэчы, але роўнага Крыжу Еўфрасінні Полацкай не было.

Лёс гэтай незвычайнай хрысціянскай святыні таксама незвычайны. Напачатку Крыж знаходзіўся ў царкве ігуменні Еўфрасінні. У XIII стагоддзі ён быў перавезены захапіўшымі Полацк смаленскімі князямі ў Смаленск. Пасля перамяшчаўся ў розныя месцы ў залежнасці ад змены гістарычных падзей. У 1841 годзе Крыж, па-

быўшы ў Маскве і Санкт-Пецярбургу, быў дастаўлены ў Полацк. Хрэсны ход ад Сафійскага сабора ў адрамантаваны сабор Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра сведчыў, што святая рэліквія вернута на тое месца, якое вызначыла Крыжу ігумення Еўфрасіння. Тут праваслаўнай святыні належала знаходзіцца амаль 90 гадоў.

У 1928 годзе дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея выязджаў з экспедыцыяй у Полацк, маючы на мэце знайсці рэліквію. Крыж быў знойдзены ў мясцовым фінаддзеле і перавезены ў Мінск. У тыя гады намячалася перанесці сталіцу Беларусі ў Магілёў. Туды і трапіў у 1929 годзе Крыж прападобнай Еўфрасінні Полацкай — ён знаходзіўся ў пакоі-сейфе Магілёўскага абкама і гаркама партыі.

Пачалася Айчынная вайна 1941 года. У разгубленасці і спешцы вывозілася абсталяванне заводаў. Музейныя каштоўнасці, мабыць, не ратавалі. Крыж бясследна знік. Усе далейшыя намаганні яго расшукаць не далі выніку.

Міналі гады. Падчас святкавання тысячагоддзя Полацкай епархіі і Праваслаўнай Царквы на Беларусі (1992) было вырашана ўсеправаслаўную святыню аднавіць. Па благаславенні Іерусалімскага Патрыярха Дзіадора II і Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі мітрапаліта Філарэта пачалася карпатлівая і адказная праца. Майстраваць святыню даручылі брэсцкаму ювеліру-эмальеру, члену Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь Мікалаю Пятровічу Кузьмічу. З Божай міласцю і дапамогаю пераадольваліся вялікія цяжкасці. Была ўзноўлена страчаная, здавалася б, назаўжды тэхніка перагародчатай эмалі. Свецкаму мастаку Мікалаю Кузьмічу было неабходна, па яго словах, і пераадолець звычайныя чалавечыя спакусы, і прайсці духоўнае ачышчэнне. На гэтым нялёгкім шляху з ім «прысутнічалі Гасподзь Бог і Еўфрасіння Полацкая...».

У аднаўленні Крыжа справа Божая паядналася са справай людской, бо пасля дзесяцігоддзяў разгулу ваяўнічага атэізму адчулася вялікая патрэба ў духоўным жыцці, звернутым да хрысціянскіх каштоўнасцей. «Крыж у гісторыі быў сімвалам беларускай святасці і нават дзяржаўнасці,— зазначыў у час рабочага пасяджэння навукова-кансультацыйнай групы 4 красавіка 1996 года ў Брэсце Уладыка Філарэт,— бо ствараўся ён як сродак яднання славянскіх плямёнаў... Крыж павінен быў, па ідэі прападобнай Еўфрасінні, паяднаць варагуючыя часам родныя плямёны. Таму гэта — сімвал перамогі дабра над злом, сімвал адзінства, бо перамога дабра над злом ёсць вынік адзінства сіл дабра».

Мінула пяць гадоў з пачатку аднаўленчай працы над святыняй. 24 жніўня 1997 года адноўлены старажытны Крыж прападобнай Еўфрасінні Полацкай быў асвячоны ў Свята-Сімяонаўскім саборы г. Брэста, а потым пакладзены ў храме Праабражэння Гасподняга ў Полацкім Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры для каленасхільных малітваў перад ім за Царкву, за ўвесь свет і за Бацькаўшчыну нашу.

МАНАСТЫРЫ БЕЛАРУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ

МУЖЧЫНСКІЯ

Жыровіцкі Свята-Успенскі
Год заснавання — 1470.
Паштовы адрас: 231822, Беларусь, Гродзенская вобл., Слонімскі р-н, г. п. Жыровічы, вул. Савецкая, 57.

Лядзенскі Свята-Благавешчанскі
Год заснавання — 1842.
Паштовы адрас: 222227, Беларусь, Мінская вобл., Смалявіцкі р-н, в. Ляды.

Куцеінскі Свята-Богаяўленскі
Год заснавання — 1620.
Паштовы адрас: 211030, Беларусь, Віцебская вобл., г. Орша, вул. Ф. Скарыны, 79.

Гомельскі Свята-Нікольскі
Год заснавання — 1995.
Паштовы адрас: 246050, Беларусь, г. Гомель, вул. Дзям'яна Беднага, 4.

ЖАНОЧЫЯ

Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі
Год заснавання — 1128.
Паштовы адрас: 211400, Беларусь, Віцебская вобл., г. Полацк, вул. Еўфрасінні Полацкай, 89.

Гродзенскі Свята-Ражаства-Багародзіцкі
Год заснавання — 1843.
Паштовы адрас: 230023, Беларусь, г. Гродна, вул. Новазамкавая, 3.

Магілёўскі Свята-Нікольскі
Год заснавання — 1636.
Паштовы адрас: 212020, Беларусь, г. Магілёў, вул. Т. Сурты, 19.

Пінскі Свята-Варварынскі
Год заснавання (упамінання) — 1521.
Паштовы адрас: 225710, Беларусь, Брэсцкая вобл., г. Пінск, вул. Горкага, 33.

Хойніцкі Свята-Пакроўскі

Год заснавання — 1992.

Паштовы адрас: 247600, Беларусь, Гомельская вобл., г. Хойнікі, вул. Сялянская, 163.

Юровіцкі Свята-Ражаства-Багародзіцкі

Год заснавання — 1845.

Паштовы адрас: 246050, Беларусь, Гомельская вобл., Калінкавіцкі р-н, в. Юровічы.

Гомельскі Свята-Ціхвінскі

(пры саборы святых апосталаў Пятра і Паўла)

Год заснавання — 1993.

Паштовы адрас: 246050, Беларусь, г. Гомель, вул. Баўшане, 16.

Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр

Магілёўскі Свята-Нікольскі манастыр

Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр

Куцеінскі Свята-Богаяўленскі манастыр у Оршы

Свяціцель Георгій Каніскі

Дамашанскі Іаана-Багаслоўскі манастыр



Праведны Іаан Кармянскі

Помнік прападобнаму Елісею Лаўрышаўскаму



Помнік свяціцелю Кірылу Тураўскаму

10 Зак. 2210

Рака з нятленнымі мошчамі святой Еўфрасінні Полацкай

«...калі пісаць пра тое падрабязна,
дык...цэламу свету не ўмясціць напісаных кніг»
(Ін. 21:25)

ТЫСЯЧАГОДДЗІ НАШАЕ ВЕРЫ



Праваслаўная Царква — гэта ад Бога ўсталяваная сукупнасць усіх праваслаўных хрысціян, тых, хто жывуць, і тых, хто памерлі («бо ў Яго ўсе жывыя» (Лк. 20:38)), з'яднаных верай і любоўю Хрыстовай, адным вучэннем, свяшчэнскім падначаленнем і агульнымі таінствамі. Прызначэнне Праваслаўнай Царквы ў тым, каб захоўваць і распаўсюджваць на зямлі Божае адкравенне, прыводзіць вернікаў да маральнай дасканаласці і яднання з Богам праз выкананне таінств, усталяваных Самім Ісусам Хрыстом, праз ісціваe разуменне Яго запаведзяў і іх выкананне.

Царква сваім ратавальным і светланосным уплывам пранізвае ўсе глыбіні чалавечага жыцця — асабістага, сямейнага, грамадскага і дзяржаўнага,— і святло гэта дасягае канцоў зямлі. Асноведзь Царквы паклаў Гасподзь наш Ісус Хрыстос, а гісторыя Царквы пачынаецца з сашэсця Святога Духа на апосталаў. Аповед аб лёсах Царквы да часу гэтай вялікай падзеі — яе свяшчэнная гісторыя, бо амаль усе звесткі бяруцца са свяшчэнных кніг Старога і Новага Запаветаў.

Гісторыя Царквы далейшая — гэта гісторыя дзеючых там благадатных сіл, дараваных ёй Заснавальнікам свету, гісторыя вялікіх подзвігаў і доблесці святых апосталаў, свяціцеляў, мучанікаў і спаведнікаў на працягу дзвюх тысяч гадоў. У гэтым шэрагу святых угоднікаў нязгасным святлом ззяюць імёны вучняў апосталаў, названых мужамі апостальскімі,— Ігнацiя Баганосца і Палікарпа Смірнскага, святых вялікамучанікаў Георгія Пабеданосцы і Цаліцеля Панцеляймона, свяціцеляў і цудатворцаў Нікалая Мірлікійскага і Спірыдона Трыміфунцкага, святых усяленскіх вучыцеляў і свяціцеляў Васілія Вялікага, Грыгорыя Багаслова і Іаана Златавуста, такіх адданых Праваслаўю падзвіжнікаў, як святы Іаан Дамаскін і прападобны Сімяон Новы Багаслоў, і незлічоная колькасць іншых імёнаў.

На працягу трох першых стагоддзяў Царква супрацьстаяла іудзейству і язычніцтву, шматлікім ганенням з боку магутнай Рымскай імперыі, перамагла ў гэтым супрацьстаянні і ўмацавала Праваслаўную веру ў свеце. Да сярэдзіны IX стагоддзя Царква паспяхова супрацьстаяла ўнутраным ерасям і расколам. Гэта — эпоха Усяленскіх сабораў і перамогі праваслаўнага святаайчыннага багаслоўя.

Больш за 1000 гадоў таму назад прыйшла Праваслаўная вера і на нашу зямлю. Мы з вялікай пашанай успамінаем подзвігі святых вучыцеляў славянскіх — роўнаапостальных Мяфодзія і Кірылы, якія далі нам азбуку і магчымасць чытаць Святое Пісанне на сваёй мове, дабраверных князя Уладзіміра і князёўну Вольгу, што прынеслі хрысціянства на Русь, святых прападобных Сергія Раданежскага і Серафіма Сароўскага, праведнага Іаана Кранштацкага, якія паказалі прыклады благачыннас-

ці і святасці; успамінаем вядомых і невядомых новамучанікаў апошніх часоў, пацярпелых за Хрыста ад бязбожных ганіцеляў.

Па праву ганарыцца сваімі святымі ўгоднікамі і Беларусь. Мы аддаем належную пашану прападобнай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай, як пачынальніцы жаночага манаства на Русі; свяціцелю Кірылу, епіскапу Тураўскаму, аўтару шматлікіх твораў духоўнага навучання; прападобнамучаніку Афанасію, ігумену Брэсцкаму, бясстрашнаму абаронцу Праваслаўнай веры...

Маючы перад Богам такіх малітоўных падзвіжнікаў Царквы Нябеснай, наша зямная Царква рыхтуецца ўвайсці ў трэцяе тысячагоддзе па Ражастве Хрыстовым і, як раней, сведчыць перад усім светам пра Яго, Укрыжаванага і Уваскрослага Хрыста, Збавіцеля нашага і Госпада.

Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II у Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска

1000-годдзе Полацкай епархіі. Ушанаванне мошчаў святой Еўфрасінні Полацкай.
27 верасня 1992 г.

Хрэсны ход ля Мірскага замка

Памятны крыж «1000-годдзе Праваслаўнай Царквы на Беларусі»

Навучэнцы нядзельнай школы пры Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска

Далучэнне да святыняў

Жыватворны агонь ад Гроба Гасподняга ў Беларусі. 1998 г.

Мірская капліца



Архіпастырскае благаславенне

ЗМЕСТ

Ад аўтараў 5

МЕСЯЦАСЛОЎ

ПРАВАСЛАЎНЫЯ СВЯТЫ ГОДА 8
ДВУНАДЗЕСЯТЫЯ ПЕРАХОДНЫЯ СВЯТЫ 8
ДВУНАДЗЕСЯТЫЯ НЕПЕРАХОДНЫЯ СВЯТЫ 9
ВЯЛІКІЯ СВЯТЫ (НЕПЕРАХОДНЫЯ) 9
ЯК ВЫЛІЧЫЦЬ ДАТЫ ПЕРАХОДНЫХ СВЯТ 9
ПАСХАЛІЯ 10
Усяядныя тыдні ў 1999 годзе 10
Трапеза ў святы 10
Дні асаблівага памінання памерлых у 1999 годзе 11
Не адпраўляецца вянчанне 11
ЦАРКОЎНЫЯ СВЯТЫ — IX СЭНС 11
Ражаство Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста 11
Абразанне Гасподняе і памяць Васілія Вялікага 13
Святое Богаяўленне. Хрышчэнне Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста (Вадохрышча) 13
Стрэчанне Госпада нашага Ісуса Хрыста (Грамніцы) 14
Уваход Гасподні ў Іерусалім. Вербная нядзеля (Вербніца) 15
Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы 15
Светлае Хрыстова Уваскрасенне — Пасха (Вялікдзень) 15
Узнясенне Гасподняе 17
Дзень Святой Троіцы — Пяцідзесятніца (Сёмуха) 17
Ражаство Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Гасподняга Іаана 18
Слаўных і ўсяхвальных першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла 18
Праабражэнне Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста 19
Успенне Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі 19
Усекнавенне галавы Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Гасподняга Іаана 20
Ражаство Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі 20
Уздзвіжанне святога і Жыватворнага Крыжа Гасподняга 21
Пакроў Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі (Пакрова) . 21
Увядзенне ў храм Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы і Вечнадзевы Марыі 22

КАТЭХІЗІС

ВЕРА І РЭЛІГІЯ 28
АБ ПРЫЗНАЧЭННІ ЧАЛАВЕКА 29
Аб натуральным адкравенні 29
Аб звышнатуральным адкравенні. Святое Паданне і Святое Пісанне 30
УСЯЛЕНСКІЯ САБОРЫ 30
СІМВАЛ ВЕРЫ 32
ДЗЕСЯЦЬ ЗАПАВЕДЗЯЎ ЗАКОНА БОЖАГА 33

ДЗЕВЯЦЬ ЗАПАВЕДЗЯЎ БЛАЖЭНСТВА . . . 35
ШАНАВАННЕ БОЖАЙ МАЦІ . . . 37
ШАНАВАННЕ СВЯТЫХ АНГЕЛАЎ І ЎГОДНІКАЎ БОЖЫХ . . . 37
ШАНАВАННЕ СВЯТЫХ ІКОН . . . 39
БОГАСЛУЖЭННІ . . . 41
Аб Святой Літургіі . . . 41
ЦАРКОЎНЫЯ ТАІНСТВЫ І АБРАДЫ . . . 42
Праваслаўны храм — дом малітвы . . . 42
Хрышчэнне і мірапамазанне . . . 43
Пакаянне . . . 44
Прычасце . . . 45
Шлюб . . . 46
Алееасвячэнне . . . 47
Свяшчэнства . . . 47
МАЛЕБНЫ І ЦАРКОЎНЫЯ АСВЯЧЭННІ . . . 48
ПАМІНАННЕ СПАЧЫЛЫХ . . . 49
МУЖ І ЖОНКА Ў НОВЫМ ЗАПАВЕЦЕ . . . 50
Узаемаадносіны мужчыны і жанчыны . . . 50
Шлюбныя адносіны мужа і жонкі . . . 51
Шлюб — выратаванне для веруючага . . . 51
Аб скасаванні шлюбу . . . 52
Аб падначаленні жонкі і мужа . . . 52
ПАСТЫ . . . 53
АБ МАНАСТВЕ І МАНАСТЫРАХ . . . 54
АДНОСІНЫ ХРЫСЦІЯНІНА ДА НЯСТАЧЫ, ХВАРОБ І СМЕРЦІ . . . 55

МАЛІТВЫ

РОЗНАСЦЬ МАЛІТВАЎ . . . 66
ЯК ТРЭБА МАЛІЦЦА . . . 67
ШТО ПРОСІМ У МАЛІТВАХ . . . 67
«ОЙЧА НАШ...» . . . 68
ЧАС ДЛЯ МАЛІТВЫ . . . 69
ПЛАДЫ МАЛІТВЫ . . . 69
КАРОТКІЯ МАЛІТВЫ . . . 70
МАЛІТВА ДА ПРАСВЯТОЙ ТРОІЦЫ . . . 71
МАЛІТВА ЗА ЖЫВЫХ . . . 71
МАЛІТВА ЗА ПАМЕРЛЫХ . . . 71
МАЛІТВЫ ПЕРАД ЯДОЙ . . . 71
МАЛІТВЫ ПАСЛЯ ЯДЫ . . . 72
МАЛІТВЫ РАНІШНІЯ . . . 72
МАЛІТВЫ ПЕРАД СНОМ . . . 73
МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ . . . 74

НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Каляды . . . 80
Першая Куцця (Посная, Бедная) . . . 81
Калядны Мясаед . . . 82
Другая Куцця (Мясная, Багатая, Скаромная). Шчодры вечар (Святы вечар, Шчадруха, Шчодрык). Новы год паводле старога стылю . . . 83
Васілле (Васілей) . . . 84
Трэцяя Куцця (Апошняя, Галодная, Вадапосная) . . . 84
Вадохрышча . . . 84
Грамніцы . . . 85

Дзяды (Зімовыя, Масленыя, Стрэчанскія) . . . 85
Масленіца . . . 86
Саракі . . . 86
Гуканне вясны . . . 87
Вербніца . . . 87
Вялікдзень . . . 88
Юр'е (вясновы) . . . 89
Радаўніца (Радаўніцкія Дзяды) . . . 90
Мікола (вясновы) . . . 90
Сёмуха (Троіца) . . . 91
Купалле . . . 91
Пятро (Пётр і Павел) . . . 92
Ілля . . . 93
Першы Спас (Макавей) . . . 94
Другі Спас (Яблычны) . . . 94
Вялікая Прачыста (Першая Прачыста) . . . 95
Трэці Спас (Хлебны) . . . 95
Багач (Другая Прачыста) . . . 95
Пакрова (Трэцяя Прачыста) . . . 96
Змітраўскія Дзяды . . . 96
Юр'е (зімовы) . . . 97
Мікола (зімовы) . . . 97

БЕЛАРУСКІЯ ПРАВАСЛАЎНЫЯ СВЯТЫНІ

САБОР БЕЛАРУСКІХ СВЯТЫХ . . . 102
СВЯТЫЯ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ . . . 103
Свяціцель Міна, епіскап Полацкі . . . 103
Прападобны Марцін Тураўскі . . . 104
Святы дабраверны Расціслаў, Вялікі князь Кіеўскі і Смаленскі . . . 104
Прападобная Еўфрасіння, ігумення Полацкая . . . 105
Свяціцель Дзіянісій, епіскап Полацкі . . . 106
Свяціцель Кірыла, епіскап Тураўскі . . . 106
Свяціцель Лаўрэнцій, затворнік Пячэрскі, епіскап Тураўскі . . . 107
Прападобны Елісей Лаўрышаўскі . . . 107
Свяціцель Сімяон, епіскап Полацкі . . . 108
Праведная дзева Юльянія, князёўна Альшанская . . . 108
Праведная Сафія, княгіня Слуцкая . . . 109
Прападобнамучанік Афанасій, ігумен Брэсцкі . . . 109
Прападобнамучанік Макарый, ігумен Пінскі . . . 110
Мучанік дзіця Гаўрыіл Беластоцкі . . . 111
Свяціцель Георгій Каніскі, архіепіскап Магілеўскі і Беларускі . . . 112
Праведны Іаан Кармянскі . . . 113
Мучанікі Віленскія — Антоній, Іаан і Яўстафій . . . 115
ІКОНЫ . . . 116
Заступніца Мінска . . . 116
Бялыніцкая ікона Божай Маці . . . 117
Жыровіцкая ікона Божай Маці . . . 117
Крупецкая ікона Божай Маці . . . 118
Фальковіцкая ікона Божай Маці . . . 118
КРЫЖ ПРАПАДОБНАЙ ЕЎФРАСІННІ, ІГУМЕННІ ПОЛАЦКАЙ . . . 119
МАНАСТЫРЫ БЕЛАРУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ . . . 121

ТЫСЯЧАГОДДЗІ НАШАЕ ВЕРЫ

На першай старонцы вокладкі: ікона «Гасподзь Уседзяржыцель»;
на франтыспісе: ікона «Святая Троіца» (прп. Андрэй Рублёў);
на форзацах і шмуцтытулах: фрагменты ікон старажытнай беларускай іканапіснай школы

Выдавецтва ўдзячна закрытаму акцыянернаму таварыству «Трыёль» за дабрачыннае ахвяраванне слайдаў

Рэлігійнае выданне

Іерэй Павел БАЯНКОЎ
Леанід Мікалаевіч КАЧАНКА

НАЧАТКІ ПРАВАСЛАЎЯ

Рэдактары *В. В. Лапцік, Л. І. Круглова*
Мастацкі рэдактар *В. І. Казлоў*
Тэхнічны рэдактар *Т. А. Тарасенка*
Карэктары *Л. А. Адамовіч, Л. К. Сямёнава*

Слайды і чорна-белыя фотаздымкі
Яўгена Пясецкага, Уладзіміра Суцягіна, Уладзіміра Калашнікава, Анатоля Каляды, Міхаіла Жылінскага

Набор і вёрстка выкананы на камп'ютэрнай тэхніцы Дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Полымя». Падпісана ў друк з арыгінал-макета 17.11.98. Фармат 70×108 $^{1}/_{16}$. Папера мелаваная. Гарнітура «Тип Таймс». Афсетны друк. Ум. друк. арк. 12,6 + 0,7 укл. Ум. фарб.-адб. 29,05. Ул.-выд. арк. 14,77. Тыраж 1700 экз. Выд. № 161. Зак. 2210

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Полымя» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 6 ад 31.12.97. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11

Аддрукавана з арыгінал-макета ў друкарні выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220013, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79

375 000

«Шукайце ж найперш
Царства Божага
і праўды Яго,
і...ўсё дадасца вам»
(Мф.6:33)

ВЫДАВЕЦТВА
«ПОЛЫМЯ»

ISBN 985-07-0286-9
9789850702869